Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 2 жніўня 1985 г. № 31 (3285) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Жыта паспела.

Фотаацюд А. БАНДАК

Унумары:

Юрка ГОЛУБ, Міхась РУДКОЎСКІ
Новыя вершы.

Аляксей РАГУЛЯ
ЗА ЎСЁ Ў АДКАЗЕ...
СУЧАСНАСЦЬ І СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА.

Уладзімір АРЛОЎ
Апавяданне.
ПРА БІТВУ, ПРА ПАМЯЦЬ
Беларускія кампазітары — 40-годдзю Вялікай Перамогі.

«УЗВАЖЫЦЬ ДАБРО І ЗЛО»
Гутарка з народным артыстам СССР Анатолем ПАПАНАВЫМ.

ЗА АЗДАРАЎЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА КЛІМАТУ

Учора споўнілася дзесяць гадоў з дня падпісання акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Дэлегацыі 35 дзяржаў-удзельнікаў зноў сабраліся ў Хельсінкі, каб адзначыць юбілей і абмяняцца думкамі па далейшым пераўтварэнні ў жыццё гэтага важнага гістарычнага дакумента.

Выдавецтвы рэспублікі за гады, якія прайшлі з дня Хельсінскай нарады, выпусцілі шэраг кніг, прысвечаных актуальным пытанням міжнароднага і ўнутранага жыцця краіны, выкрыццю імперыялізму, супрацоўніцтву дзяржаў з розным сацыяльным ладам, а таксама выданняў, у якіх гаворыцца аб ідэалагічнай барацьбе на сучасным этапе.

Гэта — «Ідэалагічнае супрацьборства і выхаванне асобы», аўтары якой М. Віннікаў і А. Дзмітрук, «Неакаланіялізм: сацыяльна-палітычныя мэты і метады экспансіі» А. Байчорава, «Духоўны свет савецкага чалавека» Я. Бабосава, калектыўны зборнік «Перавагі савецкага ладу жыцця: метадалогія даследавання і методыка прапаганды» — усе яны пабачылі свет у выдавецтве «Беларусь». «Марксісцкая сацыяльная дыялектыка» Ю. Харына, «Неакаланіялізм і міжнародны тэрарызм» А. Байчорава і іншыя падрыхтаваны выдавецтвам «Універсітэцкае».

У выдавецтве «Беларусь» выходзіць зборнік артыкулаў «Палітыка міжнароднага разбою», у якім выкрываецца авантурыстычны курс знешняй палітыкі правячых колаў ЗША, іх імперскія амбіцыі.

Г. РОСІЧ.

У МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ БССР

Калегія Міністэрства культуры БССР і сакратарыят праўлення Саюза мастакоў рэспублікі прынялі пастанову аб арганізацыі рэспубліканскай мастацкай выстаўкі «Мы будуем камунізм». Гэта выстаўка будзе прысвечана XXVII з'езду КПСС. Экспазіцыя, якая разгорнецца ў мінскім Палацы мастацтваў, уключыць новыя і рэтраспектыўныя творы жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, графікі і плаката, работы мастакоў Беларусі, прысвечаныя працоўным калектывам, перадавікам вытворчасці. Выстаўка «Мы будуем камунізм» мае быць наладжана ў студзені 1986 года.

ТАК ЖЫВЁМ, ПРАЦУЕМ, ВУЧЫМСЯ...

«Моладзь Беларусі» — так называецца гэтая маляўніча аформленая брашура з серыі «Беларуская ССР», што выходзіць у выдавецтве «Беларусь» на рускай і ў перакладзе на некалькі замежных моў. З'яўленне яе — своечасовае. У дні XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў юнакам і дзяўчатам з іншых саюзных рэспублік, а таксама замежных краін цікава даведацца, як жывуць, працуюць, вучацца і адпачываюць іх равеснікі з Беларусі.

Пра шматграннае жыццё беларускай моладзі расказвае М. Зяньковіч. Яго расказ дапаўняюць каляровыя здымкі.

В. КАСЦЕНЯ.

ЭКРАН ДРУЖБЫ

Прэм'ерай фільма рэжысёра Э. Клімава «Ідзі і глядзі», які ўдастоены залатога прыза Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю, завяршыўся Тыдзень беларускага кіно ў Літве. Акрамя паказу ігравых і дакументальных стужак, на прадпрыемствах і ў гаспадарках Ігналінскага раёна адбыліся творчыя вечары майстроў экрана братніх рэспублік. Праграму дапоўніў рэтраспектыўны паказ лепшых работ студыі «Беларусьфільм» апошніх гадоў.

— Мы рады, — сказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па кінематаграфіі Літоўскай ССР А. Бразайціс, — што творчая садружнасць беларускіх і літоўскіх калег пастаянна мацуецца і развіваецца. Вялікая дапамога, якую мінчане аказалі нам пры стварэнні дакументальнага фільма аб партызанскім руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны — «Палёт у ноч» — не адзіны прыклад. Мы будзем і ў далейшым ствараць сумесныя кінастужкі. Пашырэнню творчых сувязей будзе садзейнічаць падпісаны дагавор аб творчым супрацоўніцтве на 1986 год.

ТАСС.

Не меншае творчых клопатаў у гэтыя дні ў самадзейных артыстаў Маладзечаншчыны — прыйшло жніво. З ранку да позняга вечара абуджае палетні рокат матораў камбайнаў, аўтамашын. Пасля напружанай працы, вядома, прыемна і адпачыць. Канцэрты адбываюцца не толькі ў клубах, але і непасрэдна ў полі. Разнастайная іх праграма — гучаць народныя песні і песні беларускіх кампазітараў, выконваюцца танцы. Віншаванні — перадавікам. Дастаецца і тым, хто пляцецца, як кажуць, у хвасце. Тут ужо на ўзбраенне бярэцца сатыра.

Наш няштатны фотакарэспандэнт М. МІНКОВІЧ перад адным з выступленняў сфатаграфаваў удзельніц народнага фальклорнага ансамбля сельскага Дома культуры, які знаходзіцца ў вёсцы Раёўка калгаса «Усход». Пройдзе хвіліна-другая, і наваколле ажыве ад чароўнай песні, якую спявалі яшчэ дзяды нашы і якая сёння па-ранейшаму вабіць сваёй непаўторнасцю.

МІР, ДРУЖБА — ФЕСТЫВАЛЬ!

«Слухайце ўсе!» — абвясцілі фестывальныя фанфары, і сёння ўся планета ўслухоўваецца ў маладое шматгалоссе, што гучыць з Масквы. «Слухайце ўсе!» — і выразна чуваць, як з трыбуны XII Сусветнага юнацтва на мовах свету сцвярджае высокія гуманістычныя ідэалы.

20 тысяч дэлегатаў са 150 краін, вялікіх і малых, далёкіх блізкіх, сабраліся ў сталіцы нашай Радзімы.

— Праблемы жыцця закранаюць і хвалююць моладзь не менш востра, чым старэйшыя пакаленні, — сказаў на ўрачыстым адкрыцці фестывалю Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. — З усім запалам юнацтва яна ўстае на бой за сацыяльную справядлівасць і сапраўдную свабоду, за тое, каб выгады зямлі, выгады цывілізацыі былі даступны ўсім, каб зніклі з жыцця чалавека і чалавецтва насілле і расізм, нераўнапраўе і прыгнятанне, мілітарызм і агрэсія.

Пятнаццаць тэматычных цэнтраў працуюць у фестывальнай Маскве — антыімперыялістычнай салідарнасці, антыфашысцкі, правоў працоўнай моладзі, аховы навакольнага асяроддзя...

Удзел у фестывалі дэлегацыі Беларускай ССР — самы актыўны. Зорны марш і забегі на «фестывальную мілю», мітынгі салідарнасці з барацьбой народаў Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і сустрэчы з моладдзю Нікарагуа, ГДР, Кубы, ФРГ, дыскусіі, «круглыя сталы» па актуальных праблемах сучаснасці і выступленні на канцэртных пляцоўках — у такім напружаным рытме жывуць і працуюць сёння пасланцы нашай рэспублікі.

З раніцы да позняга вечара прымае гасцей культурна-выставачны комплекс Беларусі, які працуе ў «Міжнародным парку мастацтваў». Наведвальнікі знаёмяцца з беларускімі народнымі святамі, звычаямі, песнямі, танцамі, гульнямі. Гучаць удзячныя апладысменты майстэрству «Песняроў» і «Верасоў», «Крыжачка» і «Валачобнікаў». У рабоце творчых майстэрань удзельнічаюць паэт У. Някляеў, драматург А. Дударэў, рэжысёр В. Маслюк, ансамбль пантамімы «Рух». На грандыёзным фальклорным свяце «Лета ў Каломенскім», які для гасцей і ўдзельнікаў XII Сусветнага падрыхтавалі больш за тры тысячы прафесійных і самадзейных артыстаў, надзвычай цёпла было прынята выступленне гомельскага народнага тэатра «Жалейка»...

Неўзабаве скончацца радасныя і насычаныя дні XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. У суботу, 3 жніўня, будуць вымаўлены словы: «Да пабачэння, фестываль!» Ды ўжо сёння можна з упэўненасцю сказаць, што гэты летні тыдзень — належыць гісторыі. Форум юнацтва ўсёй планеты надаў новы штуршок для згуртавання прагрэсіўных сіл, для актывізацыі моладзі ў барацьбе за мір, супраць імперыялізму.

На здымках: фестывальныя імгненні, занатаваныя спецыяльным карэспандэнтам БЕЛТА У. ШУБАЙ. Пасланцы Беларусі — на Краснай плошчы; шмат цікаўных збірае праца народных майстроў у культурна-выставачным комплексе нашай рэспублікі; фальклорны ансамбль пад кіраўніцтвам Уладзіміра Пузыні — удзельнік культурнай праграмы фестывалю.

ЗБОР ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Выдавецтва «Молодая гвардия» распачало выпуск падпіснога збору твораў народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы Васіля Быкава. У чатырохтомнае выданне ўвойдуць усе найбольш значныя апавяданні, аповесці аўтара, а таксама яго публіцыстыка.

Толькі што выйшаў першы том, які склалі аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Франтавая старонка», «Альпійская балада». Прадмову напісаў вядомы беларускі крытык Д. Бугаёў.

У ліпені—жніўні ўбачаць свет другі і трэці тамы, у якія адпаведна ўвойдуць аповесці «Дажыць да світання», «Яго батальён», «Сотнікаў», «Пастка» і «Воўчая зграя», «Круглянскі мост», «Пайсці і не вярнуцца», «Абеліск».

У наступным годзе падпісчыкі атрымаюць заключны, чацвёрты том, у якім будуць прадстаўлены аповесць «Знак бяды», апавяданні, публіцыстыка.

П. ЛЯМЕШКА.

ТРЭЦЯЕ ВЫДАННЕ МЕМУАРАЎ

Найбольш цікавыя кнігі ўспамінаў аб барацьбе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі вытрымліваюць не адно выданне. Так было з мемуарамі В. Казлова, Р. Мачульскага, П. Калініна і іншых вядомых партыйных і дзяржаўных дзеячаў.

Шчаслівы лёс і ў кнігі П. Лебедзева «Мы — аляксееўцы». Аўтар яе чатырнаццацігадовым падлеткам стаў у шарэнгі барацьбітоў за вызваленне роднай зямлі, быў сувязным, потым разведчыкам партызанскай брыгады, якой камандаваў Герой Савецкага Саюза А. Данукалаў. Мемуары П. Лебедзева выходзілі ў 1975 і 1979 гадах. І вось — чарговая сустрэча чытача з кнігай, значна дапоўненай і дапрацаванай. Як і папярэднія, яна ўбачыла свет у выдавецтве «Беларусь».

К. ШЫМКО.

Прайшоў год, як не стала вядомага беларускага пісьменніка — паэта, празаіка, драматурга, эсэіста, рупнага працаўніка на ніве нацыянальнай культуры, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа Уладзіміра Караткевіча. Час з усёй строгасцю высвечвае, каго страціў наш народ у асобе гэтага выдатнага майстра. Пацвярджэнне таму — пасмяротнае прысуджэнне пісьменніку Дзяржаўнай прэміі БССР за раман «Чорны замак Альшанскі», рашэнне аб выпуску ў рэспубліцы шматтомнага падпіснога выдання выбраных твораў, нязменная чытацкая любоў.

У дзень смерці У. Караткевіча яго магілу наведалі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў рэспублікі, родныя і блізкія, шматлікія сябры, чытачы.

Фота А. КАЛЯДЫ.

У НОВЫМ ЗВАННІ

На прэм'еру араторыі «Поле маё старажытнае» на словы П. Макаля запрасіў жыхароў Іванава калектыў харавой капэлы раённага Дома культуры. Аўтар араторыі — кампазітар-аматар, мастацкі кіраўнік капэлы В. Перапёлкін.

Прэм'ера супала з другой значнай падзеяй у жыцці калектыву—прысуджэннем яму звання народнага. З вялікай канцэртнай праграмай капэла выступала на Украіне, у Пінску, Драгічыне, па рэспубліканскім тэлебачанні.

Каля 300 канцэртаў — такі вынік дзесяцігадовай дзейнасці другога папулярнага калектыву Іванаўскага РДК — вакальнага квінтэта «Пошук», таксама адзначанага званнем народнага. У аснове яго рэпертуару песні «Цвітуць бяссмертнікі», «Бэзавы цвет», «Я святкую вясну», напісаныя В. Перапёлкіным на словы М. Трафімчука і Б. Зайцава. Творчыя поспехі «Пошуку» адзначаны званнем лаўрэата I Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных, ганаровымі граматамі Міністэрства культуры СССР, ЦК ВЛКСМ, ВЦСПС.

М. МІКОЛЬСКІ.

ПАМЯЦІ ТАТАРСКАГА КАМПАЗІТАРА

Вялікая група кампазітараў і музыкантаў з Казані пабывала ў Дубровенскім раёне. Дзеячы культуры Татарскай АССР прыехалі сюды для таго, каб аддаць даніну памяці загінуўшага ў гады Вялікай Айчыннай вайны кампазітара, аўтара балета «Шуралe» Ф. Яруліна.

Камандзір узвода 82-й стралковай дывізіі Ф. Ярулін па-геройску загінуў у кастрычніку 1943 года ў баях за вызваленне вёскі Новая Тухінь. Але яго землякі, сябры, родныя і блізкія многія гады не ведалі дакладнага месца пахавання. Пасля доўгіх пошукаў гэта ўдалося ўстанавіць следапытам 646-й маскоўскай сярэдняй школы і Дубровенскага прафтэхвучылішча № 171.

Госці з Татарыі наведалі магілу Ф. Яруліна, усклалі жывыя кветкі, а скрыпач М. Ахметаў выканаў некаторыя творы кампазітара. Госці далі канцэрт у Дуброўне.

К. ІВАНОЎ.

КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ — МУЗЫКАНТ

У будучым годзе Мінскай дзіцячай музычнай школе № 1 імя Л. П. Александроўскай спаўняецца 60 гадоў. Тут навучаюцца будучыя скрыпачы, піяністы, віяланчэлісты, трубачы. 800 юных музыкантаў прыходзяць штодня ў светлы будынак на вуліцы Радыстаў.

За 60 гадоў школу закончылі шэсць тысяч выхаванцаў. Кожны чацвёрты з іх стаў прафесійным музыкантам, дзесяткі — лаўрэатамі ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў. Штогод навучэнцы даюць да 140 канцэртаў для працаўнікоў беларускай сталіцы.

Сто педагогаў школы пастаянна вядуць актыўную культурна-асветную дзейнасць. Па іх ініцыятыве ў вытворчым аб'яднанні імя У. І. Леніна адкрыта бясплатная музычная студыя, дзе 40 маладых прыборабудаўнікоў з поспехам спасцігаюць тайны музычнага мастацтва. У абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна пры ўдзеле спецыялістаў школы працуе музычная гасціная. Для навучэнцаў старэйшых класаў створаны лекторый «Ідэалагічная барацьба ў мастацтве на сучасным этапе».

М. СІСКЕВІЧ.

Віншуем!

За вялікую работу па мастацкім абслугоўванні працоўных горада Мінска ў перыяд гастроляў у ліпені 1985 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Маскоўскі акадэмічны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатр сатыры Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Міхась РУДКОЎСКІ

Балада пра Галінку і белакрылую песеньку

У новым доме
З вокнамі веснімі
Жыла Галінка,
А з ёю песенька, —
Галасок-званочак,
Крыльцы беласнежныя —
Такая вясёлая
І крышачку смешная.

Яна з Галінкай
У лялькі гуляла,
Яна з дзяўчынкай
Вянкі звівала,
Вянкі звівала,
Сонца вітала:
— Дзень добры, сонейка!
Дзень добры, яснае!.. —
Была Галінка
З песенькай
Шчасная.

Але аднойчы
У леце шостым
Закрыла сонца
Страшнае штосьці.
Вужакай бліснула,
Грымнула громам.
Злавесным громам
Над новым домам
З вокнамі веснімі...
. . . . . ,
Дзе ты, Галінка?
Дзе твая песенька?

Я і праз годы
Цябе шукаю,
Хаджу — гукаю,
Хаджу — пытаю.
Пытаю ў рэчкі,
У быстрацечкі,
І у крынічкі,
І у сінічкі,
І ў соваў мудрых
У пушчы, гаі.
Ды ўсе мне кажуць:
— Не, мы не знаем.
Пытаў я сотні
Людзей прыветных,
Тутэйшых нашых
І што з-за свету, —
Ніхто не бачыў,
Ніхто не знае.

А сёння вас
Яшчэ пытаю:
— Мо хто страчаўся
З маёй Галінкай —
Мілай гарэзай,
Слаўнай дзяўчынкай
І з яе песенькай —
Птушачкай весняю,
Такой вясёлай
І трошкі смешнаю?

Калі страчаліся,
Мне падкажыце,
Калі спаткаеце,
Мяне гукніце.
Я сэрцам чую,
Я сэрцам знаю:
Яна жывая!
Яна — жывая!..

●

Раны вайны я крынічнай вадой
прамываю
І перавязваю чыстым снягоў палатном.
Лекар благі ці то лекі не тыя —
не знаю:
Раны мае адкрываюцца зноўку і зноў.

Я іду па зямлі

Хто такі там сказаў,
Што ніколі не быў я на войнах —
Ні на тых на далёкіх,
Ні на гэтай апошняй вайне?
Хто такі там сказаў,
Што жыву я спакойна?
Хто падумаць так змог
Пра мяне!
Быў я там. Там я быў!
Я змагаўся за волю і долю —
І крывінка мая
У славянскай зямлі — не адна:
Меч мой бачыў Грунвальд,
Чудскі лёд,
Куліковае поле,
І Палтаву,
І поле пякельнае Барадзіна.
Я на беразе Буга кусаў
Свае губы ад смагі;
І на Курскай дузе,
Быццам факел, у танку палаў;
Пахаваны на Вісле —
скрозь смерць,—
Я паўстаў перад Прагай,
І, дзяўчынку узяўшы на рукі,
На плошчы Берліна устаў.
І пайшоў па зямлі,
І узвёў гарады і заводы,
І засеяў жытнёва —
як вокам акінуць —
прастор,
І, паклаўшы пад ногі,
Свае крамяністыя годы —
Я руку працягнуў —
праз аблокі — да зор.
Я іду па трывожнай зямлі,
Па глыбінях і небе.
Я іду, як спакон,
Разам з сонцам—
Іду па зямлі.
Жыць хачу я.

Вы чуеце голас Сандзіна?

Не, ён не загінуў, Аўгуста Сандзіна,
Хоць быў і забіты па-зверску.
Не, ён не загінуў!
Вы чуеце голас ягоны?
— Той гіне хутчэй за другіх,
Хто смерці баіцца.
Смерць — міг непрыемны, і толькі.
Прымаць яго вельмі сур'ёзна не варта.
І зброі я не складу,
Нат калі складуць усе.
Хай я загіну са жменькаю тых,
Што засталіся са мною, —
Памерці лепш у барацьбе,
Чым жыць і гібець у няволі.
Радзіма й свабода!

Вы чуеце голас Сандзіна?
— Клянуся я перад Радзімай
і прад Гісторыяй:
Шпага мая верне вам
гонар нацыянальны
І прынясе вызваленне!
На выклік,
Што кінулі подлыя акупанты,
Адказваю клічам да бою!
Я і салдаты мае
станем сцяной,
І аб яе разаб'юцца
ворагаў легіёны!
Я заяўляю народам
Лацінскай Амерыкі ўсёй:
У Кардыльерах ёсць патрыёты,
Што будуць змагацца,
Змагацца
і паміраць як мужчыны.
Радзіма й свабода!

Вы чуеце голас Аўгуста Сандзіна?
— Ідзіце ж у нашыя горы,
здраднікі і акупанты,
Страляць нас ідзіце.
І колькі б вас ні было,
Я вас чакаю з маімі байцамі.
Нас, лацінаамерыканцаў,
Мільёны,
мільёны,
мільёны,
І нашая сіла — ў адзінстве.
Радзіма й свабода!

Сцяг на шпазе Сандзіна
Нёс народу яго вызваленне.
Сцяг на шпазе Сандзіна
Сягоння на варце свабоды Радзімы.
А голас, а заклік яго —
Свабодных людзей генерала —
Рэхам магутным грыміць
Па прэрыях,
джунглях,
па Кардыльерах —
І узнімаюцца новыя тысячы,
тысячы тысяч,
Бяруцца за зброю і патрабуюць:
— Радзіма й свабода!
Радзіма й свабода!

НАТХНЯЛЬНІК І АРГАНІЗАТАР

«Камуністы, наперад!» — каму невядомы гэтыя словы, якія даўно сталі легендарнымі і крылатымі. Асаблівы сэнс і значэнне яны набылі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі члены ленінскай партыі знаходзіліся на самых адказных участках фронту і тылу, прыкладамі асабістай мужнасці і гераізму ведучы людзей за сабой.

За гады вайны ў рады партыі ўступіла больш за 5 мільёнаў чалавек. Ва Узброеных Сілах знаходзілася ад 42,4 да 60 працэнтаў усяго саставу партыі. 3 мільёны камуністаў аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць Радзімы. 2,5 мільёна камуністаў, якія знаходзіліся ў дзеючай арміі, за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе за гонар, свабоду і незалежнасць Радзімы, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. 7 688 удастоены ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.

Гэтыя лічбы прыводзяцца ў кнізе А. Хацкевіча і Г. Алдакушына «Натхняльнік і арганізатар Вялікай Перамогі», выпушчанай выдавецтвам «Беларусь», якая ў папулярнай форме раскрывае ролю Камуністычнай партыі ў мабілізацыі савецкага народа на адпор ворагу, а ўсіх ваенных і працоўных рэсурсаў на дасягненне перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Падмацоўваючы свае вывады і абагульненні вытрымкамі з твораў класікаў марксізму-ленінізму, партыйных дакументаў ваеннага часу, спасылаючыся на рашэнні партыйных з'ездаў і пленумаў, пастаноў, прыводзячы выказванні вядомых савецкіх ваеначальнікаў, партыйных і савецкіх дзеячаў, аўтары паказваюць, як з першых жа дзён нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз краіна наша пачала ператварацца ў магутны ваенны лагер.

На гэтым завастраецца ўвага ў раздзеле «Мабілізацыя ўсіх сіл на барацьбу з фашызмам», з якога бачна, што план «маланкавай вайны», распрацаваны гітлераўцамі, недаацаніў эканамічнай і ваеннай магутнасці сацыялістычнай дзяржавы, а галоўнае — моцы савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу. Першыя баі пераканалі фашысцкіх ваякаў, што ў Расіі ім давядзецца нялёгка. А. Хацкевіч і Г. Алдакушын паказваюць, як адбывалася перабудова радоў партыі, мяняліся ў адпаведнасці з ваенным часам змест, формы і метады яе работы. Ствараліся адпаведныя органы кіраўніцтва. Па рашэнні Палітбюро ЦК ВКП(б) на кіруючую работу ў Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот у якасці членаў ваенных саветаў і начальнікаў паліторганаў франтоў, армій і злучэнняў былі накіраваны 500 сакратароў ЦК кампартый саюзных рэспублік, краявых, абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, 270 адказных работнікаў апарату ЦК ВКП(б), 1265 работнікаў абласнога і раённага звяна...

Камуністычная партыя выступіла і арганізатарам барацьбы савецкіх людзей з ворагам у тыле. Як праводзілася гэтая мэтанакіраваная, прадуманая работа, што дазволіла каардынаваць дзеянні рэгулярных часцей і народных мсціўцаў, расказваецца ў раздзеле «На чале ўсенароднай барацьбы ў тыле ворага». У першую чаргу аўтары расказваюць аб гэтым на прыкладзе Беларусі, якая стала рэспублікай - партызанкай.

У раздзеле «Партыя — арганізатар карэннага пералому ў ходзе вайны» закранаюцца пытанні работы партыі ва ўмовах, калі былі дасягнуты не толькі першыя поспехі ў барацьбе з ворагам, а і стала відавочным, што вайна ўступае ў свой чарговы этап, а ініцыятыва цалкам пераходзіць да савецкіх войск. Менавіта ў гэты час набыў сваю асаблівую значнасць лозунг «Усё для фронту! Усе для перамогі!». Чырвоная Армія была ўмацавана навейшай баявой тэхнікай і зброяй, што паступалі з прадпрыемстваў, якія працавалі ў глыбокім тыле, а часам ледзь і не ля самай перадавой дзень і ноч.

Заключны раздзел «Па абавязку патрыётаў і інтэрнацыяналістаў» расказвае, як, выконваючы сваю гістарычную місію па вызваленні народаў Еўропы ад фашызму, Чырвоная Армія несла ім сцяг міру і свабоды. У гэтым раздзеле, як і ва ўсёй кнізе, развенчваюцца спробы буржуазных гісторыкаў, саветолагаў розных масцей прынізіць ролю Камуністычнай партыі ў разгроме фашызму, зменшыць значэнне подзвігу савецкага народа ў другой сусветнай вайне.

В. ГУРЭЦКІ.

«ЁСЦЬ НАША ЦАГЛІНКА...»

Нядаўна мы з пісьменнікам Леанідам Прокшам праходзілі мінскай вуліцай імя Казлова. Зазірнулі на старыя могілкі. Іх добра ведаюць жыхары горада, бо тут пахаваны Я. Купала, Я. Колас, іншыя літаратары: Паўлюк Трус, Кузьма Чорны, Алесь Гурло, многія генералы, афіцэры, салдаты — вызваліцелі горада.

Мне запомніліся радкі на помніку Міхася Клімковіча:

Мы будзем жыць вечна
У славе народа,
У кожным здабытку,
У мясцінцы любой
Ёсць наша цаглінка,
Ёсць наша работа,
Як мёд ёсць у кветцы
Любой палявой.

Мы ідзём па могілках, і раптам Леанід Януаравіч кажа:

— А ведаеш, тут пахаваны і наш франтавы таварыш...

Сапраўды, вось яна, сціплая магіла Юрыя Герасімавіча Рудзько (24 чэрвеня 1913 — 4 лютага 1948), з якім мы прайшлі вайну, спачатку побач, потым на розных франтах.

Юрый Рудзько. Малады беларускі пісьменнік і драматург. Пасля заканчэння сярэдняй школы настаўнічаў у Слуцкім раёне, а потым, завяршыўшы вучобу на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага, з 1933 года працаваў у рэспубліканскім друку. У 1935 годзе Ю. Рудзько быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, а пасля звальнення ў запас з 1937 года з'яўляўся літсупрацоўнікам, затым загадчыкам аддзела мастацтва ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва».

Успамінаючы пра Юрыя Рудзько, мне хочацца расказаць не пра тое, як ён творча рос, як увайшоў у літаратуру, а толькі пра тое, якім я ведаў яго ў арміі. Яшчэ ў 1939 годзе разам з ім мы прымалі ўдзел у вызваленні Заходняй Беларусі. Быў Юра сярод сяброў таварыскі, вясёлы, а ў рабоце — засяроджаны, прынцыповы. Часам у вольную гадзіну любіў расказваць пра будні даваеннага мінскага пісьменніцкага асяроддзя. З асаблівым пачуццём павагі расказваў пра Я. Купалу, Я. Коласа, К. Крапіву, П. Броўку, М. Лынькова. Успамінаў, як збіраліся пісьменнікі ў маленькім кафэ на Камсамольскай вуліцы і там, у нязмушанай абстаноўцы, вялі гаворку пра лепшыя творы масцітых пісьменнікаў, пра творчасць маладых.

І вось трывожнае 22 чэрвеня 1941 года. Раніцой, як і ўсе мы, мабілізаваныя, Юрый Рудзько, захапіўшы з сабой асабістыя рэчы, прадугледжаныя на выпадак баявой трывогі, прыбыў у прызначаны пункт збору палітсаставу Заходняй Асобай ваеннай акругі, які знаходзіўся на рагу вуліц Кірава і Чырвонаармейскай. Рудзько быў яшчэ пад уражаннем учарашняга ўрачыстага вечара ў Доме афіцэраў з выпадку паспяховага выступлення артыстаў МХАТа і ніяк не мог паверыць, што сёння на ўсіх нас навалілася крывавая вайна.

Ад Мінска да Падмаскоўя нам давялося адступаць у складзе войск Заходняга фронту. У ліку спецпрапагандыстаў Палітупраўлення знаходзілася група газетных работнікаў-мінчан: Васіль Самуцін, Леанід Прокша, Юрый Рудзько, Аляксандр Лебедзеў, Савелій Непачаловіч, аўтар гэтых радкоў, некалькі паліграфістаў: Шляпо, Маршак, Дзем'яновіч, Шленаў, Сарокін, фатограф Сімута (на жаль, імёнаў не помню).

Ішлі бежанцы: жанчыны, дзеці, старыя — змучаныя, стомленыя, галодныя, з тварамі, поўнымі жаху і пакут. А фашысцкія сцярвятнікі з'яўляліся над дарогамі і абрыньвалі з паветра шквал агню і бомбаў.

Ворат рваўся на ўсход. Нашы войскі стаялі насмерць. Аднак пад націскам пераўзыходзячых сіл гітлераўскіх полчышчаў даводзілася адступаць. І ўсё ж, нягледзячы на цяжкую сітуацыю, вялікія страты, савецкія воіны верылі ў перамогу. І мы, спецпрапагандысты, у лістоўках, радыёперадачах на пярэднім краі прадказвалі фашыстам немінучую гібель. Падмаскоўная бітва, разгром адборных варожых дывізій вермахта на подступах да сталіцы пацвердзілі, што не толькі гарматы, але і наша спецпрапаганда біла ў цэль. Палонныя нямецкія салдаты нярэдка мелі пры сабе лістоўкі, якія скідвалі савецкія авіятары ў стан ворага. Над падрыхтоўкай і выданнем агітацыйна-прапагандысцкіх матэрыялаў, якія выкрывалі авантурызм і шалёныя планы Гітлера, плённа працаваў і Юрый Рудзько.

У 1942 годзе да нас прыбылі палітработнікі П. Глебка, П. Броўка і М. Лынькоў. На гэтай сустрэчы прысутнічалі многія спецпрапагандысты. Гутарка пра Радзіму, пра мужнасць беларускіх партызан праходзіла ў невялікім хвойніку каля чыгуначнай станцыі Обнінская, дзе цяпер раскінуўся вялікі, шырока вядомы горад Обнінск.

Група мінскіх журналістаў-спецпрапагандыстаў на Заходнім фронце. Злева направа: Л. Прокша, В. Казімірскі, С. Непачаловіч, А. Лебедзеў, Ю. Рудзько, С. Партасёнак (сакавік, 1942 г.).

Пачатак 1943 года. Вайна вызначыла нам розныя дарогі. Юрый Герасімавіч застаўся на Заходнім, пазней 2-ім Беларускім фронце, а мяне накіравалі на Варонежскі, пазней 1-ы Украінскі. Перапіска з Юрыем Герасімавічам не спынялася. Не-не, ды палявая пошта і даставіць кароткую вестачку ад даўняга сябра. На жаль, не ўдалося захаваць усе франтавыя пісьмы, атрыманыя ад Юрыя Рудзько. Але вось адно з іх сёння ляжыць на маім пісьмовым стале. Маленькі самаробны канверт. Дата адпраўлення 24 снежня 1944 года, палявая пошта 47763. Пісьмо напісана на невялікім аркушы пажоўклай газетнай паперы. Дробны, але разборлівы почырк. Коратка расказаўшы аб сваім франтавым жыцці, Юрый з аптымізмам, цвёрдай верай у нашу справу піша: «...Сустракаем 1945 год! Гэты год абяцае нам шмат цудоўнага, бо ён будзе годам поўнай перамогі! Хвалюючыя думкі выклікае сустрэча гэтага баявога і слаўнага года 1945».

У гэтым пісьме Рудзько намякае на не зусім моцнае здароўе, на свой чацвёрты дзесятак, які, як піша, «дае аб сабе знаць». Аднак яго, камуніста з 1940 года, ужо маёра-палітработніка, маладога беларускага пісьменніка, больш за ўсё хвалявала не гэта, а другое: «..Злы на сябе — бо не ўдалося дагэтуль напісаць нічога для душы, а час ідзе — і не вернеш яго. Будні неяк з'ядаюць усю энергію і час. Бяда! Даводзіцца адкладваць усё на будучае. А яно ж далёка — гэтае будучае, калі можна будзе засесці па-сапраўднаму за справу. Вось гэта турбуе — творчы лёс...»

Сустрэча з Юрыем Рудзько ў нас адбылася на польскай зямлі ўжо пасля Перамогі ў жніўні 1945 года. Ён быў тады ў асабліва прыўзнятым настроі, сказаў, што дэмабілізуецца і марыць паехаць у Ялту, каб падлячыцца і потым заняцца літаратурнай працай.

Наканавана Юрыю Рудзько было кароткае жыццё, памёр ён у 35 гадоў. Але, нягледзячы на гэта, пісьменнік пакінуў немалую літаратурную спадчыну. Гэта аповесці «Над Одэрам», «Сакрэт маладосці», апавяданні «Пасля развітання», «Вернасць», «Лёля», «Гаспадары сонечнай зямлі», «Салавей» і іншыя. Яго п'есы ставіліся самадзейнымі калектывамі. Камедыя «Дарагі госць» адзначалася рэспубліканскай прэміяй. У 1950 годзе была выдадзена кніга «Слава дружбе», у якую ўвайшлі выбраныя творы Юрыя Рудзько.

Мы не забудзем франтавых сяброў, якія беззапаветным служэннем Радзіме ўнеслі свой уклад у нашу агульную Перамогу над ворагам.

С. ПАРТАСЁНАК,
навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР.

Сан-Сусі, уратаваны савецкімі салдатамі



Гвардыі капітан Я. Лудшувейт (4-ы злева) у 1946 г. сярод афіцэраў сваёй «паркавай арміі».

ПАЛАЦ І ПАРК САН-СУСІ ў акруговым цэнтры ГДР Патсдаме, размешчаным у гадзіне язды ад Берліна, ставяць побач з французскім Версалем, Пецяргофам пад Ленінградам, з дрэздэнскім Цвінгерам. Знакаміты дойлід Кнабельсдорф узвёў тут па заказе прускага караля Фрыдрыха II (1740—1786 гг.) раскінуты на засаджанай вінаградам гары палац — «Без турбот», што азначае «Сан-Сусі» ў перакладзе з французскай.

Архітэктары Шынкель, Персіус і Гонтард, афарміцель паркаў Ленне, мастакі і рамеснікі ўнеслі сваю лепту. Парк плошчай каля 300 гектараў з яго палацамі, павільёнамі і скульптурнымі групамі ператварыўся пад іх рукамі ў жамчужыну ракако і класіцызму. Палюбавацца імі штогод прыязджаюць дзесьмі мільёнаў наведвальнікаў.

Адна з вядучых да Сан-Сусі вуліц, па якой прыбываюць многія госці, — гэта алея прафесара Лудшувейта. Яна названа ў гонар чалавека, у вялікай ступені дзякуючы якому сённяшнія палац і парк не дасталіся нам у спадчыну ў выглядзе руінаў.

У КРАСАВІКУ 1945 ГОДА сітуацыя тут была такая. Арміі маршалаў Жукава і Конева сталі пад Берлінам. Фашысцкае галоўнакамандаванне загадала ўтрымліваць раён Патсдама, які адносіўся да «абароннай зоны Берліна». Штаб прызначанага камандуючым «баявым участкам Патсдама» генерал-лейтэнанта Рэймана заняў пазіцыю побач з Новым палацам. У парку Сан-Сусі акапаўся апошні рэзерв Гітлера: фанатычна настроеныя падлеткі з так званага фольксштурму. Фашысцкае камандаванне абсурдна паставіла на карту неацэнныя каштоўнасці культуры. Сан-Сусі было загадана ўтрымліваць як мага даўжэй, а калі гэта будзе больш не пад сілу, узарваць яго.

27 красавіка савецкія войскі вызвалілі Патсдам. Калі іх затым абстралялі з парку палаца, самым простым для іх было б выкарыстаць супраць праціўніка танкі і цяжкую зброю. Да таго ж напраміак галоўнага ўдару на Берлін праходзіў праз парк. Савецкі генерал Лелюшэнка, які камандаваў танкавай арміяй, што заняла Патсдам, прыняў новае рашэнне. Адпаведна з загадам Сталіна захаваць для чалавецтва ўсюды, дзе гэта толькі магчыма, скарбы сусветнай культуры, яго войскі, нягледзячы на тактычныя цяжкасці, абышлі парк.

У ТОЙ ДЗЕНЬ 27 КРАСАВІКА, калі савецкія пехацінцы выконвалі цяжкую і пазыкоўную баявую задачу па вызваленні Сан-Сусі, гвардыі старшы лейтэнант Яўгеній Фёдаравіч Лудшувейт атрымаў ад камандавання арміі загад, які паставіў яго ў першы рад выратавальнікаў Сан-Сусі: на яго, прызначанага камендантам, была ўскладзена адказнасць за ахову палаца і парку.

Са справаздачы, якую ён склаў праз некалькі дзён пасля разгрому фашызму, відаць, з якой інтэнсіўнасцю ён узяўся за выкананне гэтай задачы. Як упаўнаважаны камандавання арміі, пісаў ён, «я накіраваў нямецкаму камандаванню радыёграму, у якой прапанаваў не абстрэльваць палацы і парк, пакінуць іх па-за баявымі дзеяннямі. Я быў вельмі заклапочаны лёсам скарбаў мастацтва і хацеў абавязкова захаваць іх». Савецкія войскі, якія рухаліся ў напрамку да Берліна, паклапаціліся пра тое, каб фашысты больш не змаглі прынесці Сан-Сусі ў ахвяру.

Яшчэ ў той час, калі чырвонаармейцы метр за метрам адваёўвалі ў фашыстаў іх пазіцыі, старшы лейтэнант са сваёй камандай узяліся за забеспячэнне аховы палаца і павільёнаў. Гэта была нялёгкая справа.

У сваёй справаздачы ён пісаў: «Я быў, праўда, камендантам Сан-Сусі, але ў першыя дні па сутнасці не меў у распараджэнні салдат. Баі яшчэ працягваліся, і патрэбны быў кожны чалавек. Таму мне як каменданту давялося самому шукаць сваю каманду. Я ўзяў у «паркавую армію» лёгкапараненых і тых, хто выздараўліваў. І ўсё ж іх не хапала для велізарнай тэрыторыі, якую трэба было ахоўваць. Часта я ўставаў уначы, каб пракантраляваць, ці ўсё ў парадку. Між тым работы ў Сан-Сусі і вакол яго працягваліся. Набыўшы цэмент, мы пачалі рамантаваць купал палаца».

ДЗЯКУЮЧЫ СТАРАННЯМ старшага лейтэнанта Лудшувейта і яго «паркавай арміі» з палаца не прапаў ні адзін твор мастацтва. Адначасова салдаты Лудшувейта пачалі рэгістраваць скарбы, даставалі іх з сырых склепаў і стварылі прадумовы для будучай рэстаўрацыі.

Так Сан-Сусі ахоўвалі да таго часу, пакуль нямецкія антыфашысцкія сілы ў Патсдаме не змаглі ўзяць гэтую задачу на сябе. Яны прынялі палац, павільёны і парк амаль непашкоджанымі. І за выключэннем экспанатаў, вывезеных фашыстамі, кожная карціна, кожная фарфоравая фігура і кожны прадмет мэбліроўкі знаходзіліся на сваім месцы.

Таксама гэта была заслуга Лудшувейта, які пазней стаў гвардыі капітанам і які сказаў пра сябе: «Я толькі выконваў свой абавязак, як гэта зрабіў бы кожны салдат Савецкай Арміі». Яго (пасля вайны ён стаў прафесарам па гісторыі культуры ў Маскоўскім універсітэце імя Ламаносава) жыхары Патсдама не забылі. Яны зрабілі яго ганаровым грамадзянінам горада, а пакой Лудшувейта ў палацы, у якім стаіць яго бюст, нагадвае аб выратаванні Сан-Сусі 40 гадоў назад.

Вільфрыд ЦІДЗІНГ.

СУЧАСНАСЦЬ І СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА

Аляксей РАГУЛЯ

ЗА ЎСЁ Ў АДКАЗЕ,
або
Новыя матывы і пераемнасць традыцый

ФРАНЦУЗСКІ ПІСЬМЕННІК Жан Ануй яшчэ ў 1937 г. напісаў п'есу «Падарожнік без багажа», галоўны персанаж якой у нямецкім палоне страціў памяць. Да мінулага, у якім не было ні дружбы, ні чалавечнасці, Гастон свядома вяртацца не хоча. Праблема памяці ў п'есе Жана Ануя вырашаецца ў адпаведнасці з экзістэнцыялісцкім разуменнем самасці як поўнага вызвалення асобы ад грамадства.

Беларуская літаратура, наследуючы традыцыям фальклору, у вырашэнні праблемы памяці пайшла іншым шляхам. Характэрны для казак матыў змагання народа з цмокам, які крадзе ў людзей сонца, зоры, месяц, цягне ў норы дзяцей, у літаратуры напаўняецца канкрэтным сацыяльна-псіхалагічным аналізам. Барацьба за чалавека сродкамі літаратуры для Купалы, Коласа, Гарэцкага, Чорнага стала барацьбой за вяртанне забранай бацькаўшчыны, украдзеных чалавечых душ. К. Чорны ў сваіх сацыяльна-філасофскіх раманах стварыў галерэю разнавіднасцей вялікага і жорсткага злодзея, які крадзе ў чалавека не толькі лепшую пару яго жыцця, але і выварочвае душы дзяцей.

В. Казько ідзе ў рэчышчы гэтых традыцый філасофскай прозы. У яго падыходзе да праблемы асобы ёсць шмат агульнага з падыходам Ч. Айтматава. Выдатны кіргізскі празаік гнеўна выкрывае сучасных манкуртаў — спадарожнікаў без маральнага багажа, гатовых, кажучы словамі Купалы, гандляваць духоўнай спадчынай «дабравольна, без прынук». В. Казько больш цікавіць працэс пераадолення асобай духоўнага небыцця — вызвалення з вымушанага бяспамяцтва, працэс авалодвання дарам слова, якое яднае людзей у іх змаганні за будучыню. Для Казько, як і для К. Чорнага, яна ўвасабляецца не ў абесчалавечанай тэхналогіі, а ў жывых людзях — нашых нашчадках. З пункту гледжання іхняй чалавечай паўнацэннасці раскрываецца годнасць сучасніка. Час — паняцце з чалавечага пункту гледжання не адназначнае. Ён кліча нас да стварэння і ўдасканалення новых форм быцця і заадно настойліва навязвае шаблоны духоўнага акасцянення. У жыцці Яўмена Ярыгі надыходзіць момант усведамлення ісціны: існаванне ў духоўнай ізаляцыі ад будучыні ператварае чалавека ў «абымшэлы валун». Колька Лецечка на схіле свайго кароткага веку таксама ўсведамляе, што ён, не сказаўшы свайго слова на судзе, будзе не чалавек, а нямая рыбіна, гліна, прыдатная на тое, каб грунтоўна замазаць усе шчыліны ізалятара. На гэтую характэрную для эпохі альтэрнатыву звярнула ўвагу і філасофская лірыка:

Камень камню скардзіўся аднойчы:
— Вось прыступнаю ляжу на ганку —
І ніякага пакою з ранку
Аж да ночы.

Камень камню адказаў: — Табе што?
Я вось на пагосце век марнею
І ад цішыні, знаць, звар'яцею
Да рэшты.

Чалавек — не камень. Яго кліча наперад будучыня. Як чалавек ідзе да яе сёння, як умее яе тварыць — гэтыя пытанні цяпер з'яўляюцца куды больш важнымі, чым пытанне аб месцажыхарстве героя. Гэтыя кардынальныя пытанні ў беларускай прозе распрацоўваліся ў асноўным на вясковым матэрыяле, і творы гарадской тэматыкі пачынаць усё спачатку не павінны.

Нельга дзеля тэматыкі ахвяраваць ні дасягнутым узроўнем вырашэння праблемы, ні распрацаванай стылістыкай. Акцэнты на некаторых «спецыфічных» асаблівасцях гарадской тэматыкі — падкрэсленым рацыяналізме ў абмалёўцы персанажаў, журналісцкай бойкасці стылю, паказным інтэлектуалізме — адводзяць увагу ад чалавеказнаўчай праблематыкі, ствараюць атмасферу знарочыстай гульні.

Аповесць Алеся Станюты «Мост» сваім зместам гарадская, але спецыяльна гэта ў творы не падкрэсліваецца. Сваёй зацікаўленасцю да працэсаў духоўнага станаўлення гарадскога юнака, моўнай культурай, эмацыянальнай таналыпасцю яна добра ўпісваецца ў традыцыі нацыянальнай прозы. Карыстаючыся мяккімі акварэльнымі фарбамі, А. Станюта ўдала перадае пачуццё замілавання з маленства родным кутком у горадзе. Унутраным драматызмам прасякнуты старонкі роздуму над зменлівым рухам часу, над жыццём вонкава няяркіх, але шчодрых душою людзей.

Аповесць «Мост» лішні раз пераконвае ў тым, што поспех да пісьменніка прыходзіць не тады, калі ён разбурае масты паміж творамі гарадской і вясковай тэматыкі, што асваенне лепшых традыцый было і застаецца непахіснай умовай руху наперад.

Нікольні не абсалютызуючы ролю той ці іншай тэмы, трэба ўсё ж сказаць, што прыкметным недахопам сучаснай прозы з'яўляецца недастатковая яе ўвага да грамадскай дзейнасці сучасніка, накіраванай на ўдасканаленне сацыяльных адносін. Дзейнасць людзей, якім даручана кіраўніцтва вытворчымі і сацыяльнымі працэсамі, — важнае звяно стваральнай дзейнасці грамадства. Зразумела, што ў адлюстраванні гэтай сферы грамадскага жыцця поспеху зможа дасягнуць пісьменнік, які і гэтую тэму зможа раскрыць знутры, якому яна арганічна блізкая, пра што і піша ў сваім артыкуле Міхась Кенька.

У сучаснай прозе праблему кіраўніцтва грамадскімі працэсамі паспяхова распрацоўвае Валянцін Блакіт. Яго героі — кіраўнікі заводаў, калгасаў, партыйныя работнікі, журналісты. Жыццё людзей гэтага асяроддзя, іх маральныя ўстаноўкі і прынцыпы, жыццёвыя мэты і сродкі іх дасягнення В. Блакіт ведае з практыкі. Асновай канфлікту ў аповесцях В. Блакіта з'яўляецца сутычка паміж людзьмі супрацьлеглых вартасных арыентацый.

Для такіх кар'ерыстаў, як Сурміла («Шануй імя сваё») ці Салавейчык («Адчай»), кіруючая пасада мае каштоўнасць толькі таму, што яна дае хоць не выключныя, але ўсё ж нейкія асаблівыя правы: «Гаспадар тут пакуль што я, дырэктар. Прашу гэта зарубіць сабе раз і назаўсёды...» Так адстойвае дадзенае самому сабе права на безадказныя паводзіны Салавейчык, калі рабочыя і парторг Быліч напамінаюць дырэктару пра грамадзянскі і чалавечы абавязак. Гэтае «пакуль што» выдае ў абліччы Салавейчыка звычайнага мешчаніна, які спяшаецца ўрваць як мага больш выгодаў, а заадно і незаслужанай славы, пакуль усміхаецца фартуна. У сваім службовым кабінеце Салавейчык стварыў яшчэ адзін свет з падпольнымі выгодамі — лазняй, пітвом і іншымі салодкімі ўжыткамі, што складаюць вяршыню мяшчанскага ідэалу.

В. Блакіт выкрывае мяшчанства ў асяроддзі, якое да гэтага часу ў літаратуры паказана недастаткова. На гэтым перспектыўным напрамку пісьменнікам зроблены цікавыя мастацкія адкрыцці. Яны маглі б быць і больш значнымі, калі б В. Блакіт пашырыў поле дзеяння канфліктаў, у якія ўцягнуты яго героі-антыподы. Варта тут успомніць творчы вопыт Івана Мележа: канфлікт паміж Апейкам і Башлыковым у «Палескай хроніцы» пісьменнік падае не як паядынак двух кіраўнікоў, а як важную сацыяльную праблему, вырашэнне якой закранае інтарэсы шырокіх мас. Аповесць «Усмешка фартуны», у якой паказаны працэс пераўтварэння здольнага журналіста Андрэя Чарапіцы ў мінскага абывацеля Бяскуднікава-Паскуднікава, гаворыць аб тым, што В. Блакіт пачынае больш пільна прыглядацца да сацыяльных і маральных вынікаў кар'ерызму.

Патрэба даць больш дакладную ацэнку пройдзенаму шляху — характэрная асаблівасць сучаснай літаратуры наогул. Проза больш даследуе ўменне асобы ацэньваць свет, у якім мы жывём, з улікам уласнага вопыту, гаварыць сваім голасам, бачыць рэчаіснасць сваімі вачыма, ацаніць, як гаворыцца ў апавяданні А. Жука «Дома», «пражытае і перажытае і ўбачыць, што зладзілася, а дзе і даў ты, чалавеча, хібу». Ацэнка «пражытага і перажытага» ў прозе вызначае асаблівасці яе паэтыкі. Для сучаснай прозы характэрна імкненне ахапіць усе сферы жыццядзейнасці сацыяльнага арганізма ў нейкі пэўны момант яго функцыяніравання — спыніць імгненне, незалежна ад таго, з'яўляецца яно цудоўным ці якім-небудзь іншым. У падобных структурах, зразумела, запавольваецца развіццё сюжэтных калізій, рэчаіснасць тут падаецца як бы порцыямі («квантамі»), але затое ў сукупнасці многіх яе пластоў. Адгэтуль ідзе імкненне падзяліць твор на асобныя дзеі, наблізіць прозу да драмы, убачыць за асобнымі карцінамі агульны сэнс эпохі. З мэтай пашырэння гіпатэтычных магчымасцей вобразнай думкі часта выкарыстоўваюцца ўмоўныя сітуацыі, малюнкі і вобразы, навеяныя снамі. Падобная паэтыка плённа асвойвалася ўжо напярэдадні Кастрычніка. Шырокага абагульнення ў паказе працэсаў станаўлення асобы ў драматызаваных паэмах дасягнуў Я. Купала, у драматызаваных аповесцях — М. Гарэцкі, Якуб Колас часта звяртаўся да ўстаўных філасофска-алегарычных навел, Кузьма Чорны выкарыстоўваў эпістолярныя формы, І. Мележ—стэнаграмы сесій ЦВК БССР.

Падобныя формы часта сустракаюцца сёння ў прозе В. Казько, А. Жука. Вялікая сэнсавая нагрузка на ўстаўную структуру выпала ў рамане В. Гігевіча «Доказ ад процілеглага», у якім пісьменнік дае акрэслены адказ на многія пытанні духоўнага жыцця. Сярод іншых вылучаецца адказ на пытанне: хто ёсць хто, чые і куды скіраваны інтарэсы?

Сярод людзей, што акружаюць нас у штодзённым жыцці, ёсць нямала схільных, паказвае В. Гігевіч, да паразітычнага існавання. Для Рамана Барысавіча Алмазава праца ў лабараторыі мае сэнс настолькі, наколькі дзяржаўная лабараторыя з'яўляецца пастаўшчыком бясплатных вузлоў і дэталей для ўласнай майстэрні. Алмазаў дзейнічае ў значна меншых маштабах, чым Жлукта з сатырычнай камедыі К. Крапівы, але ён у сутнасці з'яўляецца разнавіднасцю таго ж «мілага» ці «дзяржаўнага» чалавека, які любой цаной імкнецца здабыць сабе выключнае права на неабмежаванае спажыванне. Радзівон Салавейчык у аповесці «Адчай» В. Блакіта ідзе да кар'ерысцкіх мэт, так сказаць, законным шляхам, ва ўсякім разе — амаль што адкрыта.

Паразітызм — гэта яшчэ не ўсё зло, якое сучасны абывацель прычыняе грамадству. У Алмазава ёсць яшчэ «тэорыя», якую ён настойліва імкнецца ўкараніць у свядомасць людзей у якасці нормы. Яго тэорыя — гэта не што іншае, як загорнуты ў энтээраўскую амальгаму цынізм: «паспрабуйце знайсці мудраца, які чотка скажа, чым адрозніваецца жывое ад мёртвага». Здабыткі энтээраўскага часу абывацель імкнецца выкарыстаць для таго, каб выйсці з маральнага падполля і адкрыта арудаваць у спажывецкай сферы. Алмазавым зручна арудаваць тады, калі ў грамадства няма цвёрдай законнасці, калі ў людзей няма выразнага адчування мяжы паміж дабром і злом. Іх імпэт да разбурэння маральных устояў не слабее, ім трэба апраўдаць свой цынізм і рэнегацтва. «Мы спяшаемся, сумуем ці радуемся часцей за ўсё таму, што ўвесь час адчуваем гэту жахлівую мяжу смерці», — пераймае ў Рамана Барысавіча эстафету Віталя. Гэты малады інжынер свядома выкараніў з сябе ўсё, што нагадвала «дзярэўню». Найбольш яму перашкаджала ў горадзе працоўная сялянская мараль. Яна скоўвала знутры. Шкада, што В. Гігевіч не паказаў таго асяроддзя, маральны нігілізм якога Віталя ўзяў сабе ў якасці эталона. Сучасны абывацель налаўчыўся мець выгады не толькі з сучаснай тэхнікі. Яму патрэбен яшчэ і маральны камфорт — філасофскае, так сказаць, апраўданне эмацыянальнага анархізму, паталогіі спажывецкага гону. В. Гігевіч добра бачыць, што ўсе разважанні абывацеля зводзяцца да ваяўнічага нігілізму, апраўдання ўседазволенасці.

Быў час, калі абывацель апраўдваў свой цынізм кароткасцю і прывіднасцю чалавечага існавання. Цяпер ён ідзе адваротным шляхам — здымае пагрозу смерці. Але якою б дарогаю абывацель ні пайшоў, ён прыходзіць да таго, з чаго пачынаў, — патрабуе малітоўных адносін да яго паталагічных прыхамацей: «Спяшацца нікуды не спатрэбіцца, суму не будзе, а не будзе суму — не будзе і радасці. Не будзе смерці — адразу ж знікне літаратура, мастацтва, бо самі па сабе знікнуць гэтыя пытанні, за якія ва ўсе вякі трымаецца мастацтва. Як тапелец за саломінку. Увогуле, як мне здаецца, жыццё страціць свой сэнс. Ці будзе пабудавана на зусім іншых законах, а на якіх — мы зараз і ўявіць не можам...»

Тут былы вясковец — а сёння абывацель — зусім блізка падышоў да носьбітаў «тэорыі» антыкультуры. Віталя нават зусім не супраць той свабоды, якую прапагандуюць адэпты «сексуальнай» рэвалюцыі. На практыцы ж гэта азначае адно: у свеце з яго неакрэсленай будучыняй «беднаму сучаснику нічога не застаецца, як хапаць аберуч усё, што зможаш». Так выглядае ў рамане «Доказ ад процілеглага» адна з тэндэнцый рассяляньвання — тэндэнцыя абмяшчаньвання.

Нават у сценах невялікай майстэрні ці лабараторыі яна прыносіць вялікую шкоду. Сучасны мешчанін імкнецца выйсці на свет, пераканаць даверлівых і працавітых прасцячкоў, што ў эпоху «касмічнага мыслення», перасадкі органаў і генной інжынерыі нібыта аджылі свой век даэнтээраўскія духоўныя каштоўнасці, што сёння жыццё — усяго толькі лёгкая гульня, прыемны сон, у якім нічога не трэба ўспрымаць усур'ёз і, галоўнае, не трэба прад'яўляць ніякіх сур'ёзных патрабаванняў да Рамана Барысавіча і Віталі.

В. Гігевіч звычайна паказвае чалавека ў цеснай сувязі з тым ці іншым сацыяльным арганізмам як непадзельным цэлым. Такім цэлым можа быць вёска Жыціва, раённы горад Бярозава, прыгарадны аўтобус, цэх, лабараторыя.

В. Гігевіч не захапляецца фантастыкай. Пафас яго рамана скіраваны супраць рэальна існуючай летаргіі духоўнага жыцця, супраць сурагатаў, якія фальсіфікуюць прыроду духоўных запатрабаванняў, супраць культурнай экспансіі сучаснага імперыялізму з яго жорсткімі гульнямі ў дачыненні да чалавечага жыцця і свядомасці. У сучаснай беларускай прозе бадай што няма твора, у якім бы з такой сілай грамадзянскага пафасу выкрывалася антыгуманная сутнасць буржуазнай «масавай культуры», як гэта зроблена ў рамане «Доказ ад процілеглага». Героі рамана — Алег, Макрыцкі — людзі першага пасляваеннага пакалення. У іх свядомасці жыве пафас цяжкіх, але шчаслівых гадоў аднаўлення разбуранага вайною жыцця, і таму яны не могуць лічыць за культуру бесчалавечныя гульні ў кіно, калі забойства на экране «прыгожа, эстэтычна аформлена, і адмысловая музыка, і колеры адпаведна падабраны — чырвоны з блакітным, ці наадварот, і рытмічная, пад музыку змена ракурсаў, перабіўка кадраў, як быццам смерць чалавека — яшчэ адна новая пацешная гульня».

Неабходнасць актыўнай барацьбы ўсведамляецца героямі рамана не адразу. Звычайныя людзі, яны маюць не аднолькавы сацыяльны вопыт. У сувязі з гэтым іх вартасныя арыентацыі таксама не аднолькавыя. Сярод герояў рамана ёсць людзі, стомленыя працай і бытавымі клопатамі, схільныя да хірамантыі і іншых форм містыкі, аглушаныя сучаснай эстрадай. Ёсць і такія, што свядома шукаюць самазабыцця, сну — «хмельнай лёгкасці» ў выпадковых сустрэчах, турысцкіх паходах, «грандыёзных раманах», кінабаевіках. «Малюнкі людскіх адчуванняў» — так некалі К. Чорны назваў цыкл сваіх псіхалагічных апавяданняў. Гэтак жа можна

(Заканчэнне. Пачатак у № 30).

(Заканчэнне на стар. 6—7).

КНІГАПІС

Р. БАРАДУЛІН. Выбранае. Вершы. Паэмы. 1955—1983. На рускай мове. М., «Художественная литература», 1985.

Гэта кніга выбранай лірыкі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі складаецца з лепшых твораў, якія выйшлі з-пад пяра паэта на працягу амаль 30-і гадоў яго творчасці.

Як піша ў сваёй прадмове да кнігі І. Драч, «...калі хочаш акунуцца ў глыбіні беларускай мовы, адчуць марозную сілу таемных крыніц яе, парадавацца яе сакавітасці і непаўторнасці, міжволі звяртаешся да Рыгора Барадуліна».

Вершы паэта адлюстроўваюць шырокае кола жыццёвых з'яў. Піша ён і пра Енісей, і пра Літву, і пра Поўнач, Далёкі Усход, пра Балгарыю і Кубу. Самыя шчырыя вершы напісаны ім пра Маці-Беларусь, партызанскую Віцебшчыну, маладосць сваіх равеснікаў.

Творы паэта на рускую мову пераклалі Я. Хелемскі, І. Шклярэўскі, І. Бурсаў, І. Фанякоў, Н. Кіслік, Ф. Яфімаў, А. Дракахруст, Д. Сімановіч, Р. Куранёў, В. Тарас і іншыя.

В. УЛАДЗІМІРАВА.

С. ЗАКОННІКАЎ. Устань раней за сонца. Вершы. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1985.

Зборнік «Устань раней за сонца» — не першая кніжная публікацыя Сяргея Законнікава на рускай мове, але асобнай кнігай саюзнаму чытачу ён прадстаўлены ўпершыню.

Вершы беларускага паэта на рускую мову пераклалі Якаў Хелемскі, Навум Кіслік, Пётр Кошаль, Браніслаў Спрынчан, Валянцін Тарас, Ігар Шклярэўскі і іншыя.

К. РАСІНСКІ.

ЛІРЫЧНЫ ДЗЁННІК ПАЭТА

«КРУГІ НАДЗЕІ» — так назваў сваю новую кнігу вершаў Сяргей Грахоўскі. Гэта, як сказана ў анатацыі, своеасаблівы лірычны дзённік паэта, які складаецца з вершаў, напісаных у апошнія некалькі год. Гэта, відаць, тое, чым ён жыў, аб чым трывожыўся і клапаціўся, пра што думаў, запрашаючы ў сведкі і субяседнікі «думнае веча» пражытых гадоў. Сяргею Грахоўскаму, які выступіў з першымі творамі яшчэ ў 20-ыя гады, вядома, ёсць пра што расказаць — ён з пакалення тых, чый гістарычны вопыт вялікі, яскравы і павучальны. Радкі паэта, на якія ён мае права, гучаць узнёсла і праўдзіва, хоць і залішне агульна:

Мы зведалі шчасця нямнога
У горкі і праведны час
І зорную нашу дарогу
Касцямі масцілі для вас.

Так, гэта была дарога да зор. Яна патрабавала ідэйнай загартоўкі, вялікай самааддачы, мужнасці і гераізму. Але вяла, як паказаў час, не да збяднення душы, не да чэрствасці, а да багацця чалавечнасці, шматграннасці і шматфарбнасці адчування і ўспрымання жыцця. Толькі любоў да жыцця магла падказаць паэту такія вось цудоўныя вобразы:

На рамонках туманныя росы
І гараць, і цвітуць, і дрыжаць,
Маладзік устае з-за бярозы,
Каб у полі пшаніцу дажаць...

З ранейшых кніг С. Грахоўскага добра помняцца вершы «Плынь» (1955), «Мама» (1957), «Прыгожыя рукі» (1959), «Баліць душа за кожнага калеку» (1962), «Калі ж ты вырасла?..» (1963), «Як я жыў без цябе?..» (1964), «Сейбіт» (1966), «Сляды на зямлі» (1971), «Падкова» (1975) і інш., якія хвалявалі і працягваюць хваляваць праўдай чалавечых пачуццяў і перажыванняў. Нямала такіх вершаў і ў новай кнізе паэта. Адзін з іх — «Развітанне», ён дае ўяўленне пра духоўны свет паэта, пра яго маральныя каштоўнасці.

Красуе поле. На світанні
Плыве, плыве зялёны дым...
Вось і настала развітанне
З сялом і з жытам маладым.

Не знаю, ці сюды вярнуся,
Ці завітаю зноў калі,
У пояс жыту пакланюся
І любай дзедаўскай зямлі,

Прыпомню даўнія аблогі,
Лужок з пахіленым стажком,
І растанцовыя дарогі,
І крыж з кужэльным фартушком.

Пайду сцяжынкаю тугою
Па затуманенай траве,
І ўсё навекі дарагое
І зноў у сэрцы ажыве.

Знешне — «па форме» — гэта даволі сціплы верш, аднак яму, на маю думку, нельга адмовіць у задушэўнасці інтанацыі, у шчырасці маральных і патрыятычных пачуццяў, якія складаюць яго змест. Змест гэтага верша і ўсёй кнігі «Кругі надзеі». Істотнейшыя ўласцівасці паэзіі С. Грахоўскага — патрыятызм, дабрата, чалавечнасць, разумнасць, пра якія так ці інакш ідзе размова ў многіх вершах: «Вечныя дзеці», «Працяг», «Ціхае ранне», «Купалле», «Гаспадары зямлі», «Спадчына», «У снежным полі» і інш. Сучасны чалавек, сцвярджае паэт, трымае руку на пульсе планеты і, хоча ён таго ці не, пастаянна адчувае яе напружаны рытм. Пачуццё адказнасці, маральны абавязак перад грамадствам, працавітасць, патрыятызм — вось тыя каштоўнасці, на думку аўтара, дзеля якіх варта жыць і працаваць.

С. Грахоўскага заўсёды хвалявала, якія «сляды» пакідае чалавек пасля сябе на зямлі. Маральная праблематыка вызначае змест зборніка.

Маю ўвагу спынілі такія прачулыя і даволі горкія словы: «Сваё вызначаем і месца, і крэда, і толькі не чуем, што гора ў суседа».

«Каб ведаць, што такое шчасце, патрэбна гору знаць цану», —сказана ў адным з вершаў, і гэта ўспрымаецца як абгрунтаваны вывад з усяго жыццёвага вопыту. Паэт дапамагае нам усвядоміць і захаваць у душы такія каштоўныя рысы чалавечага роду, як дабро, любоў, сумленнасць, спачуванне. Бясспрэчнага поспеху ён дамагаецца там, дзе маральная праблема «зазямляецца» на нейкай дэталі, падрабязнасці з пражытага, з таго, што засталося ў памяці. Хвалююць успаміны пра казённую целагрэйку, якая саграваала яго ў люты сібірскі мароз, і міласэрную сястру, якая дапамагала, чым магла, у цяжкі час (верш «Душагрэйка»).

А вось радкі пра, здавалася б, звычайны тэлефонны званок:

Дождж шуміць і шуміць па сцяне,
Вы мой сум і тугу разганіце,
І калі не забылі мяне,
Хоць апоўначы ўсё ж пазваніце.

Як шмат можа значыць гэты званок!

Па вершах паэта можна меркаваць аб своеасаблівасці яго стылю, мастацкім абліччы, аб больш і менш моцных гранях яго творчасці. У зборніку С. Грахоўскага «Кругі надзеі» ёсць сатырычны верш пра нейкага бойкага крытыка Забародава, які «знае безліч розных кодаў» і ўмее разгадаць «усе «шыфроўкі» ад Гусоўскага да Броўкі». Што рабіць, разгадка «сакрэтаў паэтычнай творчасці», тайны індывідуальнай своеасаблівасці мастака — абавязак крытыка. Індывідуальнасць якраз і праўляецца ў мастацкіх вобразах. Мастацкая вобразнасць — гэта і ёсць спецыфіка паэтычнага мыслення. У кнізе «Кругі надзеі» ёсць цікавая самахарактарыстыка аўтара. Ён піша:

Магчыма, часам і грашу
Тварэннем не метафарычным,
Не надта бойкім і не зычным,
Але ніколі не схлушу,
І, можа, нечую душу
Сагрэю хоць не надта новым,
Але сумленным, шчырым словам,
Такім, як МАЦІ, ПОЛЕ, СОНЦА,
Як чыстая вада ў палонцы,
Як ВЕСНЫ, ЛЕТА, ВОСЕНЬ, ЗІМЫ,
Як НЕБА нашае Радзімы...

Словы, вядома, добрыя, хоць самі па сабе яны яшчэ не гарантуюць ад паэтычнага «браку». Вялікую ролю мае тут іх эстэтычнае напаўненне.

Адзін з рускіх паэтаў назваў паэзію «чудовищно уплотненной реальностью», маючы на ўвазе тое, што сапраўднай паэзіі ўласціва духоўная напружанасць, якая праяўляе сябе ў мастацкім вобразе. Гэтай напружанасці С. Грахоўскаму, трэба зазначыць, у многіх выпадках не стае. У яго даволі шмат правільных, так сказаць, думак, радкоў, вершаў, аднак гэтая правільнасць не заўсёды падмацоўваецца арыгінальнасцю паэтычнага пошуку.

Не абміні чужой бяды,
Сабой не надта ганарыся...

Правільна? Абсалютна. Але ці мае гэта непасрэдныя адносіны да паэзіі? Не ўпэўнены.

Ці, скажам, такі прыклад:

Што не заўсёды сытна есца,
Не наракай, не галасі,
Не рвіся на чужое месца,
Чыноў высокіх не прасі,

Сваю дакладна ведай справу
І месца ўласнае трымай,
А незаслужанае славы
Не дамагайся, не прымай,

Не надта захапляйся бытам
І светлых не губляй надзей,
Жыві сумленна і адкрыта
Не для себя, а для людзей.

Таксама вельмі правільна, але не больш!

Здараецца, шкодзіць залішняя апісальнасць. Вазьміце неблагі ўвогуле верш «Ніколі», вось яго пачатак:

Аж заходзіцца сэрца ад шчасця,
Як убачу лугі, і лясы,
І гасцінцы, адкрытыя насцеж,
І ў палёх — каласы, каласы,

Курганы і крутыя ўзгоркі,
Студню, вочап з кляновым вядром,
Сінявaты, павольны і горкі
Ядлаўцовы дымок над кастром,

І бланіт задуменных азёраў,
І паводкі рачулак і рэк,
І спрадвек незабыўнае гора,
І здабытае шчасце навек...

На гэтым спынімся — такіх у вершы 32 радкі. Магло быць і болей: твор мае выразна апісальны характар. Мне здаецца, што для сучаснай паэзіі гэтага мала: апісальнасць успрымаецца як паўтарэнне пройдзенага.

Але разам з тым, падкрэсліваю, ёсць вершы (іх — нямала), якія хвалююць і ўражваюць. Сярод такіх я назваў бы «Гаспадары зямлі» і «Цыганскі матыў», хоць першы з іх залішне расцягнены.

Спадабаўся мне наступны лірычны верш:

Ад крыўды, што раніць да болю,
Адзіны ратунак знайду:
На золку ў жытнёвае поле
Па роснай сцяжынцы пайду.

Тут вечная праўда святая
Зямлі і натружаных рук,
І вольна над жытам лятае
І плача шчасліва жаўрук.

Добры верш!

Як бачым, у лепшых вершах паэта цікавіць не столькі апісанне з'яў навакольнага свету, колькі выяўленне духоўнага самааддачвання чалавека ў наш складаны, трывожны час.

І яшчэ. У лепшых вершах С. Грахоўскага ёсць выклік тым, хто хоча схавацца ад трывог і непрыемнасцей. Ці варта гаварыць, як гэта важна для паэзіі.

Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ.

С. Грахоўскі. Кругі надзеі. Кніга новых вершаў 1982—1984. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1985.

ЗА ЎСЁ Ў АДКАЗЕ, або Новыя матывы і пераемнасць традыцый

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

кваліфікаваць і «Доказ ад процілеглага. І калі далей ісці шляхам тыпалагічнага супастаўлення, дык нельга не заўважыць блізкасці «Доказу ад процілеглага» да рамана К. Чорнага «Сястра». У парываннях і пошуках інжынера Андрэя Разорчыка ёсць шмат агульнага з бунтамі ляснога таксатара Ваці Браніслаўца, яго пратэстам супраць духоўнай дыктатуры заўсёды «цвёрдага» Абрама Ватасона. Андрэй Разорчык, замучаны вытворчымі і хатнімі клопатамі, хваробай, уціскам вечнага «трэба», у сутычцы з Алмазавым застаецца непахісным. Яго зброя — духоўны вопыт бацькоў — салдатаў і сейбітаў. Разорчык класавым інстынктам працаўніка адчувае, што «тэорыя» Алмазава і Віталі — варожая тэорыя, бо «па-ягонаму выходзіць, што б ні тварылася сярод людзей, якое б паскудства ні вялося, але яно — патрэбнае, без яго дык і прагрэсу не будзе...».

«Тэорыя» Алмазава не толькі агідная, але яшчэ і ліпкая. Разорчык бачыць, што яна пранікае нават у яго сям'ю, шкодна ўплывае на жонку і дзяцей. Разорчыку цяжка разабрацца, адкуль плыве пошасць: занадта бедны ў яго сацыяльны вопыт, абмежаваны вытворчымі інтарэсамі ў лабараторыі, працай у падшэфным калгасе і бясконцымі бытавымі турботамі. У час навучання ў яго хапала часу толькі на чытанне тэхнічнай літаратуры. Тым не менш Разорчык застаецца надзейным і стойкім салдатам у эмаганні з мяшчанствам, ён прыроджаным класавым пачуццём адчувае варожую, разлагаючую сутнасць яго ідэалогіі.

В. Гігевіч падкрэслівае, аднак, што адной салдацкай мужнасці ў змаганні з сучасным мяшчанствам мала, тут патрэбны разумныя стратэгі і кіраўнікі. Калі паразітычная дзейнасць Алмазава носіць лакальны характар, то гэтага нельга сказаць пра яго паралізуючую грамадства «тэорыю» — катэхізіс сусветнага мяшчанства, якое дзеля сваіх шкурніцкіх мэт сёння гатова запусціць на поўную магутнасць індустрыю разбурэння. Пытанні «адкуль, навошта і чаму?» паўсталі перад лірычным героем В. Гігевіча яшчэ ў ранніх апавяданнях, як і перад героямі ранніх твораў М. Гарэцкага. Абысці гэтыя пытанні нельга. Пра гэта публіцыстычная лірыка П. Панчанкі папярэджвала яшчэ ў 60-я гады:

А па якой рацэ
Плыве к нам столькі пошасці?
Як мельнік у муцэ,
Свет у хлусні і пошласці.

Перш чым даць адказ на пытанне «адкуль?», В. Гігевіч паказвае разносчыкаў пошласці. Як правіла, гэта людзі спустошаныя. Большасць з іх перабраўшыся ў горад, вытруцілі ў сабе ўсё, што нагадвала «дзярэўню»: працавітасць, шчырасць, працоўную мараль.

Пра такіх былых вяскоўцаў справядліва сказана ў вершы П. Панчанкі «Хто вінаваты?». Адправіўшы маці «на вечны спакой» у дом састарэлых, сучасны абывацель у імя «прэстыжу» гатоў ахвяраваць і Радзімай:

А там і ад мовы сваёй
Адцураецца:
Родная мова не ў модзе —
Даволі той бульбы!
Бывай, журавінавы гай!
Крышталь. Дываны.
А дзеці ў англійскую ходзяць.
Прыстойна. Прэсціжна.
О'кэй і гуд бай!
А там адрачэцца
Ад нашай Савецкай Радзімы,
Бо сэрца ўжо прагне
Вітрынаў з раскошнай лухтой.
О, бедныя маці,
Нашто вы такіх нарадзілі?
І горкае рэха якога:
А хто вінаваты? А хто?

У рамане В. Гігевіча паказаны і маладзейшыя парасткі нігілізму — натоўп, пра які можна толькі сказаць, што ён у самазабыцці «пульсуе ў такт грымлівай музыцы». Самазабыццё і наркаманія — такі лагічны канец выраджэння сусветнага мешчаніна, вынік нігілізму і пагоні за асалодай. А пачынаецца ён з пагарды да свайго народа, яго працоўнай хлебаробскай маралі.

В. Гігевіч імкнецца ўбачыць тыя ці іншыя тэндэнцыі ў перспектыве іх развіцця, шукае сродкаў і спосабаў шырокага абагульнення, якія надаюць твору дакладную ідэйна-палітычную накіраванасць, канчаткова аформленую ў раздзеле «Сон Разорчыка». Не памылімся, калі скажам, што раман «Доказ ад процілеглага» можна аднесці да твораў, якія выкрываюць культурную экспансію сучаснага імперыялізму. Да намаляванай празаікам карціны можна аднесці словы галоўнага героя з рамана «Гульня» Ю. Бондарава: «І ведаеш, што страшнавата? Амерыканскае невуцтва і шаленства грошай сталі непераможнымі заканадаўцамі мод, і адбылася дэградацыя сусветнага густу». Лозунгі, з дапамогай якіх у «Сне Разорчыка» адміністратары заклікаюць да ўседазволенай насалоды і наркаманіі, нагадваюць тыя максімы, якія Разорчык наяву чуў ад Алмазава. Розніца ў тым, што ў «замежным раі» яны ўжо набылі правы грамадзянства, сталі амерыканізмамі, якімі ўмела спакушае аматараў самазабыцця выпушчаны ў патрэбнай колькасці экземпля-

«БЕЛАРУСЬ» У 1986 ГОДЗЕ

З падпісных выданняў пабачаць свет першыя тамы «Выбраных твораў» У. І. Леніна, якія выходзяць на беларускай мове ў дзесяці тамах, а таксама чацвёрты том зборніка дакументаў «Камуністычная партыя Беларусі ў рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў і пленумаў ЦК». На беларускай мове асобнай брашурай выходзіць работа Ф. Энгельса «Роля працы ў працэсе ператварэння малпы ў чалавека» і зборнік «Аб моладзі» У. І. Леніна, у які ўключаны цалкам або ва ўрыўках творы, прамовы, артыкулы і пісьмы правадыра, якія тычацца выхавання і адукацыі моладзі, яе ролі ў класавай барацьбе і будаўніцтве новага грамадства.

Сярод іншых выданняў — кнігі Ф. Баравіка «Грамадства сацыяльнай справядлівасці», А. Самаля «Курс на ўдасканаленне развітога сацыялізму», А. Круглова «Развіццё навуковага атэізму ў Беларусі (1917—1985 гг.)» і іншыя.

Новымі зборнікамі папоўніцца серыя «Імперыялізм — вораг чалавецтва» — «Пастка» І. Асінскага і навукова-папулярная кніга «Сучаснасць і правы чалавека». У серыі «СССР—братэрства народаў» выходзіць кніга А. Капусціна «Радзіма — любоў наша вечная», у якой аўтар на шматлікіх прыкладах паказвае, як савецкія людзі ў любых абставінах застаюцца вернымі сваёй Радзіме, справе партыі.

Будзе прадоўжаны выпуск зборнікаў мемуарнага характару: І. Друян «Клятву стрымалі», Д. Войстраў «У горацкім рэдкалегіі», А. Караткевіч «Абеліск ля дарогі» і шэраг іншых. Выйдзе трэцяя, заключная кніга з серыі «Партыйнае падполле ў Беларусі. 1941—1944», у якой змяшчаюцца ўспаміны кіраўнікоў партыйных падпольных камітэтаў. На гэты раз будзе расказана пра зараджэнне і дзейнасць падполля на тэрыторыі Пінскай, Брэсцкай, Баранавіцкай, Вілейскай і Беластоцкай абласцей.

Цікавымі маюць быць кнігі «У агні грамадзянскай вайны», у якую ўвойдуць успаміны былых камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі, а таксама партызан і падпольшчыкаў і нарысы журналістаў пра вядомых савецкіх военачальнікаў, што нарадзіліся на Беларусі. «Першыя залпы на граніцы» М. Плотнікава — нарысы пра тых, хто ў чэрвені—пачатку ліпеня сорак першага года абараняў рубяжы Радзімы, «Ні мінуты спакою» Р. Аўраменкі — пра справы работнікаў міліцыі, іншых праваахоўных органаў.

Шэраг выданняў пазначаны ў раздзеле «Культурна-асветная работа». Брашурай М. Агароднікава «Культурна-шэфская работа» папоўніцца «Бібліятэчна клубнага работніка». А. Каплін у кнізе «Сацыяльна-культурны комплекс сяла» расказвае пра ролю гэтых устаноў у арганізацыі адпачынку працоўных, раскрывае іх уплыў на грамадскую і працоўную актыўнасць сельскага насельніцтва. «Самадзейная мастацкая творчасць як фактар камуністычнага выхавання працоўных» — тэма кнігі А. Русецкага. На прапагандыстаў, работнікаў устаноў культуры і бытавога абслугоўвання насельніцтва разлічаны калектыўны зборнік «Сучасныя сямейна-бытавыя абрады ў Беларусі».

У кнігу «Беларуская кніга: гісторыя і сучаснасць» увойдуць артыкулы па гісторыі кнігадрукавання, распаўсюджання кнігі ў Беларусі, пра лёс асобных выданняў, дзейнасць бібліятэк і арганізацый Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі рэспублікі.

«Гармонія дуэта» — так называецца кніга-альбом Т. Мушынскай, якая знаёміць з творчым шляхам вядучых артыстаў балета рэспублікі, народных артыстаў БССР Л. Бржазоўскай і Ю. Траяна. Расказваецца пра іх шматгранную мастакоўскую дзейнасць, гаворыцца пра выступленні ў час гастроляў не толькі за межамі Беларусі, але і краіны.

Аматарам мастацтва прапануецца і некалькі новых альбомаў. Адзін з іх — «Памяць зямлі беларускай»—мовай каляровых здымкаў раскажа пра гістарычныя і культурныя помнікі, а таксама помнікі прыроды і архітэктуры. Другі — «Дзяржаўны музей БССР» — пазнаёміць з экспазіцыяй гэтага музея, яго найбольш цікавымі матэрыяламі. Выйдзе ілюстраваны даведнік «Архітэктары Савецкай Беларусі». Пра творчасць беларускіх мастакоў тэатра, кіно і тэлебачання раскажа альбом «Мастацтва беларускіх дэкаратараў».

Творчасці члена-карэспандэнта Акадэміі мастацтваў СССР, народнага мастака БССР Я. Зайцава, яго шматграннай творчай дзейнасці, што праяўляецца ў галіне сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, прысвечаны альбом-нарыс Ю. Карачуна. Асобнымі выданнямі выйдуць і творчыя партрэты «Уладзімір Пасюкевіч» В. Буйвала, «Мікалай Казакевіч» Л. Салавей, «Абрам Кроль» А. Сурскага.

«Васіль Быкаў» — чарговы альбом з серыі, якая расказвае пра творчасць вядомых пісьменнікаў. Аўтар тэксту А. Адамсвіч, выкарыстаны шматлікі ілюстрацыйны матэрыял.

Багаты раздзел «Музычная літаратура». У зборнік Л. Захлеўнага «Усё гэта ты — Перамога!» увойдуць найбольш папулярныя песні кампазітара, якія прагучалі ў тэлевізійных перадачах і радыёпастаноўках. «Будзь абавязку варты»—зборнік твораў другога вядомага беларускага кампазітара В. Іванова. Асобным выданнем выходзяць песні, напісаныя беларускімі кампазітарамі на словы старэйшага паэта А. Русака — «Песні радасці». Аматарам мастацкай самадзейнасці, у першую чаргу тым, хто жыве ў вёсцы, адрасуецца зборнік «Клубныя вечары», вучням — «Школьныя гады».

У зборніку Г. Цітовіча «Добры вечар» змешчаны апрацоўкі беларускіх народных песень для хораў, якія зроблены вядомым фалькларыстам-хормайстрам, народным артыстам СССР.

Араторыя-сюіта Г. Вагнера «Зоркі Кастрычніка» напісана на словы А. Вольскага, прысвечана тэме Кастрычніцкай рэвалюцыі і разлічана для дзіцячага хору.

«Поры года» — своеасаблівая музычна-паэтычная кампазіцыя, складзеная З. Мажэйка на матэрыяле беларускага народна-песеннага фальклору.

М. ГЕЛЬСКІ.

ПРА МУЖНАСЦЬ ЮНЫХ

Як вядома, у гады Вялікай Айчыннай вайны поруч з дарослымі з фашызмам мужна змагаліся і дзеці. Тым з іх, хто праявіў асаблівы гераізм, прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза, тысячы юных барацьбітоў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пра іх— партызан і падпольшчыкаў, сыноў палкоў расказваецца ў шматлікіх кнігах, створаных на дакументальным матэрыяле. Паасобныя з іх выходзілі і ў нашай рэспубліцы, найперш у выдавецтвах «Народная асвета» і «Юнацтва». Сярод іх і зборнік нарысаў і апавяданняў «Дзеці-героі».

Улічваючы вялікае выхаваўчае значэнне гэтай кнігі, Дзяржаўны камітэт БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю вырашыў апублікаваць яе на замежных мовах па заказах «Міжнароднай кнігі». Зборнік «Дзеці-героі» выйшаў ужо на іспанскай мове, прытым выпушчаны два варыянты. Першы з іх адрасаваны юным кубінскім чытачам. Да кнігі спецыяльную прадмову напісаў Фідэль Кастра. Аўтар другога ўступнага артыкула — Герой Савецкага Саюза, праслаўлены партызанскі камандзір, вядомы партыйны і дзяржаўны дзеяч У. Е. Лабанок. Яшчэ адзін варыянт зборніка «Дзеці-героі» выпушчаны па заказе выдавецтва «Нікарагуа».

Гэтыя выпускі кнігі падрыхтаваны выдавецтвам «Юнацтва», якое ў нашай рэспубліцы з'яўляецца галоўным пастаўшчыком літаратуры на замежных мовах. Выйшла таксама шэраг іншых кніг. Сярод іх творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Васіля Быкава і іншых вядомых пісьменнікаў, беларускія народныя казкі.

В. ЗАХАРАЎ.

РЭПЛІКА

РЭЦЭНЗІІ ПАД КАПІРКУ

У пошуках патрэбных матэрыялаў давялося перагортваць старонкі раённых газет. Барацьба за ўраджай, за павышэнне прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных, праца ўстаноў, арганізацый, пытанні культуры, водгукі на кнігі землякоў або на кнігі, у якіх закранаюцца нейкія бакі жыцця раёна, — звычайныя тэмы гэтых газет.

Кінуліся ў вочы рэцэнзіі, падпісаныя адным і тым самым прозвішчам. Па некалькі за месяц у розных газетах. Ці не загуста? Але не толькі гэта. Пачытаем.

«Святло Кастрычніка» (Мсціслаў), 12 ліпеня 1984г.: «Кожны раз, едучы па дарогах Мсціслаўшчыны, засяроджваеш свой погляд на шыльдах з назвамі блізкіх населеных пунктаў. Нічым, здаецца, не вызначаючыяся назвы...»

«Запаветы Леніна» (Асіповічы), 2 жніўня 1984 г.: «Кожны раз, едучы па дарогах Асіповіцкага раёна, міжволі засяроджваю ўвагу на шыльдах з назвай таго ці іншага населенага пункта. Звычайная на першы погляд назва...»

«Новае жыццё» (Клімавічы), 2 жніўня 1984 г.: «Кожны раз, едучы па дарогах Клімаўшчыны, міжволі засяроджваеш увагу на шыльдах з назвамі таго ці іншага населенага пункта. На першы погляд назвы звычайныя...»

«Зара камунізму» (Бялынічы): «Кожны раз...»

«Трыбуна працы» (Бабруйск): «Кожны раз...»

«Сцяг Радзімы» (Глуск): «Кожны раз...»

Клічаў... Любань... Бяроза...

Як можна прыкмеціць, не зусім пад капірку. Есць і адрозненні. У асіповіцкай газеце «засяроджваю», а ў іншых «засяроджваеш». Калі ў ліпені ў мсціслаўскую прапанавана «не вызначаючыяся», то ў жнівеньскіх нумарах непісьменнасць апушчана і сказ істотна спрошчаны. Месцамі мяняецца парадак слоў, лік назоўніка «назва».

І гэтак з адной газеты ў другую.

А далей падаецца матэрыял, які мае непасрэдныя адносіны да канкрэтнага раёна. Таксама па досыць простай схеме: час утварэння раёна, адлегласць ад больш буйных адміністрацыйных цэнтраў, колькасць населеных пунктаў, калгасаў, сайгасаў.

Так рэцэнзуюцца складзеныя Я. Рапановічам слоўнікі населеных пунктаў Магілёўшчыны, а таксама іншых абласцей.

Не вельмі турбуецца аўтар пра разнастайнасць загалоўкаў сваіх тварэнняў. «Карысны даведнік» у бялыніцкай, касцюковіцкай і дзятлаўскай газетах, «Цікавы даведнік» — у быхаўскай, «Цікавая, патрэбная кніга» — ў асіповіцкай і г. д. Аўтар, відаць, разважае досыць проста: газету аднаго раёна ў другім не чытаюць, маўляў, у раёнцы сыдзе і на такім, капірачным, узроўні. Але ж такі метад публікавання называюць звычайнай халтурай.

Праўда, іншы раз робяцца спробы даць ацэнку слоўнікам у цэлым, рэкамендаваць іх афіцыйным арганізацыям і ўстановам. Але такія рэкамендацыі трэба даваць з аглядкай, бо слоўнікі Я. Рапановіча не пазбайлены істотных памылак.

Дык хто ж паточным метадам пастаўляе рэцэнзіі ў раённыя газеты рэспублікі? Гэта К. Карнялюк, студэнт Гродзенскага універсітэта. Вельмі прыкра, што студэнт, чалавек на пачатку сталага жыцця, стаў на коўзкі і непрыгожы шлях халтуры. Выкажам надзею, што гэтыя заўвагі будуць яму сур'ёзным папярэджаннем і ўрокам.

Георгій ЮРЧАНКА.

раў адміністратар — сучасны Мефістофель. Як вядома, у трагедыі Гётэ гэты «дух, што адмаўляе вечна», не саромеецца паставіць знак роўнасці паміж жыццём і смерцю:

І маю рацыю, бо ўсё жывое ў свеце
Ператвараецца ў смецце,
То лепш няхай яго б і не было.
А што для вас — грахі ліхія,
Знішчэнне, страта, проста зло —
Ёсць родная мая стыхія.
(Пераклад В. Сёмухі).

Мефістофель спакушае Фаўста поўнай свабодай ад смутку, ад абавязку перад народам:

Даволі нянчыцца з сваёй журбою,
Што каршуном твае вантробы рве;
Адкрыта ўсё перад табою,
Цябе Наступнае заве,
Табе цяпер з быдлячым збродам,
Што называецца народам,
Дзяліць няма чаго зусім!

«Асалода тая зацьміць памяць і пра блізкіх, пра бацькоў, пра тое, што называюць радзімай, мараллю, этыкай»,—спакушае выгодамі кантракту адміністратар у рамане В. Гігевіча. Ён у фірменным цёмна-блакітным касцюме, з «матыльком» замест гальштука, але гэта таксама «хаосу выпладак лядачы».

У народных казках чэрці лёгка ператвараюцца ў выкшталцоных панічоў. Маску з носьбітаў вечнага хаосу зрывае часцей за ўсё Музыка-чарадзей. У рамане В. Гігевіча гэту місію выконвае вясковы дзядзька — «у ботах, у вайсковым галіфэ і гімнасцёрцы». Чалавек у форме, зручнай для бою і працы, без лішніх кішэняў. У гэтай форме ён прыйшоў з фронту. У руках дзядзька трымае «плеценыя лазовыя карзіны». Відаць, што гэта салдат і сейбіт. Яго вобраз стаіць як бы на грані перарастання ў легендарны ці казачны. Падобнай тэндэнцыяй прасякнуты і вобразы пажылых калгасніц і калгаснікаў у «Асенніх халадах», «Халоднай птушцы» і «Паляванні на апошняга жураўля» Алеся Жука — творах баладнага гучання.

Салдат і сейбіт у рамане В. Гігевіча «гучна, не саромеючыся, пытаўся неяк адразу ва ўсіх:

— Дык дзе тут тая ісціна?»

У падобным на універмаг раі за ісціну выдаецца асалода — сеансы самазабыцця з імітацыяй радасці і кахання. З пункту гледжання вясковага мужчыны ў салдацкай форме гэта не што іншае, як распуста: «І за што, спытаць, галовы некалі лажылі?»

Праблема заключаецца ў тым, што сёння, ва ўмовах мірнага часу, супраць носьбітаў хаосу нельга ваяваць тымі ж сродкамі, якія былі на ўзбраенні ў салдат на фронце. Узорам грамадзянскай прынцыповасці для пісьменніка з'яўляецца салдат, які, кажучы словамі А. Куляшова, гнаў хаос і смерць «з нары ў нару трацілаваю пугай перамогі».

Наш сучаснік, на думку пісьменніка, яшчэ не знайшоў сябе ў барацьбе супраць хаосу і пошласці. І папрок гэты звернуты перш за ўсё да інтэлігенцыі, якая непасрэдна займаецца духоўнымі праблемамі. «Мы ўсё крытыкуем, — гаворыць у рамане адзін з сур'ёзных работнікаў кіно, — мы навучыліся рэальна і занадта практычна глядзець на жыццё і таму амаль ва ўсіх сітуацыях ведаем, дзе наб'ём шышкі, а дзе — нас пагладзяць па галоўцы. Мы многім на свеце незадаволены, але што мы робім? Ні-чо-га. Вось яна, горкая рэальнасць».

Дзеячы кіно і сапраўды маглі б зрабіць нешта больш істотнае для таго, каб засцерагчы няўстойлівыя душы ад разбуральнага ўплыву нігілізму, культурнай экспансіі з боку сусветнага мешчаніна. Такі ж папрок можна адрасаваць і работнікам іншых галін культуры і асветы, бо не ўся яшчэ школьная, студэнцкая і рабочая моладзь валодае імунітэтам супраць амерыканізмаў. Інтэлігенцыі належаць вялікія заслугі ў пераўтварэнні навукі ў прадукцыйную сілу, але вучоныя і філосафы сёння ўсё часцей гавораць аб тым, што чалавек з'яўляецца самым складаным звяном у сучаснай звышдакладнай тэхналогіі. Чалавечую праблему нельга абысці ў вырашэнні вытворчых праблем. І пра гэта сказана ў матэрыялах красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС. А наша галоўная мэта — удасканаленне і ўсебаковае развіццё чалавека. Інтэлігенцыя не можа застацца ў баку ад вырашэння гэтай задачы.

Сёння адказнасць павінна быць асэнсавана на новым узроўні. Шырока вядомымі сталі радкі А. Твардоўскага:

Я знаю, никакой моей вины
В том, что другие не пришли с войны,
В том, что они — кто старше, кто моложе —
Остались там, и не о том же речь,
Что я их мог, но не сумел сберечь, —
Речь не о том, но всё же, всё же, всё же...

Гэтае «всё же, всё же, всё же» ўжо жыве ў падтэксце паэмы Петруся Броўкі «Голас сэрца», у «Маналогу» Аркадзя Куляшова, вершах і паэмах Кастуся Кірэенкі. «Я перад вамі вечна вінаваты, усе, каму нялёгка у жыцці», — бярэ на сябе адказнасць за ход гісторыі лірычны герой П. Панчанкі. У «Варшаўскім шляху» А. Куляшова ёсць радкі, якія можна лічыць праграмнымі для кожнага літаратара:

Хай ісціны старэюць з году ў год,
Хай сэрца разрывае гук жалезны,
А ты за ўсё ў адказе, мой балесны,
За справу, за дзяржаву, за народ.

«І ўсё ж трэба было намагчыся, каб выжыць і — галоўнае — перамагчы, бо пагібель часам была як здрада жывым», — гэтыя словы з «Трох абзацаў аўтабіяграфіі» Васіля Быкава можна лічыць дэвізам да яго ваенных аповесцей. Ці заўсёды чалавек мірнага часу ў сучаснай прозе жыве менавіта ў такім грамадзянскім вымярэнні? Не заўсёды, на жаль. Настальгія па вёсцы, замілаванне «вяртаннем да вытокаў» часам засланяюць галоўны прадмет ўвагі. Раман В. Гігевіча «Доказ ад процілеглага» адносіцца да ліку тых значных твораў, у якіх бескампрамісна ставіцца пытанне аб грамадзянскай адказнасці сучасніка «за справу, за дзяржаву, за народ». Гэта яшчэ адно сведчанне поспехаў прозы, непадуладнай штучным нарматыўным патрабаванням, арганічна звязанай з лепшымі гуманістычнымі традыцыямі нашай класікі.

МАЎКЛІВЫ МАНАЛОГ

Памяці народнага майстра Апалінарыя ПУПКО



Уладзімір АРЛОЎ

АПАВЯДАННЕ

АЧХІ! Ачхі! Выбачайце, шаноўныя. Ачхі! Вось так і ачынаешся кожнае раніцы. Каб ён пражыўся ў апраметнай з самымі зацятымі грэшнікамі! Гэта я пра катар! Ачхі! У якім жа гэта годзе прыстаў ён да мяне, не раўнуючы як доказная інквізіцыя да бязвіннае душы! Ачхі! Праклятая чохаўка вытрасла з маёй гарапашнай галавы, нібы зернейкі відуку, усе дарэшты даты. Затое, дзякаваць богу, у якога я не верую з адна тысяча шэсцьсот задаўненага года, усё астатняе ў памяці трымаецца, быццам дзеялася не даўней мінулай нядзелі.

Вось, як учора было, бачу праявы таго злашчаснага лета, калі ў наваколлі трывала гэткая сухмень, што ўвачавідкі жоўклі зялёныя сенажаці, і пачыналі ўжо людцы паспалітыя загадваць, ці не давядзецца сёлета разгаўляцца грэшным чынам катамі ды кашчавымі сабакамі і прычыніўся той парою ў нашым касцёле нечуваны цуд. Аднойчы, прычакаўшы, пакуль арганіста ўзяў першы акорд і хор утрапёна зацягнуў «Ave maria!», заступніца наша маці боская заплакала ў сваім алтары буйнымі, як боб, слязамі. Не дзіва, што падхапіў я тады пякельны катар. Цэлы месяц ні на хвілю не зачыняліся касцельныя дзверы, і скавышоў у храме было не меней, чымся грахоў у нашага айца Геранімуса, які нават боскую маці давёў да слёз. Ой ведаю я, адкуль былі тыя слёзы.

Дале, скажу вам, шаноўныя, прачуўшы аб наскіх дзівосах ды нагледзеўшыся на збоі вернікаў, што цягнуліся да нас, не стрываў, пусціў слязіну Мікола-ўгоднік з праваслаўнай царквы, якая касавурылася на касцёл цераз пляц. А там ва ўніяцкім храме Звеставання, што каля торжышча, пачалі прамаўляць пад час ютрані прарокі Захарыя ды Ісайя, і ўсё, кажуць, найчасцей гугнявым голасам бажавольнага Баўтрамея, што жыў за ярам у звярыным мерлагу.

Ведама ж, дакацілася пагудка пра небывалыя падзеі куды след, і разоў тры ніштавата прычасціў сухую, як порах, зямельку дождж. А потым жыхары знакамітага нашага места ды сяляне паблізных вёсак і зусім паарлелі, убачыўшы, як папаўзлі з замкавай брамы вазы з соллю і княскія людзі сажань за сажнем сталі густа прысольваць брукаванку ўсцяж возера, паўз фару і да самага віленскага тракту. Зноў заманулася яснавяльможнаму валадару праехацца ўлетку на санках, прамчаць новую каханку на мядзведжай запрэжцы. А людцам паспалітым таксама ўсцеха — да трэцяга калена сабранае солі стане.

Ачхі! Вы ўжо даруйце, шаноўныя, трэба начхацца ў запас, бо дзе гэта вы бачылі святога Пётру, які чхае на музейных наведнікаў?

Ну так, цяпер я экспанат. Але, калі хтосьці з вас скажа: «Sic transt gloria mundi»* я запярэчу. Хіба рацыя наракаць мне на свой лёс? Было нас шасцёра братоў, а застаўся на свеце адно я. А ці не паважны век без малога чатыраста гадоў, пражытыя ў гэтых барочных мурах, што памятаюць ядры суседскага цара, шведскага караля і французскага імператара ды град нялічаных нямецкіх асколкаў?

Часам я шкадую, што ў мяне драўлянае сэрца, а часам радуюся з тае самае прычыны, бо інакш яно не вытрывала б усяго, што мне выпала пабачыць. Але, відаць, яно не зусім драўлянае, бо такімі вось чыстымі вясновымі ранкамі, калі маладыя сонечныя промні запальваюць пазалоту капітэляў і гзымсаў, а на белыя сцены шматкалёрна кладуцца цёплыя водсветы вітражоў, я адчуваю, як маё сэрца прачынаецца і дзесьці там, у душы, нараджаецца ціхая музыка...

Ачхі! О жудлівае насланнё Люцыпара! Ачхі! Усё, апошні раз, бо вунь ужо ідзе Алена, як звычай усмешлівая, лёгкая і пекная, што той анёлак.

Яна, навуковая супрацоўніца, стагоддзі на тры з паловаю маладзейшая за мяне, аднак у яе галоўцы з дробненькімі залацістымі кудзеркамі хаваецца гэтулькі імёнаў, падзей і, галоўнае, датаў, што нават я крышачку зайздрошчу ёй. Праўда, калі чытаеш пра ўчыненую ворагамі разню і калі на ўласныя вочы бачыш, як плыве цераз храм чырвонае ручво і ў ім кешкаецца немаўля — гэта, прысягаю светлай памяццю майго бацькі, зусім розныя рэчы. Ды лепей, шаноўныя, замест жудлівых прыгодаў, пакуль Алена з экскурсіяй падыдзе бліжэй, намалюю я вам свой партрэт.

У мяне грубаваты, але мужны і нават пагляднны твар з шырока пасаджанымі вачыма. Вятрыска жыццёвых нягодаў ваяўніча ўскудлаціў мае густыя валасы і бараду. На дужых рамёнах — вольная апанча. Ці трэба дадаваць, што трымаюся я з годнасцю? Тым больш, у маіх каструбаватых руках звыклага да працы чалавека не абы-што, а ключ ад райскае брамы.

Вам цікава, адкуль музейны экспанат гэтак дасканала ведае сваё аблічча, быццам штодня круціцца каля люстра, усё роўна як дзяўчына на выданні? А летась пашчасціла і мне глянуць у люстэрка, калі тыдні з два вылежваўся на стале ў рэстаўратараў, што няблага падлячылі мае старэчыя хваробы. Апроч, вядома, чохаўкі, а прызнацца ў ёй перашкодзіла мая прыродная сціпласць.

— Перад вамі драўляная скульптура святога Пётры, — цурчыць Аленін галасок. — На жаль, гісторыя не захавала выдатнага майстра...

Антось яго звалі, майго бацьку, чалавека, што выпусціў мяне на свет з невідушчага і глухога дубовага кругляка.

Ён быў каржакаваты, з цёмна-русымі даўгімі валасамі і рахманымі сінімі вачыма. У абліччы гэтага ціхмянага чалавека не было нічога нязвычнага, але калі б Творца дапраўды існаваў, дык Антось быў бы вельмі падобны да яго. З каляных і пяшчотных Антосевых далоняў выпырхвалі драўляныя жаўрукі, ільвы на падлокніцах крэслаў, не паспеўшы нарадзіцца, хапалі зубамі разец, а па мядзведзю, якога мой бацька выштукаваў у паляўнічай зале, аднойчы пекануў з рушніцы зляканы княскі госць. Але то былі нявінныя забаўкі, бо Антось не проста штукарыў, а ва ўсім вялікім наваколлі аздабляў храмы, і я на свае вушы чуў, як варшаўскі прыяцель нашага валадара аддаваў за бацьку табун арабскіх скакуноў.

Па жылах Антося бегла адважная кроў. Браты мае, яшчэ не паспеўшы агойтацца пасля цеснае майстэрні ў новым шыкоўным жытле, ледзь не засталіся сіротамі, а маё жыццё дык наогул вісела на павуцінцы. Хтосьці з добрых людзей нашаптаў айцу Геранімусу, што святы Пётра (гэта значыць, я) задужа выдае з твару па княскага стайніка Сымона. Яшчэ паўбяды, каб гэты Сымон быў праўдзівае рымскае веры, ці, на горшы выпадак, вуніятам. Ан ён, як на тое, — схізмат праваслаўны, які не верыць, што святы дух сыходзіць не толькі ад бога-бацькі, але і ад бога-сына.

Не боскі знак, а злачынныя падкопы заклятых ворагаў пана Езуса ўгледзеў айцец Геранімус у гэткім дзіве. Дайшло, шаноўныя, да таго, што пробашч наш, зірнуўшы ў часе набажэнства ў мой бок, стаў збівацца, нібыта падгулялы шкаляр.

Угневаны князь загадаў мяне пашчапаць і спаліць, а бацьку майго Антося, каб мацнела яго вера, пасадзіць у лёху да мядзведзя. Ды не паспелі замкавыя людзі спраўдзіць жорсткага княжага ўказу. Бо прыступіліся да места чужынскія ваяводы з незлічоным войскам. Два тыдні бацька мой і ўсе мужчыны, чые рукі маглі трымаць зброю, не спускаліся з гарадскіх муроў. Забыўшыся на звадкі і варажнечу, каталікі, вуніяты і праваслаўныя адным гуртам лілі на галовы абложнікаў агнёвую смалу, скідвалі прыступныя драбіны ды секліся ў рукапашнай. Добра ведалі жыхары слыннага места, як паводле волі міласэрнага Збавіцеля (відаць, у раі быў вялікі недабор) адны хрысціяне выразалі ў памежных гарадах другіх хрысціянаў, не пакідаючы на вуліцах і дзвюх жывых душ.

Адбараніліся на той раз мае землякі. А тым часам ачахла і полымя княскага гневу. Лагадней стаў паглядаць на мяне і айцец Геранімус, балазе, налажыў галавою пад час вылазу ў непрыяцельскі табар ненавідны вораг ягоны схізмат Сымон.

О чаму ніхто не ўклаў у мае драўляныя вусны Слова! Колькі маглі б яны распавесці вам, шаноўныя дбайцы, аб роднай гісторыі! Свая адмысловая показка знайшлася б і дзеля кожнага, хто прыходзіць сюды проста падзівіцца на старасвеччыну.

Вось гэтым дваім, што даўно ўжо не слухаюць Алены, а шэпчуць адно аднаму пяшчотныя словы, якіх у сэрцах іхніх болей, чым у царкве святых, я распавёў бы, як на гарадскім пляцы палілі чараўніцу.

А была яна, скажу вам, шаноўныя, такой самай чараўніцаю, як я — царом Саламонам. Адзінае, што было ў дачкі клепнара Лявона з Ціхай вуліцы чароўным, дык гэта яе хараство. Пабачылі б вы Хрысцініну паставу — князёўна! А белы, як парцаляна, твар з таноткімі чорнымі бровамі, а гарэхавыя, жывыя, нібы міркіль, вочы, а вейкі, быццам мяккія крыльцы баечных мятлушак... Кажуць, калі Хрысціна прынесла ў бацькаву майстэрню полудзень, малаточкі маладых чаляднікаў самі сабой выбівалі ў яе гонар сонечную мелодыю. А калі ў нядзелю яна ў сваім зялёным фалюндушавым саяне з кшталтам чорнага аксаміту прыходзіла разам са старым Лявонам на імшу, далібог, у касцёле ставала святлей і, палохаючы пацеры, па-над галовамі вернікаў луналі чароды грахоўных падумак.

Але яна, гэтая красуня з дзвюма цяжкімі смалянымі косамі, была незачэпаю. Сам княскі медыкус, бялявы станісты прыгажунчык, што студыяваў у далёкіх улохскіх універсітэтах лекарскія і грахаводныя навукі, той самы медыкус, па якім сохла безліч жаночых сэрцаў у замку і месце, гэтым разам толькі аблізнуўся.

Не ведала, ой не ведала Хрысціна, што душа ў пана лекара чарнейшая за найчарнейшы атрамант, якім змацоўваюць дамову з д'яблам. І калі захварэла ўлюбёная князева дачка і не адпрэчылі ліхаманку заморскія пігулкі, абвясціў медыкус, што гэта наслала чары на высакародную кроў Лявонава Хрысціна...

Толькі для аднаго чалавека на ўсім белым свеце не была яна незачэпаю, і чалавек гэты стаяў у натоўпе і неўразуменнымі вачыма глядзеў, як чырвоныя языкі, перабягаючы з палена на палена, ліслівa падкрадаюцца да босых Хрысцініных ног.

Божа, прасіў я, ты нагадаваў пяццю хлябамі пяць тысяч галодных! Ад твайго слова засохла смакоўніца! Ад дотыку тваёй рукі ў невідушчых расплюшчваліся вочы! Злітуйся над невінаватаю ні ў чым, апрача свае прыгажосці, дзяўчынаю! Уратуй яе ад ненажэрнага полымя! Ты чуеш, божа? А мо ты хочаш узяць яе на неба? Тады пашлі кару яе катам, пакарай медыкуса, бо грэх ягоны трыкротна варты смерці!

Новыя роспачныя малітвы вырываліся з маёй душы, але ён не чуў, а мяне ўжо дапінала гарачае дыханне вогнішча. І тады я пачаў блюзнерыць і ў думках сваіх даходзіў да грахоў, адпусціць якія не можа нат самая дарагая прошча *. Але ён застаўся глухі, і тады я ў адчаі звярнуўся да яго астатні раз. Божа, папрасіў я, калі ты ёсць, спапялі мяне, бо я не хачу жыць пад тваёй нялюдскаю ўладай.

І ён зноў не пачуў.

І тады я зняверыўся і паслаў гэтай хімеры самыя страшныя праклёны.

А дым ужо ахінуў Хрысцініну постаць, і па-над пляцам разлёгся вусцішны крык звар'яцелага старога Лявона, і ў разнасцежаныя дзверы касцёла згледзеў я, як белыя галубы скінулі па пёрку на цёмна-русую галаву чалавека з неўразуменнымі вачыма. І быў гэты чалавек мой бацька Антось...

Ачнуўшыся ад прыгадаў, я бачу поруч аточаную дзецьмі настаўніцу і чую штосьці пра цёмных продкаў.

Як вы мяркуеце, шаноўныя, ці ўратавала б мяне гэтая кабета ў той даўні дзень, калі на цвінтары загарэлася вогнішча з абразоў і старадрукаў нашае друкарні, і на самым яго версе, быццам ерэтыкі, ляжалі мы з Паўлам і братамі Янам, Мацвеем, Маркам і Лукашом (а мушу зазначыць, што браты мае былі закаранелыя бязбожнікі і не горшыя ад мяне блюзнеры)? У перадсмяротнай тузе я глядзеў, як полымя паспешліва гартае кнігі, ператвараючы словы ў тло, а калі агонь падышоў усутыч, я стаў развітвацца з сінім, нібы вочы майго бацькі, небам, і апошняе, што ўбачыў, перш чым нізрынуцца ў нябыт, была кніга, якую мой брат Паўла трымаў ва ўзнятай над полымем руцэ.

Мяне выцягнуў з агню стары настаўнік, і па тым часе, шаноўныя, гэта быў не абы-які ўчынак. А ў дрывотні я пачуваўся, далібог, лепей, чым прарок Іёна ў чэраве левіяфана. Праўда, вылячэнню чохаўкі новы прытулак спрыяў няшмат, але затое майму ратаўніку ўдалося пераканаць усіх, што яму папросту трэ было сухое дрэва на распалку ў печы.

Вы не ўяўляеце, як прыемна адчуваць, што вунь той модны танклявы юнак з рудымі вусамі зрабіў бы на месцы настаўніка тое ж самае. Ён яшчэ не наблізіўся, адно глянуў здаля, а маё драўлянае сэрца ўжо страпянулася, кранутае чыстым і цёплым струмком яго думак. А думкі ягоныя пра майго бацьку, пра безыменных мастакоў,

* Так мінаецца зямная слава (лац.).

* Індульгенцыя.

Юрка ГОЛУБ

Кастрычніка барвовы вецер

У хаце, сельсавеце
Сціскай руку, рука.
Кастрычніка барвовы вецер—
На ўсіх мацерыках.

Пад чырвань зор штогод
Трымай штурвал трывала,
Каб дбайны твой паход
Айчына падтрымала.

Ты памятаеш, сын,
Узлёт сцягоў пад неба?
Жывеш ты—не адзін—
Кастрычніку патрэбны!

У сэрцаў,
спраў
І дзён
Багата плёну ўзята.
Нам новы дзень відзён,
Кастрычнікам багаты.

Касмічную вярсту,
Хутчэйшы у Сусвеце,
Адольвае вястун—
Кастрычнік—
часу вецер.

Мазгавая атака

Мазгавая атака—
Квет сабран навуковы.
Адкрыццё? Небаракі!
Перакос? Выпадкова!

Кожны скажа без меры,
І яму не пярэчаць.
Ва уласнай кватэры
Потым можаш аспрэчваць.

З тым—патрэбна згадзіцца,
Там—бязлітасна рэзнуць
І над ісцінай біцца—
Паміраць і ўваскрэснуць.

А на думку натрапіць
Ненадзейна у тлуме.
Не чакай, калі раптам
Певень смажаны клюне.

Неабходна спяшацца
Да сябе і нашчадкаў.
Будзе час адляжацца
На тым свеце ашчадна.

У чупрынных астатках
Вы—ахвяры асветы.
Мазгавая атака
Патрасае сусветы!

Колькі часу?

Памарудзь і паперы збяры,
Сам з сабой не спрачайся.
Уздыхаюць, як людзі, бары.
Колькі часу?

Ходам дрэвы і словы ідуць
І вайсковыя часці.
Хай яны не сустрэнуць бяду.
Колькі часу?

На парозе слязы і сустрэч
Сэрца грукае часта.
Не трымці, не шкадуй, не пярэч.
Колькі часу?

Занядбайны усімі даўно,
Ці за славай ганяйся.
Як знаменне, заўжды ўсё адно:
Колькі часу?

Закаснелую душу парві
І на подзвіг адчайся.
Свеціць сонца высокай пары.
Колькі часу?

Ды ў краіне аблок і ажын
Вуснаў губіць прычасце,
Колькі часу усё ж, адкажы,
Колькі часу?

Прызнанне ядлоўцу

Памятаю, не ў смутку
І недзе зімы на згон
Прыйшла да мяне пагудка,
Напомніла пра яго.

На векавых каменнях
Высахла колькі рос?
Ляцела наўзбоч праменне,
А побач ядловец рос.

Усцешаны і прашыты
Сіверам да касцей.
Жвір мацаваў ля жыта
І птушкі хаваў пасцель.

Гляджу на яго карэнні
На выпетраных палях,
А знізу пад імі—крэмень,
Над імі—сінечы дах.

Смалою яго таўровай
Азначыш мне, край, далонь.
Ядловец не йдзе на дровы,
Ядловец ідзе ў агонь!

І з доляю беларуса
Не ў космасе—па траве—
Запэўніць усё ж бяруся—
Ён міма не праплыве.

З воблікам непакоры,
Паставаю не відзён,
Мае стожыльны корань,
Да пошуму не жадзён.

Каму не хапае моцы,
А можа, і дух ачах,
Ядловец у пераможцы
Пакажа вячысты шлях.

Вечназялёны браце,
Пад воблакам наўскасы
Ідзём мы пры роднай хаце,
Дзе спевы і каласы.

Уздыбленыя сумёты.
Спякоты сухой ярмо.
Ядловец маёй самоты
І радасці заадно.

Замалёўка сакавіка

Стаяла графіка бяроз
І кожнай галкай шапацела.
Ад галак тых за перавоз
Пагудка з крыллямі ляцела

Пра сакавік і ледаход
У схове вербаў і туману,
Што будзе незвычайны год.
У лісце хуткае прыбраны.
А потым будуць дзень пры дні
Трымаць у прыгаршчах праменне.

А салаўі—
не абміні—
Наладзяць сэрцу перамены.
Нястомны галчаны народ
Грунтоўна гнёзды з крэчам ладзіць
І ў агарод пра недарод
Ад галак вестка не залазіць.

Замалёўка ліўня

У травах ціхне звон.
Іх ніца вецер горне.
У чэрвеня ізноў
Наліўся мускул громам.

Узнята ўгору дном
Цыстэрна цяжкай хмары,
Аж ходзяць хадуном
Абшары і папары.

Спяшаюцца у схрон
Стары,
Дзіця
і пташка,
Бо з чатырох старон
Зляцецца ўсім няцяжка.

Зноў плешча у плюшчы.
Трашчыць—
чутно пад ранкі—
У ліўня на плашчы
Сухое шво маланкі.

Трыялет

Склепу рыжскага вітражы,
Бы вясёлка у падзямеллі.
Вы на воку яшчэ не мелі
Склепу рыжскага вітражы?
Душы вашы тады змалелі,
Ды ўсё роўна, як ні кажы,
Склепу рыжскага вітражы,
Бы вясёлка у падзямеллі.

●

Сукня твая з дэкорам
Весела запалае.
Толькі глядзіш з дакорам,
Сённяшняя і былая.

Помніш узлёты лета
З воблакамі і стрыжамі?
Рукі твае уздзеты.
Вейкі твае дрыжалі.

Шчасце нас прывячала—
Большага мы не мелі.
Дрэвы ўначы маўчалі.
Кветкі ўдзень звінелі.

Помніш зімы аздобы,
Зыркія, як сумёты?
Жыць невыносна добра
З радасцю і самотай.

Сходзяцца ў круг пачуцці:
Вераць у міг растання.
Голас даўно не чуцен.
Словы, як снег, расталі.

...Сукня твая з дэкорам
Весела адпалала.
Толькі глядзіш з дакорам—
Так у нас не бывала...

Можа, мае правіны
Сталі таму прычынай?
Ты расказаць павінна,
Сядзем давай чын-чынам.

Што ты глядзіш з дакорам
У прыстанцыйным дыме,
Рэжаш мяне пад корань
Позіркам, што не ўздыме?

што малявалі гэтыя дзівосныя абразы, пра зямлю, якая іх нарадзіла. (Ты ілгаў у сваім пасланні, мой аднайменнік святы Пётра, калі пісаў, што ўсякая плоць, як трава, і ўсякая слава чалавечая, як квет на траве; засохла трава і квет яе апаў. Ты ілгаў).

О не, шаноўныя, я не абмовіўся, што ведаю, аб чым думае гэты юнак. За столькі год кожны на маім месцы навучыўся б чуць думкі людзей не горш за іхнія словы. А ці трэба здзіўляцца таму, што я магу зазірнуць у кнігу чалавечага лёсу? Бачу ў ёй, што хлопец гэты мастак і свечка яго душы будзе гарэць моцна і роўна і не пагасне, пакуль ён не збярэцца ў сваю астатнюю дарогу.

Чаму пячатка маўчання ляжыць на маіх вуснах?! Я распавёў бы яму пра мастакоў, што распісвалі мой старадаўні прыстанак фрэскамі. Іх было двох—бацька і сын, і яны гаварылі між сабою той моваю, што і Антось.

Цяпер на месцы фрэсак белая неруш тынкоўкі — сам пан бог, калі б ён існаваў, не здолеў бы дапамагчы рэстаўратарам пасля таго, як на фрэскі гадамі любаваліся вецер і дажджы. А тады...

Гэтыя двое, што пачыналі свой дзень з пацераў святому Лукашу *, былі праўдзівыя цудатворцы. Здавалася, іхнім пэндзлям аддалі барвы самыя зыркія і зіхатлівыя з вясёлак, што ад стварэння свету запальвала над нашай зямлёю сонца. Здавалася, з вуснаў намаляваных імі сівабародых прарокаў вось-вось зляціць вешчае слова, а кветка ў руках царыцы Саўскай была гэткай жывою, што на яе аднойчы ўсцешна апусцілася заляцелая ў храм пчала-медавіца...

Князь па-каралеўску адарыў мастакоў золатам з бяздонных сваіх скарбніц ды, мала гэтага, абвясціў наваколлю, што дае ў гонар слынных майстроў баль. Кажуць, болей чым сотню суседзяў і васалаў сабрала ў замку тая бяседа, і на пачэсным месцы сядзелі мастакі ў дараваных князем адамашкавых, з залатым тканнём каптанах, і слугаваў ім на знак асаблівае міласці адмысловы стольчы—накладаў на ўзорчыстыя срэбныя споды дзічыну, падліваў у звонкія венецыянскія келіхі французскае віно. А ў глухім замкавым сутарэнні, куды знадворку не даляціць нават гарматнага стрэлу, ужо чакаў кат з гострым, бы асінае джала, кордам.

Ноч навылёт вірыла застоліца, а на світанні, у няпэўным святле аплытых свечак трохі цверазейшыя з бяседнікаў змецілі, як бацька і сын заснулі ў высокіх разблёных крэслах, звесіўшы русявыя галовы на грудзі, і княскія людзі асцярожліва паднялі крэслы і панеслі некуды па заблытаных пераходах. А напоеныя падступным зеллем мастакі ціха ўсміхаліся ў сне і не ведалі, што больш нідзе і ніколі не паўтораць яны свайго дзіва, бо з гэтае раніцы іх вочы будуць заўсёды бачыць адно цемру...

Зірніце, шаноўныя, як лазуркава, пунсова і бурштынава ўспыхнулі вітражы ў заходніх вакенцах! Гэта значыць, што Алена пабегла ўжо на свае вечаровыя лекцыі на гістарычным факультэце, і хутка я застануся сам-насам з марудлівай паўнаватаю прыбіральшчыцай цёткай Ядвісяй. Узнятыя ёю пылінкі будуць павольна танцаваць у стамлёным сонечным промні, і, выбачайце, не будзе ўжо ніякае змогі ўтаймоўваць чохаўку... Паглядзелі б вы, як пасля майго чоху цётка Ядвіся няўцямнапалахліва азіраецца на бакі і хапатліва жагнаецца на мяне і чамусьці на жалезнага рыцара, які вартуе ўваход. Ну даруйце мне, старому, гэтую бяскрыўдную забаву.

Але пакуль што па музейнае цішы яшчэ блукае апошні наведнік, і я прытомлена і спярша ленавата прыслухоўваюся да ягоных думак.

Недабудаваны гараж... Паўтары тысячы доўгу... Тэрмінова трэба майстар, каб змураваць на летніку камін... Цікава, якая нітачка прывяла яго сюды? Ага, хоча вызнаць, ці каштоўныя яго абразы, тыя дзве цёмныя дошкі, на якіх амаль нічога не відаць і якія ён забраў пасля хаўтураў з матчынай хаты. Мо пашэніць каму-небудзь выгадна збыць, каб вярнуць пазычкі?

Гэты лысаваты, добра апрануты чалавек прыпыняецца каля мяне; я на імгненне сустракаюся позіркам з мітуслівымі вачыма за круглымі шкельцамі акуляраў, і гэтага дастаткова, каб кінуць вока ў яго будучыню.

Ён яшчэ не ведае, што там засталося зусім мала дзён. Але журботна мне з іншае прычыны. Ну што, скажыце, зменіцца, калі ён даведаецца пра пухліну, якая ўжо расце ў ягоным страўніку? Пачне мітусіцца, шукаць нейкія лекі. Ці задумаецца хоць аднойчы, як пражыў жыццё, дзеля чаго, ці задумаецца, хто ён, навошта прыйшоў на гэтую зямлю і куды ідзе?

Я хацеў бы, шаноўныя, каб ён пачуў пра друкароў з нашае друкарні, што стаяла водбліз гарадскога млына да самага пажару пад час вайны са шведамі. Пра худога і цыбатага, нібы птушка жораў, мніха, які ўзімку і ўлетку хадзіў у адной лапленай сутане і які насмельваўся казаць непачцівыя словы самому князю, вінавацячы яго ў адступе ад бацькоўскіх звычаяў і слова. Казалі, мніх той быў некалі заможным шляхціцам, ды змяняў поўны трыбух на друкарскі варштат, каб даць люду паспалітаму духоўную лусту, як запавечыў Францыск Скарына са слаўнага места Полацкага.

Згадаў бы я і другога ў друкарскіх справах майстра, чалавека простай сялянскай крыві, што, ратуючыся ад гневу патрыярха, вярнуўся на бацькаўшчыну, знайшоўшы прыстанак у княскай друкарні. Не ведаю ягонага аблічча, бо касцёл ён абмінаў, не пераражгнаўшыся, але ведаю, што ў астатні свой дзень друкаваў ён лемантар на роднай мове, калі ворагі былі ўжо на вуліцах места, і астатні раз убачыў сонца, баронячы на парозе друкарні кнігі.

Лысаваты ўжо далёка адсюль — спяшаецца кудысьці ў вулічным збоі, а я па-ранейшаму думаю аб ім. Ці патрэбна яму тое, што я памятаю?

Раней я меркаваў, што яна, гэтая памяць, наогул не трэба нікому, апрача некалькіх дзівакоў, бо жыць без яе людзям зручней і ўтульней. Ды апошнім часам да мяне ўсё часцей прыходзяць іншыя думкі. Бо ёсць жа Алена, і той мастак з рудымі вусамі, і фацэтны паэт, што сачыняе пра мяне паэму... А пакуль ёсць сейбіты, будуць і ўсходы.

Зрэшты, дбаннем рэстаўратараў, прынамсі, стагоддзяў пяць жыцця мне яшчэ забяспечана. Так што, шаноўныя, пагледзімо..

* У сярэднявеччы апостал Лукаш лічыўся апекуном мастакоў.

Пра бітву, пра памяць

Новыя творы беларускіх кампазітараў, прысвечаныя Вялікай Перамозе

ГІСТОРЫЮ ствараюць людзі. Памяць пра яе захоўваецца ў легендах, помніках, паэмах, сімфоніях, араторыях, песнях... Памяць пра цяжкія і гаротныя, мужныя гады мінулай вайны, пра шлях савецкага народа да Перамогі жыве і ў творчасці беларускіх кампазітараў. Іх новыя творы, прысвечаныя 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, былі ўключаны ў праграму сёлетняга фестывалю «Мінская вясна».

ВАКАЛЬНА - СІМФАНІЧНАЯ паэма І. Лучанка для барытона, чытальніка, вялікага сімфанічнага аркестра і органа «Вайна не патрэбна» (на вершы сучасных паэтаў). Выканаўцы М. Жылюк, В. Анісенка, К. Шараў і Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР, дырыжор Г. Праваторaў. Мастацкія якасці, жанравая, грамадзянская накіраванасць гэтага твора запраграмаваны ўжо ў пераліку выканаўцаў. Вялікі склад аркестра і арган патрэбны кампазітару як сродкі для адэкватнага ўвасаблення задумы, для шырыні «плакатнага штрыха», які так уласцівы творчасці І. Лучанка. Салісты ж як бы канкрэтызуюць ідэю паэмы, спрыяюць яе даходлівасці да слухача. У творы пазнаеш почырк І. Лучанка — майстра гукавой «публіцыстычнасці», майстра мелодыі і маштабнай кульмінацыі. Яркае ў паэме супрацьпастаўленне кантрастных псіхалагічных станаў: трывожнае ўсведамленне неабходнасці барацьбы народаў за мір — і аб'ектыўнае, мірнае існаванне чалавека з лірыкай пачуццяў, стваральнай працай. Кампазітар праз страснае грамадзянскае адмаўленне («Вайна не патрэбна»), праз успаміны пра былое і роздум пра хараство сучаснага («Ці ведаеш ты», «У чырвоным сне») на эмацыянальным крашчэнда вядзе слухачоў да фінальнага «плакатнага закліку» — да марша барацьбітоў за мір («Сустрэчы»). У маршы гучыць непераможная моц з'яднанага народа. Ды свет сёння неспакойны, і таму кампазітар у канцы паэмы (які выразны бывае толькі адзін акорд!) «ставіць» драматычны і шматзначны мінорны акорд-заканчэнне. Нібы перасцярога новай сусветнай трагедыі.

«ПРЫНАШЭННЕ свяшчэннаму агню», сімфанічная паэма У. Дарохіна, выконвалася Акадэмічным сімфанічным аркестрам БССР пад кіраўніцтвам Г. Праваторава.

У музычнай літаратуры нямала твораў-прынашэнняў, якія, праўда, не вылучаны ў асобны жанр. Ёсць такія творы ў Л. Бетховена, Ф. Ліста, Ф. Шуберта — патаемна-лірычныя і прыгожыя музычныя станы, у якіх аўтары заўсёды максімальна шчырыя, нават пяшчотныя... «Прынашэнне», напісанае У. Дарохіным, успрымаеш як своеасаблівы вянок пачуццяў, звернутых да свяшчэннага помніка. Паэма гэтая, бадай, сінтэзавала лепшыя вынікі пошукаў кампазітара ў дзвюх ягоных сімфоніях, сюіце «Мемарыял», пошукаў музычнага ўвасаблення гераічных вобразаў. Слова аўтару, У. Дарохіну:

— Я нарадзіўся пасля Вялікай Айчыннай, але яна не абмінула нейкім чынам і мяне: мой дзядзька не вярнуўся з вайны, у майго бацькі шрамы, якія я бачу з дзяцінства і ведаю, адкуль яны. Гэта — маё, асабістае. А яшчэ людзі нашага пакалення вайну ведаюць па творах мастацтва, як абагульнены вопыт многіх мастакоў, журналістаў, сведкаў. І маё асабістае ўспрыняцце вайны — як бы працяг такога абагульнення... Атмасфера падрыхтоўкі святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі стымулявала, засяродзіла мае думкі, пачуцці. Працуючы над паэмай, я звярнуўся да праграмнага сімфанізму, вобразны змест твора звязаны з канкрэтным месцам — плошчай Перамогі ў Мінску. У трох раздзелах паэмы імкнуўся перадаць мае асабістыя ўражанні і эмацыянальна-псіхалагічны стан тых, хто схіляе галовы перад абеліскам. Кожны раздзел мае праграмную назву: «Агонь вечнай памяці», «Фрэскі» і «Манумент Перамогі».

Гэта — аўтарская задума. А якія ўражанні ўзнікаюць у слухача? Поклічам трубы пачынаецца паэма — музычным увасабленнем узрушана-радаснага стану чалавека, які прайшоў праз жахі вайны і вярнуўся пераможцам. Міжволі дарохінская «пераможная труба» асацыіруецца з фанфарай, што ў руцэ жанчыны-Перамогі (новы мемарыял на праспекце Машэрава ў Мінску). Такая прэлюдыя ўспрымаецца як, бадай, традыцыйны пачатак твора, прысвечанага ўшанаванню пераможцаў.

Затым аркестр апавядае пра пачуцці нашага сучасніка, які па-свойму, асэнсоўваючы глыбіню, шчырасць і вечнасць людской удзячнасці вызваліцелям, стварае сваю «памяць у гуках».

Ёсць у паэме У. Дарохіна пэўнае апісальніцтва, музычная ілюстрацыйнасць. Ёсць і рамантычная вытанчанасць... Усё гэта магло б успрымацца як страка-тасць, каб не скразная ідэя-вобраз усіх трох раздзелаў: свяшчэнная памяць перад манументам Перамогі.

Лёгкім дыханнем успрымаецца пасля драматургічнай кульмінацыі твора тэмбр баяна. І міжволі ўяўляеш сабе пасляваеннае мірнае поле — майскае ці чэрвеньскае, сонечнае: вось так, пасля грукату жалеза, смертаносных стрэлаў і выбухаў — чысты, празрысты далягляд!

А ў канцы «Прынашэння свяшчэннаму агню» гучыць арган. Як сімвал помніка Перамозе, сіле народнай!

В. ПОМАЗАЎ, вакальна-сімфанічная паэма «Памяць». Гэты твор выконвалі Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР, салісты В. Пархоменка (народныя спевы) і У. Пузыня (жалейка), дырыжор Г. Праваторaў. Пасля поспеху «Вясковых музыкаў» і «Батлейкі» для народнага аркестра, рытуалу «Заручыны», мяркую, многія слухачы чакалі ўжо новага твора В. Помазава.

Пасля першых жа акордаў уступу кампазітар дасягае эфекту, які я назваў бы эфектам «агучаных малекул памяці»: проста і чыста гучыць жалейка. Яе тэмбр, як потым і ўдовіна песня, падкрэслівае глыбокія нацыянальныя вытокі паэмы. Твор В. Помазава падзяляецца на тры кантрастныя вобразныя сферы: народная жалоба і памяць пра загінуўшых (жалейка, жаночая песня), музычны шарж на фашыстаў-карнікаў (гратэскны марш варожага нашэсця) і непераможная моц, спрадвечны народны аптымізм, мужнасць (рэкруцкія песні ў распрацоўцы духавога аркестра). Адзначу смелую спробу аўтара стварыць такі «фашысцкі» марш, які б не быў падобны да марша Д. Шастаковіча з Сёмай сімфоніі і арганічна ўвайшоў бы ў самабытную канву паэмы. Марш фашысцкага нашэсця атрымаўся ў В. Помазава патэатральнаму яркі, так і ўяўляеш балюча знаёмую па кінакадрах карціну пажарышчаў, варожага вандалізму, гора народнага.

У КАНЦЭРТА Г. Вагнера для скрыпкі з аркестрам (салістка В. Пархоменка) няма канкрэтнай праграмы. Аднак, выкананы ў канцэрце тых, тэматычных, прэм'ер, твор арганічна прагучаў у кантэксце галоўнай тэмы — тэмы Перамогі. Змест Канцэрта жывілі вобразы сённяшняга мірнага жыцця, твор споўнены аптымізму, бадзёрага настрою. Дадамо, што пасля твораў М. Аладава, П. Падкавырава, Р. Суруса і Г. Гарэлавай у гэтым жанры скрыпічны канцэрт Г. Вагнера — пяты ў гісторыі беларускай музыкі.

СТАРЭЙШЫМ беларускім кампазітарам А. Багатыровым да 40-годдзя Перамогі створана араторыя для хору, салістаў, чытальніка і сімфанічнага аркестра «Бітва за Беларусь» (выконвалі Аб'яднаны хор Беларускага тэлебачання і радыё і кансерваторыі, Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР, салісты М. Жылюк, С. Машкоў, В. Кучынскі, Н. Галеева, чытальнік В. Анісенка, дырыжор Г. Праваторaў).

Араторыя «Бітва за Беларусь» на вершы Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча і А. Куляшова працягвае, разгортвае панараму вобразаў, якія так ярка ўвайшлі са старонак твораў А. Багатырова ў нашу музыку. Восем частак, восем балад пра барацьбу беларускага народа ў розных мясцінах роднага краю. Успрымаюцца яны нібы фільм «пад хроніку». Майстра кампазітарскага пісьма, А. Багатыроў увасобіў псіхалагічны стан народа-барацьбіта ў творы сапраўды манументальным, класічным, як кінастужкі С. Герасімава і С. Бандарчука, як скульптура З. Азгура і А. Анікейчыка, як паэзія М. Танка, як проза В. Быкава.

Кожная частка араторыі самастойная, са сваім уступам, экспазіцыяй, кульмінацыяй, завяршальнымі «кропкамі». Кожная — карціна вайны, разгорнутая, мужная, уражлівая.

Пачатковая частка — «Беларусі» (верш Г. Бураўкіна) — гучыць як клятва сучасніка, як музычнае прысвячэнне, пасля якога слухач далучаецца да эпічных эпізодаў «ваеннай хронікі», інтэрпрэтаваных кампазітарам. Класічна-традыцыйныя баладныя часткі «Апоўдні, у нядзелю» (верш Н. Гілевіча) і «Камсамольскі білет» (верш А. Куляшова). Суровы народны гнеў, стрыманы і мужны смутак поўняць часткі «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына» (верш Н. Гілевіча) і «Ліст з палону» (верш А. Куляшова). У араторыю А. Багатыроў уключыў і напісаную раней «Баладу пра чатырох заложнікаў» на верш А. Куляшова.

Лепшыя сімфанічныя карціны айчыннай музычнай класікі нагадала «Бітва». Гэта кульмінацыя араторыі, эмацыянальнае завяршэнне развіцця музычных вобразаў. Тэкст чытальніка ў гэтай частцы гучыць філасофскім абагульненнем.

Нарэшце, эпілог. Усе папярэднія часткі, логіка іх вобразнага развіцця, эмацыянальнай «фактуры», здавалася б, вымагалі гучных, моцных заключных акордаў. Ды А. Багатыроў, тонкі мастак, адчуў неабходнасць іншага завяршэння: араторыя заканчваецца ціхім і светлым харавым акордам. Як хмурынка памяці ў далечыні чыстага неба. Мірнага. Свабоднага. Сонечнага.

Асаблівыя эстэтычныя і грамадзянскія вартасці новай работы А. Багатырова робяць яе падзеяй музычнага жыцця Беларусі. Слухаючы «Бітву за Беларусь», думаеш: сучасны, так сказаць, «дынамічны» стан слухача, які прызвычаіўся да кароткіх («сучасных») і адвык ад доўгіх, вялікіх, манументальных твораў — гэта ўсё ж не вельмі добрая звычка, даніна паспешліваму часу. «Доўгая» ж араторыя А. Багатырова дае падставу сказаць: чалавек удумлівы, тонкі, з высокім грамадзянскім пачуццём на такі твор рэагуе актыўна, удзячна прымае крыху забытыя, «цяжкаватыя» формы. Тым больш, калі ў гэтых формах увасоблены самыя шчырыя і надзённыя намеры кампазітара-патрыёта, чый талент неаднойчы захапляў слухачоў творамі надзвычайнай глыбіні і маштабу. Араторыя А. Багатырова — прыклад высокага грамадзянска-філасофскага абагульнення ў музыцы ўсенароднай барацьбы і Перамогі. Разам з тым, і прыклад тонкага адчування нацыянальных асаблівасцей псіхалогіі народа, і прыклад манументальнай распрацоўкі лепшых традыцый савецкага музычнага мастацтва, прынцыпаў інтэрнацыяналізму ў музыцы.

А ЦЯПЕР — колькі больш спакойных, разважлівых слоў. Так, мы аддаём належнае шчырасці кампазітараў малодшага, ды і сярэдняга, пакаленняў, якія дакрануліся да святой для нас тэмы, раскрылі свае думкі і пачуцці, грамадзянскую ўдзячнасць за мірны дзень. Але ж варта глядзець і наперад. Не магу пазбавіцца ўражання, што кампазітары быццам «дакошваюць поле» пэўнага перыяду ў развіцці нацыянальнай музыкі і яшчэ не ведаюць, якімі захапляльнымі тэмбрамі могуць звінець іх «косы» на новым творчым прасцягу. Узровень мастацкіх абагульненняў даволі высокі, аднак, калі гучаць запар творы на адну тэму, выяўляюцца пэўныя стэрэатыпы, традыцыйнасць. Нашы кампазітары, вядома, не могуць не адчуваць гэтага, ды нейкая незразумелая зачараванасць учарашнімі музычнымі далягледамі быццам стрымлівае іх. Чакаем новых творчых стартаў ад стваральнікаў беларускай музыкі.

Данат ЯКАНЮК.

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

ПРЭМ'ЕРА Ў КРАСНАПОЛЛІ

Лаўрэат прэміі камсамола Магілёўшчыны і І Усесаюзнага агляду самадзейнай творчасці працоўных народны тэатр Краснапольскага раённага Дома культуры паказаў сваю новую работу — прэм'еру спектакля па п'есе беларускага драматурга Пятра Васілеўскага «Твой заўтрашні дзень».

Гэта трэці спектакль, ажыццёўлены калектывам да 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Двума папярэднімі былі «Алазанская даліна» К. Губарэвіча і «Людзі і д'яблы» К. Крапівы. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля — галоўны рэжысёр тэатра В. Ермаловіч.

У спектаклі занята ўся трупа. Праўдзівыя вобразы стварылі артысты народнага тэатра настаўнікі Краснапольскай сярэдняй школы В. Галакціёнаў і Л. Галакціёнава, загадчык аддзела культуры райвыканкома У. Падзінака, механізатар калгаса імя У. І. Леніна У. Краўчанка, юрыст сельгасупраўлення А. Грозін, шафёр ПМК-23 В. Разгонаў, эканаміст райспажыўсаюза Н. Малініна, намеснік галоўнага ўрача раённай бальніцы В. Кананкоў, выхавацелька дзіцячага сада Т. Кацягова.

Спектаклі краснапольцаў заўсёды праходзяць з вялікім поспехам. Іх гледачамі былі жыхары раённага цэнтра, сельскія працаўнікі калгасаў «Камінтэрн», імя Валадарскага, «Рассвет», саўгаса імя Калініна, а таксама жыхары Чэрыкава, Клімавіч, Хоцімска, Крычава, Касцюковіч.

А. ГОЛЫШ.

НА ВЯСКОВАЙ СЦЭНЕ

Народны тэатр Палаца культуры Беларускага аўтамабільнага завода адзначае юбілей — 25 гадоў таму назад адбылося першае выступленне перад гледачамі. За гэты час падрыхтавана шмат спектакляў. Найбольшы поспех выпаў на такія, як «Цемрашалы» А. Талстога, «Дом Бернарды Альбы» Гарсія Лоркі, «Доктар філасофіі» Б. Нушыча, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага, «Развітанне ў чэрвені» А. Вампілава.

Тэатр з'яўляецца лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі і граматамі за актыўную работу па эстэтычным выхаванні. Жодзінскія самадзейныя артысты аказваюць вялікую дапамогу тэатральнаму калектыву саўгаса «Зарэчча» Смалявіцкага раёна.

Гэтымі днямі народны тэатр паспяхова выступіў на гастролях у Салігорскім раёне, дзе паказаў свае лепшыя спектаклі. З майстэрствам яго выканаўцаў пазнаёміліся працаўнікі калгаса «40 год БССР», саўгасаў «Новае Палессе», «Гарняк».

К. ГАЛІНКІН.

«МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ» № 7

«Выхоўваць творчую змену» — артыкул начальніка ўпраўлення тэатраў і музычных устаноў Міністэрства культуры БССР У. Рылаткі аб павышэнні ідэйнага і прафесійнага ўзроўню маладых творчых работнікаў.

Агляд адказаў на анкету, распаўсюджаную часопісам сярод мастакоў Беларусі — «У планах, у марах — мір на планеце», — робіць В. Трыгубовіч.

Э. Петэрсон разважае аб выстаўцы маладых скульптараў — «Чацвёра маладых у прасторы і часе».

А. Плаўнік («Ад інфармацыі — да палітыкі») і Р. Ясінскі («Быць бачнай памяццю гісторыі») дзеляцца думкамі аб адлюстраванні актуальных праблем жыцця кінахронікі.

Артыкул Л. Раманоўскай «Хто за пультам?» узнімае праблему выхавання прафесійных якасцей дырыжораў хору.

Спектакль «Жанчына з мора» па п'есе Г. Ібсена, пастаўлены на малой сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, рэцэнзуе Т. Гаробчанка — «У пошуках шчасця...».

Роздум Н. Шарамецьеўскай аб спектаклі «Балеро» ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета БССР — «Класіка і сучаснасць».

Аб эстэтычным выхаванні дзяцей у Гродзенскай вобласці гаворыць У. Церабун — «Каб цягнік рухаўся бясконца».

Агляд спектакляў Тэатра юнага гледача зрабіла Л. Грамыка — «І спадзяванні, і спачуванні».

Аб творчай дзейнасці кампазітара М. Чуркіна — артыкул Н. Абдурашытавай «Біяграфія пачыналася ў Азербайджане».

Змешчаны «Старонкі календара», «Фільмаграфія», «Хроніка мастацкага жыцця», рэцэнзіі, іншыя матэрыялы.

ВІНШУЕМ

НЕЎТАЙМОЎНАЯ ДУША

Народнаму артысту СССР лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР Генадзю ЦІТОВІЧУ ~ 75

Бадай, не знойдзеш на Беларусі такога куточка, дзе б не ведалі Генадзя Іванавіча Цітовіча. Дзе толькі ні пабываў ён, каб зрабіць запіс новае песні або паслухаць народных спевакоў! Такое ўсё ягонае жыццё— творчае, неспакойнае. Такі ён і сягоння, наш Генадзь Іванавіч, —вучоны, фалькларыст, грамадскі дзеяч.

Маё знаёмства з Генадзем Іванавічам адбылося, калі ў 1952 годзе ён арганізаваў і ўзначаліў як мастацкі кіраўнік Дзяржаўны народны хор БССР. З таго часу нашы шляхі праходзяць побач.

Успамінаю, як я, тады самадзейны аўтар, быў усхваляваны, калі пачуў, што адну з маіх першых песень (гэта была песня на словы А. Сіткоўскага «Ой, шумяць лясы зялёныя») Генадзь Іванавіч уключыў у праграму дзяржаўнага хору. Якая гэта была вялікая радасць і падтрымка для маладога тады аўтара! Потым былі і іншыя нашы творчыя сустрэчы, але той першы выпадак я ўспамінаю з вялікай удзячнасцю. Такое не забываецца!

З пачуццём удзячнасці да Генадзя Іванавіча адносіліся многія самадзейныя кампазітары таго часу. Гэта П. і А. Шыдлоўскія, Р. Галавасцікаў, П. Шаўко, П. Касач, І. Мацін, П. Сушко, М. Пятрэнка і іншыя. Ён рабіўся заўсёды ўсхваляваны, радасны, пачуўшы новую песню! Ён жыў гэтай песняй, якая ўжо не давала яму спакою.

Вялікая папулярнасць Генадзя Іванавіча ў артыстаў-аматараў Беларусі. Бывае, прыязджаеш у народны калектыў, Генадзь Іванавіч жа на гэты раз не прыехаў. Людзі пытаюцца, чаму яго няма. І калі ўжо вяртаешся дадому, абавязкова вязеш прывітанні, пажаданні для Генадзя Іванавіча ад удзельнікаў калектыву, добрых сяброў, якіх у яго шмат і якія любяць яго.

Ён чалавек вельмі сціплы, ніколі не патрабуе для сябе нічога асабістага. Успамінаю эпізод з нашых сумесных падарожжаў. Мы едзем начным цягнікам, кладзёмся спаць і прапануем яму ніжнюю паліцу. Ён адмаўляецца, кажучы, што на другой паліцы адчувае сябе лепей, чым дома на ложку, што там ён і спіць мацней. Такім, часам дзівакаватым, ён заўжды быў і застаецца.

Назіраў за Генадзем Іванавічам, кіраўніком Дзяржаўнага народнага хору, пад час выступленняў калектыву. Седзячы ў зале, ён разам з хорам спяваў; ён мяняўся ў твары, то быў радасны, то сумаваў, смяяўся, дырыжыраваў — карацей кажучы, жыў разам з выканаўцамі. Нядаўна мне давялося разам з Генадзем Іванавічам слухаць Ананьчыцкі народны харавы калектыў. І што я прыкмеціў—ён застаецца па-ранейшаму непасрэдным, апантаным, гэтаксама рэагуе на выступленні спевакоў...

Ёсць у Генадзя Іванавіча, як гаворыцца, сваё «хобі»: гэта — футбол. Калі па тэлебачанні трансліруюць гульню нашай любімай каманды мінскага «Дынама», яго літаральна не адцягнеш ад экрана. Ведаючы палкую яго натуру, мяркую, як цікава было б пасачыць за ім, калі ён «хварэе» за сваіх хлопцаў! Пасля заканчэння матча, калі ягоныя любімцы выйгралі, ён, узрадаваны, звоніць мне па тэлефоне і дзеліцца сваімі ўражаннямі аб гульні. Натуральна, калі хлопцы прайгралі, такога званка не бывае.

Ён надзвычай добразычлівы, у поўным сэнсе гэтага слова, чалавек. Сустракаючыся з самадзейнымі артыстамі, выказвае свае парады вельмі далікатна, разам з тым патрабавальна, прынцыпова. Як гэта патрэбна сёння ў такой справе, як работа з самадзейнасцю! Нам, яго малодшым калегам, трэба вучыцца гэтай культуры адносін паміж людзьмі. Перад намі яскравы прыклад Генадзя Іванавіча, надзвычай творчага, інтэлігентнага, прынцыповага чалавека, адданага сваёй любімай справе, мастацтву, свайму народу, які яму плаціць узаемнасцю.

У дзень твайго сямідзесяцігоддзя жадаю табе добрага здароўя, доўгіх год жыцця, дарагі наш Генадзь Іванавіч!

Юрый СЕМЯНЯКА.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

У ПЛЕЯДЗЕ КУПАЛАЎЦАЎ

Да 75-годдзя з дня нараджэння заслужанага артыста БССР С. ХАЦКЕВІЧА

Сціплы чалавек выбірае прафесію артыста. Прафесія акурат такая, што вымагае ад яго поўнай свабоды ў творчасці, асабліва на рэпетыцыях, калі выканаўца ролі шукае самую пераканальную форму пераўвасаблення ў вобраз. Яму, бывае, крычаць з залы: «Адкіньце вы сваю сціпласць! Смялей адкрывайце прагавітую смагу героя...» І ён шукае, прымервае, вар'іруе, пераадольваючы і сваю прыродную сарамлівасць. Часцей за ўсё ўнутраныя пакуты такога чалавека хаваюцца пад маскай даволі «свойскага» хлопца... Такім пачынаў свой шлях у мастацтве і Сцяпан Хацкевіч.

Сярод каларытных майстроў сцэны ён выглядаў часам нават знарочыста сціплым. І рэжысёрам купалаўскага тэатра, бывала, казалі: маўляў, колькі гадоў выступае С. Хацкевіч на падмостках, прафесійна добрасумленна і нават выразна паўстае ён у вобразах, напрыклад, Чапурына («Запрацаваны хлеб» А. Астроўскага) або Семяніхіна («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона), але... Мабыць, акцёр і сам здагадваўся пра тое «але», бо, займаючы сваё сціплае месца ў сістэме сцэнічных вобразаў, заўсёды стараўся быць псіхалагічна паслядоўным, праўдзівым, тэмпераментным. І рэжысура гэту культуру творчасці цаніла высока. Канстанцін Саннікаў спасылаўся на ўменне артыста С. Хацкевіча выявіць маляўнічую прыроду беларускага слова, прамовіць тое слова так, каб яно было сапраўды нібы апагеем эмацыянальнага ўзрушэння (або, наадварот, пакорлівасці і разгубленасці) героя. «Такая фарба вельмі патрэбна на акцёрскай палітры нашага тэатра», — казаў К. Саннікаў.

Уласна кажучы, бліскучаму сузор'ю артыстаў-купалаўцаў было б немагчыма зіхацець без своеасаблівага «акампанемента» такіх артыстаў, як С. Хацкевіч. Нездарма ж У. Дзядзюшка і Л. Ржэцкая, Б. Платонаў і У. Уладамірскі лічылі яго такім тактоўным і дарэчным партнёрам. Ён па-артыстычнаму чула падтрымліваў дыялог, умеў слухаць партнёра і адказваў сапраўды яму, а не адно толькі своечасова «ўстаўляў» рэплікі. Таму нават і не першарадныя ролі ў выкананні С. Хацкевіча звярталі на сябе ўвагу і, здаралася, упрыгожвалі ансамбль выдатных артыстаў — удзельнікаў спектакля. Яго Андрэй Клешч у горкаўскай драме «На дне» не губляўся сярод знакамітых партрэтаў герояў, якія ствараліся Л. Рахленкам і В. Тарасавым, Л. Давідовіч і Г. Гарбукам. Сам аўтар камедый «Лявоніха на арбіце» і «Таблетку пад язык» А. Макаёнак лічыў С. Хацкевіча амаль ідэальным выканаўцам роляў Буйкевіча і Крэндзялёва. Штосьці надзвычай «грыгоніса ўскае» заставалася і ў вельмі адметным дзеду Нічыпары С. Хацкевіча ў вядомым спектаклі купалаўцаў «Хто смяецца апошнім» па п'есе К. Крапівы.

Адным словам, нават калі б не было ў акцёра высокага творчага ўзлёту, за сумленнае служэнне сцэне ён варты прызнання гледачоў. Ды вось у 1972 годзе настаў зорны час і для Сцяпана Фёдаравіча. Прынамсі, так ён сам успрыняў уключэнне ў рэпертуар «Раскіданага гнязда» і даручэнне яму ролі Лявона Зябліка. Запаветнымі пачуццямі артыст дзяліўся толькі з самымі блізкімі сябрамі, але і па яго паводзінах на рэпетыцыях можна было здагадацца, што акцёр і сапраўды атрымаў, як кажуць, сваю самую Галоўную Ролю. Пачціва і дапытліва паглыбляўся ён у тэкст п'есы, узважваў і амаль што песціў кожнае Купалава слова. Распытваў сведкаў і ўдзельнікаў ранейшых пастановак п'есы і пазней выдатна ведаў, як трактавалі вобраз і што вылучалі ў Лявоне Зябліку А. Крыніца і Ц. Сяргейчык, як ацэньвалі іх выкананне крытыкі; прыглядаўся да таго, што рабіў П. Кармунін, разам з якім рыхтаваў ролю ў спектаклі рэжысёра Б. Луцэнкі. І сталася так, што ў даволі гарманічным ансамблі гэтага спектакля, ягоны, хацкевічаўскі, Лявон вырастаў у маштабную фігуру.

Трагедыя беларускага мужыка раскрывалася С. Хацкевічам з такой мастакоўскай маляўнічасцю, з такімі нечаканымі для яго глухаватага голасу абертонамі, што глядзельная зала 1972 і наступных гадоў «загаварыла» пра выдатную артыстычную індывідуальнасць стваральніка і на самой справе бліскучага трагедыйнага вобраза ў купалаўскай п'есе.

Лявон Зяблік сам пакідае жыццё — што гэта? Акт вышэйшай роспачы? Пошук выйсця з жахлівага становішча і паратунку для жонкі і любімых дзяцей? Згубіў чалавек веру ў тое, што праўду можна знайсці і адстаяць у тым асяроддзі і ў той час? Выклік?.. У паўзах, якімі так даражыў акцёр, ён паспяваў быццам бы паспрабаваць абдумаць свой лёс, каб прыняць адзіна магчымае — сумленнае — рашэнне. Таму смерць Лявона — гэта і крушэнне ўсіх ідэалаў мужыка, і выклік «гаспадарам гэтага свету», і ратунак... Якія глыбокія вочы былі ў С. Хацкевіча ў вобразе Лявона Зябліка! Ён углядаўся ў такія далі і такія вышыні, што зала адчувала сапраўднае прасвятленне героя. Яго Лявон Зяблік быў сапраўдным праўдашукальнікам, і тым вастрэй гучала трагедыя чалавечай асобы, вымушанай так пакідаць гэты мілы мужыку свет... «Страх і небяспека прымушаюць нас верыць у цуд», — думка яшчэ Цыцэрона. Які ж жах пасяліўся ў душы Лявона, што ён і ў цуд ніякі не верыць. Ад прыроды чалавек моцны, працавіты, энергічны — і спустошаны...

Добра, што беларускае акцёрскае мастацтва ўбірае ў сябе адкрыцці і выдатных майстроў, і такіх сціплых па натуры, працавітых, якім застаецца ў памяці ўдзячных калег і гледачоў Сцяпан Фёдаравіч. Калі мы прыгадваем спектаклі «Рудабельская рэспубліка» і «Адкуль грэх?», «Стары Новы год» і «У мяцеліцу», «Дзівак» і «Я, бабуся, Іліко і Іларыён», «Жаніцьба Бялугіна» і «Людзі на балоце», сярод постацей герояў нам бачыцца і ягоная: С. Хацкевіч у ролі... Сапраўдны купалавец!

К. ПЯТРУНІЧ.

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

З ЯРКІХ ШТРЫХОЎ

Акцёру па сцэнічных умовах трэба было зваліцца на зямлю... з царквы. Ён рэпеціраваў, спрабаваў зрабіць так, каб было ўражанне, што ён ляціць з вышыні званіцы, ды... І тады на тую «званіцу» ўзняўся рэжысёр — сам Еўсцігней Міровіч!— і зваліўся так, што акцёр спалохаўся, ці не скалечыўся той. І падумаў: «Яму ж за пяцьдзесят, а якая дакладнасць...» Выпадак з творчай біяграфіі Л. Рахленкі.

Каб паказаць няпросты шлях станаўлення прыроднага таленту і крышталізацыі сапраўднага акцёрскага майстэрства тых, каму прысвечана кніга «Купалаўцы. Эцюды пра акцёраў» (выдадзена сёлета «Мастацкай літаратурай»), яе аўтар Т. Арлова збірае вось такія звесткі і факты. Агульныя словы захаплення, якія непазбежны пры размове пра творчасць С. Станюты і Г. Макаравай, В. Тарасава і Г. Гарбука, М. Захарэвіч і А. Мілаванава, аўтар «Купалаўцаў» падмацоўвае жывымі назіраннямі і ўражаннямі. І аднаўляе артыстычнае аблічча У. Дзядзюшкі і Л. Ржэцкай па тых жа арыентацыях, даючы голас і сваёй так званай «памяці сэрца». Таму на старонках кнігі як бы ажываюць некаторыя эпізоды і асобныя сцэнічныя героі спектакляў, важных у дзейнасці Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, этапных. «Паўлінка» і «Лявоніха на арбіце», «Хто смяецца апошнім» і «У мяцеліцу», «На дне» і «Я, бабуся, Іліко і Іларыён», «Раскіданае гняздо» і «Канстанцін Заслонаў» — вось што прыгадваецца, калі чытаеш і сапраўды эцюды, але вельмі яркія і нестэрэатыпныя штрыхі да партрэтаў майстроў-купалаўцаў.

Кніга карысная і павучальная. Нават у межах эцюда Т. Арлова паказала, напрыклад, творчую няўрымслівасць рэжысёра К. Саннікава, якога калегі лічылі мастаком «лёгкай рукі», бо ў выніку супрацоўніцтва з ім на ўсесаюзную арэну выходзілі пазней вядомыя беларускія драматургі, акцёры ж нярэдка атрымлівалі ад яго «пуцёўку ў жыццё» на падмостках. Эцюд называецца «Бацька», і гэта абгрунтавана аўтарам.

У гутарцы з Г. Гарбукам Т. Арлова занатавала такія словы артыста: «Мае «чаму» невычэрпныя. Адказы ўчарашняга дня не задавальняюць мяне ў дні сённяшнім. Заўтра пытанняў будзе яшчэ больш...». Мабыць, гэты настрой імпануе аўтару кнігі, бо і яна імкнецца на многія «чаму», звязаныя з мастацтвам сучаснага тэатра, адказваць з ідэйна-эстэтычных пазіцый сённяшняга дня.

К. ЛЯШЧЭНЯ.

Шэсцьдзесят хвілін з Анатолем Папанавым

«УЗВАЖЫЦЬ ДАБРО І ЗЛО»

Што гутарыць з Анатолем Дзмітрыевічам Папанавым будзе лёгка, я зразумеў (прыміце напавер сякі-такі вопыт) з першых хвілін сустрэчы. Калі на цябе пазіраюць добрыя і цікаўныя вочы, калі ў голасе адчуваеш трывалы запас цярпення, гатоўнасці гаварыць і разумення, што не прыхамаць пагнала вашага карэспандэнта з дому нядзельным вечарам, — чаму б не весці размову нязмушаную? Бянтэжыў хіба толькі недахват часу, бо праз гадзіну Папанава чакала сцэна.

І я пачаў з «хатняй загатоўкі»...

— Анатоль Дзмітрыевіч, хачу расказаць вам гісторыю, усё ў ёй шчырая праўда, хоць і падобна яна на анекдот... Даўнавата было, трапіў малады акцёр па размеркаванні ў перыферыйны тэатр. У першы ж вечар пайшоў на спектакль. На сцэне «расло» бутафорскае дрэва з бутафорскімі яблыкамі. У адным эпізодзе герой зрываў з дрэва яблык і... пачынаў яго са смакам есці. Як высветлілася, перад спектаклем на галінку з пап'е-машэ падвешвалі сапраўдны плод... Дужа не спадабалася гэта маладому акцёру. Але вось праходзіць год — масоўкі, уводы, дэбют — і так здарылася, што зноў трапіў акцёр на той самы спектакль... Зноў, як вы разумееце, пабачыў тое самае «дрэва», і той самы герой грыз сапраўдны яблык. Праўда, рэакцыя на ўбачанае была іншая — як быццам і нішто сабе спектакль... І тады прагучаў «унутраны голас»: «Трэба адсюль уцякаць». Акцёр уцёк, і ўсё ў яго добра... А цяпер, калі ласка, ваш каментарый.

— Слухацца «ўнутранага голасу» ці не? Калі як... Што тычыцца гэтай гісторыі, дык неадназначная яна. Можна паспрабаваць і абараніць стваральнікаў таго спектакля, розныя ж бываюць спосабы сцэнічнага існавання, акцёрскія прыстасаванні для ўваходжання ў вобраз. Мы з вамі спектакля не бачылі, — а можа, і трэба было герою есці сапраўдны яблык... Але што тут тэарэтызаваць. Правільна зрабіў, што ўцёк. На жаль, штампы нежывога тэатра нярэдка з поспехам стрымліваюць свежыя павевы, творчыя мары і летуценні. Знакаміты Барыс Ліванаў любіў параўноўваць наша мастацтва з яздой угару на веласіпедзе, круціш педалі — рухаешся, спыніўся — упаў. Неяк жа ўмелі славутыя мхатаўцы — Хмялёў, Тарханаў, Леанідаў, Масквін — не спыняцца.

— Сваім кумірам на ўсе часы вы звычайна называеце Мікалая Хмялёва. Чаму менавіта яго, ззялі ж на тагачасным тэатральным небасхіле не менш яркія зоркі?

— Мікалай Паўлавіч зачароўваў, вабіў нейкай схаванай у ім туга скручанай спружынай, што ў імгненне магла разгарнуцца з вялізнай сілай. Ён уладарыў над гледачом, літаральна гіпнатызаваў залу і кожны раз узрушаў. Кожны — сведчу гэта, бо толькі «Тры сястры» з яго ўдзелам я, тады токар і самадзейны артыст, глядзеў семнаццаць разоў. На ўсё жыццё запалі ў душу хмялёўскія вобразы: пяшчотны і лірычны Тузенбах, жалезны Князь у «Дзядзечкавым сне», містычны Карэнін... Пераўвасабляўся ён, што называецца, да кончыкаў пазногцяў. Доўга не атрымліваўся яго Карэнін, пакуль была знойдзена адпаведная прычоска. А вось Мікалай Сіманаў, наадварот, знешнюю характарнасць ніколі не падкрэсліваў, ды гэта не шкодзіла яму таксама заўсёды быць гранічна пераканальным. Успаміны... «Чорны я!» — выгукваў Атэла—Астужаў, і ў глядзельнай зале ўсталёвалася такая цішыня, што было чуваць трымценне крышталікаў люстры. А качалаўскі Гамлет! Гэтая памяць — актыўная, бо дапамагае жыць, працаваць, прымушае «націскаць на педалі».

— Цяпер сама пабурчэць на маладое пакаленне...

— А што, і пабурчу. І не толькі на маладое. Так, прафесійны ўзровень вырас, ды высокаму служэнню мастацтву нярэдка супрацьпастаўлены ўсяго толькі «вытворчыя ўзаемаадносіны». Раней здымуць з ролі — трагедыя, акцёр начэй не спіць, да інфарктаў даходзіла. Сёння выкурыць цыгарэтку, супакоіцца — і няма праблем.

— Анатоль Дзмітрыевіч, прабачце, зірнуў я на гадзіннік — зусім хутка вам на сцэну, сёння пойдзе «Гняздо глушца». Але ж не сказаць, каб вы хваляваліся, ва ўсялякім разе, знешне. І не магу я напісаць: «Папанаў з душэўным трапятаннем рыхтаваўся да сустрэчы з мінскай публікай»...

— Зараз грымёр прыйдзе, загрыміруемся, апрану касцюм... Майму герою па п'есе крыху за шэсцьдзесят, мне таксама шэсцьдзесят тры гады, і выглядаю я, кажуць, на адказнага работніка з добрай пасадай. У пэўным сэнсе, самога сябе іграць даводзіцца. А ўнутраная настройка на вобраз усё роўна адбываецца. Незалежна ад таго, што я раблю — даю інтэрв'ю ці проста па вуліцы іду... Ды і ролі, шчыра кажучы, розныя бываюць. Да такіх, як Фамусаў з «Гора ад розуму» ці Хлудаў з булгакаўскага «Бегу» і па тыдні рыхтуешся, хоць і вопыт немалы — сорак гадоў у тэатры працую.

— Нямала і сыграна, больш за сто пяцьдзесят роляў на сцэне і на экране. Ваш «хросны бацька» ў кіно Эльдар Разанаў неяк сказаў, што вы — працаўнік, таму хочуць здымаць Папанава амаль усе рэжысёры, нават тыя, каму нельга гэта рабіць. У вашым рэпертуары ёсць класічныя вобразы і мілыя «пустячкі», накшталт Старой Мухі ці Дзвярной Ручкі з мульцікаў. А што з гэтай колькасці найбольш запомнілася, што прынесла асаблівае задавальненне — працэсам стварэння, творчым вынікам?

— Баксёр у «Дамоклавым мячы» Н. Хікмета, Карэйка ў «Залатым цяляці» Ільфа і Пятрова, Цёркін у «Цёркіне на тым свеце» Твардоўскага, — гэта ў тэатры. А ў кіно — вядома, Сярпілін, чэхаўскі Іоныч, Дубінскі са стужкі «Беларускі вакзал», Іван з аднайменнага фільма беларускіх кінематаграфістаў... Як бачыце, не так і шмат, на пальцах можна пералічыць.

— А як здарылася, што вы адгукнуліся на запрашэнне прыняць удзел у фільме рэжысёра-дэбютанта Віталя Дудзіна?

— Вельмі спадабаўся сцэнарый Анатоля Кудраўцава, такое не штодня даводзіцца чытаць. Героем сваім прывабіў — чалавекам простым, ад зямлі і ў той жа час адметным, яркім. З пароды людзей, якія ўсё на сваіх плячах вынеслі і ўчынкамі сваімі прымушаюць па-іншаму на свет зірнуць, — колькі ў ім адценняў, фарбаў, цеплыні і дабра. Няхай сабе і не агораў наш Іван кніжнай навукі, з мазаля жыў, ды галоўнае спасціг, сэрцам адчуў і зразумеў — трэба, каб паміж людзьмі ўсё было па сумленні. І цяжка з ім, вуглаватым, канфліктным — а без яго яшчэ цяжэй.

— Мне чамусьці асабліва запомніўся з фільма эпізод, калі Іван, ордэн атрымаўшы, вярнуўся дахаты. Стаіць смірна перад жонкай, боты перапэцканыя (машыну пхнуў з лужыны), парадныя галіфэ падраныя, на грудзях ззяе баявы ордэн, на твары — усмешка і радасная, і крыху вінаватая, паглядае зухавата... Дарэчы, пра галіфэ і боты. Пасля прэм'еры «Івана» да нас у рэдакцыю прыйшоў ліст, у якім чытач папракаў стваральнікаў фільма, маўляў, добра, што паклапаціліся адвезці героя на «Волзе» дамоў, ды навошта ж па такой разбітай і гразкай дарозе пракацілі заслужанага і паважанага чалавека, хіба дарог у нас добрых няма? І яшчэ шмат якімі «зніжаючымі паралелямі» быў незадаволены чытач...

— Што тут скажаш... Вясковыя дарогі ў нас яшчэ дрэнныя, вунь і ў газетах пішуць, колькі ўраджаю праз гэта губляецца штогод. Калі ж «вытыркаюцца» з фільма такія рэчы, мабыць, нешта мы не дарабілі. Толькі не пра гэта думалася, а пра тое якраз, што чалавечае жыццё не падобнае на аўтастраду і нават на наезджаны гасцінец. Выбоін на жыццёвым шляху нямала — як бы не растрэсці па іх сумленне, годнасць, дабрыню, спагаду. Ёсць такая небяспека. Часам здаецца, што трэба заводзіць Чырвоную кнігу пачуццяў і тэсціраваць на здольнасць саромецца... Сёння шмат спрэчак вакол сучаснага героя мастацкага твора. Ледзь не ў прабірцы спрабуюць яго вырасціць, альбо ў працэнтах вылічыць, колькі павінен ён мець вартасцей і недахопаў. Я разумею так, што сучасны герой — гэта жывы чалавек, сустрэча з якім прымусіць на тонкіх душэўных вагах узважыць дабро і зло. Але мне — на сцэну. Бывайце...

...І Папанаў пайшоў на сцэну. А ў мяне застаўся добры тузін незададзеных пытанняў. Што ж, да пабачэння, Анатоль Дзмітрыевіч, да новых сустрэч.

Вёў гутарку Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Фота В. ЛАБКО.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

ПРЭМ'ЕРА Ў «БОЛЬШОМ»

У Вялікім тэатры оперы і балета Саюза ССР — прэм'ера: новае сцэнічнае ўвасабленне набылі аднаактовая опера П. Масканьі «Сельскі гонар» і «Паяцы» Р. Леанкавала. Рэжысёр-пастаноўшчык гэтых спектакляў, народны артыст БССР Сямён Штэйн, не ўпершыню супрацоўнічае з вядучым музычна-тэатральным калектывам краіны. У 1975 годзе, да 30-ай гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, С. Штэйн паставіў на сцэне «Большого» оперу К. Малчанава «А досвіткі тут ціхія...» (спектакль быў тады ўдастоены І прэміі фестывалю мастацтваў «Маскоўская вясна»). Праз чатыры гады рэжысёр з Беларусі быў запрошаны на пастаноўку оперы Д. Вердзі «Баль-маскарад». Пра новую сустрэчу з творчым калектывам Вялікага тэатра С. Штэйн расказвае карэспандэнту «ЛіМа»:

— Ініцыятыва гэтай пастаноўкі належыць вядучым салістам тэатра Алене Абразцовай, Тамары Мілашкінай, Уладзіміру Атлантаву, дырыжору Альгісу Журайцісу. Няма, відаць, патрэбы гаварыць, наколькі прыемнай для мяне была прапанова сустрэцца з выдатнымі майстрамі савецкай опернай сцэны ў новай рабоце.

Працавалі над абодвума спектаклямі менш чым два месяцы, рэпеціравалі днём і ўвечары. Працавалі ўсе ў добрым кантакце, захоплена, радасна. Гэта была ўжо другая сумесная наша работа з дырыжорам А. Журайцісам і першая — з мастаком - пастаноўшчыкам В. Кляменцьевым.

Для рэжысёра асабліва дарагая сустрэча з калектывам, у якім ёсць яркія акцёрскія індывідуальнасці, нават не проста — акцёрскія, а чалавечыя. Мог бы нямала расказаць пра тое, як удумліва і творча працуе над вобразам Алена Васільеўна Абразцова. У спектаклі «А досвіткі тут ціхія...» яна была адчаная руская дзяўчына Жэнька Камялькова. У наступным сумесным нашым спектаклі «Баль-маскарад» — чараўніца-Ульрыка. Цяпер — гордая Сантуцца ў «Сельскім гонары». Дарэчы, упершыню яна спела Сантуццу ў мінскім спектаклі, на сцэне нашага тэатра. Затым працавала над гэтым вобразам з выдатным італьянскім рэжысёрам Ф. Дзефірэлі — для ягонага спектакля ў Мілане, а неўзабаве і для фільма паводле той пастаноўкі. Нядаўна А. Абразцова вярнулася з Вены, дзе таксама ўдзельнічала ў рабоце над операй «Сельскі гонар»... Словам, драматычны вобраз Сантуццы — як рэжысёр я гэта адчуў асабліва — набыў у трактоўцы нашай выдатнай артысткі новыя адметныя фарбы.

Упершыню давялося мне працаваць з Уладзімірам Атлантавым. Фенаменальны артыст! Сапраўдны талент, сустрэча з якім узбагачае, робіць захапляючай супольную працу. Ён іграе Каніо ў «Паяцах». І гэта зусім не такі Каніо, якіх, напрыклад, мне даводзілася бачыць і слухаць. Атлантаў, падзяляючы мае рэжысёрскія прапановы, іграе не гісторыю змрочнага раўніўца, ён іграе трагедыю добрасардэчнага чалавека, даверлівасць якога зняважылі. Артыст прапанаваў дакладны грым коміка: маску рыжага клоуна. Неспадзявана для гледача за ёй адкрываецца трагічны белы твар: «пад грымасай смешнаю — пякельныя пакуты».

Поруч з такімі знакамітымі майстрамі, як Т. Мілашкіна, З. Саткілава, Г. Калініна, «на роўных» рыхтавалі прэм'еру і маладзейшыя. Назаву тут і колішнюю салістку нашага, беларускага тэатра оперы і балета Л. Шамчук, творчы рост якой не можа не радаваць, і стажора Вялікага тэатра, вучаніцу А. Абразцовай, знаёмую мінчанам па выступленнях на Х Усесаюзным конкурсе імя М. Глінкі, — М. Шутаву, і перспектыўнага студэнта Маскоўскай кансерваторыі У. Багачова, якому было даверана выступіць у адным з прэм'ерных спектакляў... Сур'ёзна папрацаваў хор пад кіраўніцтвам хормайстраў С. Лыкава, М. Садзікава і А. Сцяпанава.

Спецыялісты нямала спрачаюцца наконт выканання опер на мове арыгінала. Для спевакоў веданне партый на мове арыгінала дае шырокую магчымасць удзелу, напрыклад, у разнастайных міжнародных творчых форумах, у оперных фестывалях. Па ініцыятыве выканаўцаў «Сельскі гонар» і «Паяцы» падрыхтаваны на дзвюх мовах. Так што прэм'ера, якая адбылася 16 ліпеня, прагучала па-італьянску. А ўжо наступным вечарам артысты спявалі па-рускі.

Прыемна, што наша новая работа выклікала шырокую грамадскую цікавасць: Усесаюзным радыё была наладжана трансляцыя з Вялікага тэатра, апаратыўна адгукнулася на прэм'еру прэса.

У СВЯТЛЕ РАМПЫ

Прэм'ера... Радасная і адказная падзея. Час найвышэйшага напружання творчых сіл тэатральнага калектыву. Неўзабаве спектакль будзе звыклым у стракатасці афіш, а сёння...

СУГУЧНА СВЯТУ

«ДЗЯНІС ДАВЫДАЎ» у Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі БССР

Сёлетнія прэм'еры асабліва значныя і хвалюючыя, бо яны праходзяць у атмасферы аднаго з самых светлых нашых святаў — 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. І менавіта 9 мая, у дзень Перамогі, упершыню паказаў сваю новую работу Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР — гераічную музычную камедыю «Дзяніс Давыдаў». Беларускі кампазітар А. Мдзівані напісаў яе па п'есе лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР У. Салаўёва. Сугучнасць тэмы спектакля нашаму вялікаму святу, яго духу і характару — відавочная. Яркая фігура героя Айчыннай вайны 1812 года, «партызанскага палкоўніка» Дзяніса Давыдава падаецца нам глыбока сімвалічнай. Яна — увасабленне мужнасці, адвагі, патрыятызму, разам з тым, — шчодрасці і яркасці душы. І гэта неад'емныя якасці рускага героя любой эпохі.

«Дзяніс Давыдаў», па сутнасці, цэласнае музычна-сцэнічнае палатно, жанрава далёкае ад «гусарскага вадэвіля». Сінтэз музыкі, драматургіі, сцэнаграфіі абумоўлівае гэтую цэласнасць.

А. Мдзівані дэманструе і яркую харавую палітру, якая вызначае асаблівы, узвышаны і разам з тым журботна-прасветлены эмацыянальны тонус спектакля. Адчуваеш і разумееш гэта літаральна з першых імгненняў і да заключных акордаў, нават і ў вадэвільнай відовішчнасці многіх сцэн пастаноўкі ёсць той узвышаны эмацыянальны падтэкст, які не дае гледачу забыцца пра гераічную сутнасць падзей, пакладзеных у аснову твора. Вельмі дакладная, на мой погляд, знаходка — юны барабаншчык (Слава Нікіцін), які з'яўляецца ў фінале спектакля і спявае жалобную оду загінуўшым героям. Яго светлы і шчыры галасок, яшчэ нямоцны, але разам з тым упэўнены і рашучы, надае фіналу спектакля сімвалічныя рысы. І нібыта ўзнікае своеасаблівы часавы масток паміж XIX стагоддзем і нашымі днямі.

Відаць, не выпадкова тое, што «жывое», харавое, вакальнае гучанне звязана з характарыстыкамі герояў-патрыётаў. У спектаклі шмат спяваюць сам Давыдаў (Р. Харык), яго дзяншчык — нястомны балагур Андрэй (гэты вобраз адметна раскрыты Г. Казловым), сяброўка юнацкіх гадоў Давыдава партызанская сувязная Насця (З. Вяржбіцкая). Партыі гэтых і іншых герояў прасякнуты інтанацыямі, блізкімі і знаёмымі ўсім нам. Гэта і задушэўнасць рускай працяжнай песні, і пранікнёнасць гарадскога раманса, і зухаваты матыў рускага танца.

Асноўныя якасці прадстаўнікоў варожага лагера ў спектаклі—бяздумнасць і фанабэрыя, гатоўнасць дзеля панскага «гонару» здрадзіць свяшчэннаму ідэалу Айчыны. Менавіта такая Агнеса, якая спачатку манерна адмаўлялася ад любоўных заляцанняў Давыдава, захопленага ёю, а затым адкрыта перайшла ў лагер праціўніка. Роля Агнесы — дробнай і самалюбівай асобы, прагнай да знешняга бляску і глухой да глыбокага пачуцця — адна з найбольш складаных у спектаклі, бліскуча сыграна Н. Гайдай.

Не выпадкова, відаць, тое, што французскія персанажы ахарактарызаваны ў творы пераважна сродкамі харэаграфіі, прычым харэаграфіі своеасаблівай. Чапурыстасць танца, мішурнасць касцюма, напышлівасць рухаў — з гэтага складаецца сцэнічны вобраз французаў і салідарных з імі арыстакратаў і прадстаўнікоў рускага двара.

Харэаграфія — з найбольш удалых кампанентаў пастаноўкі. Апрача традыцыйных балетных уставак, ёсць і пантаміма, якая адлюстроўвае баталію рускіх і французскіх салдат, а таксама выразны рускі танец, які пад прымусам выконваецца сеннымі дзяўчатамі для ўвесялення пана і таму гэткі знарочыста скаваны ў рухах.

Асаблівую атмасферу дапамагае стварыць у спектаклі жывапіс (мастак-пастаноўшчык У. Жданаў). Жывапісная сцэнаграфія спрыяе экспрэсіўнаму настрою гледачоў, засяроджвае іх увагу да сцэны.

Уражваюць натхнёныя вершы самога Давыдава. Іх гучанне — своеасаблівая лірычная разрадка насычанай напружанасці масавых сцэн.

У новай рабоце адчуваецца напружаная і зацікаўленая творчая праца рэжысёра-пастаноўшчыка Б. Уторава, музычнага кіраўніка і дырыжора Г. Аляксандрава, мастака па касцюмах В. Жалонкінай, балетмайстра - пастаноўшчыка В. Саркісьяна, хормайстра Н. Андросавай, вялікага калектыву стваральнікаў спектакля.

Новае заўсёды не бясспрэчнае. Множацца думкі крытыкаў, выказваюцца часам супрацьлеглыя ацэнкі, погляды і наконт гераічнай музычнай камедыі «Дзяніс Давыдаў». Ды, як гаворыцца, самы строгі і патрабавальны суддзя — глядач. І не будзе перабольшаннем сказаць, што ў вечар прэм'еры «Дзяніса Давыдава» ў глядзельнай зале не было абыякавых. Спектакль глядзелі і слухалі прадстаўнікі розных пакаленняў і прафесій. Ветэраны вайны і студэнты, музыканты і інжынеры, дзеці і дарослыя. Аднадушнымі воплескамі зала выказала ўдзячнасць стваральнікам новага спектакля.

А. ГАРАХАВІК.

АРБІТАМІ СЯБРОЎСТВА

ЯК СМЯЮЦЦА Ў ГАБРАВЕ

ПРА ПЯТУЮ ПАРУ года можна даведацца ў балгарскім горадзе Габраве, у ягоным Доме гумару і сатыры. Цікава, што такую пару мелі яшчэ старажытныя рымляне.

Калі ж наступае яна, гэтая пара? Калі пачынаюцца карнавалы. Напрыклад, у Габраве— гэта пачатак традыцыйнага нацыянальнага фестывалю гумару і сатыры. Раз у чатыры гады, у другой палове мая, увесь горад напаўняецца музыкай, смехам, шматнацыянальным многагалоссем.

Кожны няцотны год Габрава сустракае ўдзельнікаў і гасцей біенале гумару і сатыры ў мастацтве.

Арганізацыя і правядзенне фестываляў і біенале стала агульным клопатам творчых саюзаў Балгарыі. Так, у апошнім VII біенале гумару і сатыры, які праходзіў у рамках XIV Нацыянальнага фестывалю гумару і сатыры, прынялі ўдзел 2673 аўтары з 53 краін свету.

Карыкатура традыцыйна займала цэнтральнае месца. І гэта зразумела. У конкурсе ўдзельнічала 1060 мастакоў — такім рэкордам не можа пахваліцца ніводная міжнародная выстаўка карыкатуры альбо конкурс. Пастаянны дэвіз біенале, вядомы яшчэ з 1973 года, — «Свет уцалеў, таму што ўмеў смяяцца».

Гумарыстычныя малюнкі і ілюстрацыі, сатырычная графіка звычайна не трапляюць у поле зроку арганізатараў традыцыйных выставак карыкатур. Таму габраўцы прысвяцілі гэтым відам мастацтва спецыяльны раздзел. Выстаўка прыцягнула да ўдзелу 144 мастакоў з 13 краін свету. Традыцыйнымі сталі персанальныя выстаўкі лаўрэатаў папярэдніх біенале.

На выстаўцы фотасмеху заўсёды весела. Тут гледачы адчуваюць сябе вольна, фатаграфія больш даступная для ўспрымання. Магчыма, і ў чытачоў «ЛіМа» конкурс «Багацце людскіх усмешак і смешнае ў аб'ектыве» абудзіць жаданне прыняць удзел у выстаўцы 1987 года?

Заслугоўваюць увагі шырокія кантакты Дома гумару і сатыры — 15000 культурных арганізацый і творцаў са 153 краін маюць дачыненне да распачатай справы. Але варта спыніцца на яшчэ адным баку дзейнасці Дома — збіральніцкай рабоце ў галіне літаратуры. З гонарам супрацоўнікі называюць імёны У. Сараяна, Э. Калдуэла, К. Ванегута, Л. Ленча, С. Міхалкова, А. Несіна, Л. Малербы і многіх іншых, хто з задавальненнем папаўняе фонды адзінага ў свеце Дома. Вялікі ўклад уносяць нацыянальныя і універсітэцкія бібліятэкі, якія выдзяляюць рэдкія выданні сусветнай класікі гумару і сатыры на літаратурныя выстаўкі. Там можна ўбачыць арыгінальныя творы XVII стагоддзя, раннія выданні баек Крылова, творы Астроўскага, Салтыкова-Шчадрына, Чэхава... Спецыялізаваная бібліятэка выпісвае і атрымлівае ад аўтараў амаль усе выданні гумару і сатыры. Тут вам пакажуць рэвалюцыйныя выданні — ад газет Хрыста Боцева да нашых дзён. У фондзе захоўваецца беларуская газета «Раздавім фашысцкую гадзіну»...

Сярод выданняў фальклору асаблівае месца належыць габраўскім анекдотам. Цікава даведацца, што анекдоты выдаваліся 53 разы на замежных мовах і 6 разоў на балгарскай мільённым тыражом.

Літаратурны аддзел Дома не толькі наладжвае кантакты з пісьменнікамі, але рыхтуе і бібліяграфіі па іхняй творчасці, займаецца выдавецкай работай. Традыцыйны зборнік гумарыстычных і сатырычных апавяданняў «Смех і боль» не толькі адлюстроўвае апошнія дасягненні гумарыстычнага апавядання. Першы зборнік выйшаў у 1979 годзе як пацвярджэнне і працяг ідэй міжнароднай пісьменніцкай сустрэчы ў Сафіі «Мір — надзея планеты». Большасць апавяданняў паступае ад саміх аўтараў. Такім чынам зборнік робіцца вынікам супрацоўніцтва пісьменнікаў розных краін. Зборнік выходзіць у выдавецтве горада Плоўдзіва, дзе ўжо некалькі гадоў пры ўдзеле Дома выдаецца серыя «Гумар народаў» — творы класікаў і сучасных пісьменнікаў, якія атрымалі прэміі на конкурсах.

Дарэчы, у гэтым годзе ў Доме гумару і сатыры чацвёрты раз былі прысуджаны прэміі за лепшыя творы гумарыстычнай літаратуры апошніх двух год. Яны ўстаноўлены ў 1976 годзе Камітэтам па культуры, Саюзам балгарскіх пісьменнікаў і Домам гумару і сатыры. Сярод лаўрэатаў пісьменнікі Азіз Несін, Сяргей Міхалкоў, Луіджы Малерба, Курт Ванегут, Леанід Ленч, Марці Ларні. Прысуджаецца яшчэ нацыянальная прэмія і прэмія горада Габрава.

Сталі традыцыйнымі нацыянальныя і міжнародныя тэарэтычныя канферэнцыі: па праблемах гумару і сатыры ў літаратуры і ў фальклоры, па праблемах перакладу гумарыстычных і сатырычных твораў, у час біенале для ўдзельнікаў арганізуюцца «круглыя сталы».

Альманах «Апроно», які выдаецца два разы ў год на балгарскай, рускай, англійскай і французскай мовах, знайшоў сабе чытачоў ва ўсім свеце.

Канчаюцца фестывалі, біенале, але для работнікаў Дома гумару і сатыры працягваецца пастаянная работа па збіранні, вывучэнні і папулярызацыі лепшых дасягненняў гумару і сатыры. І калі ў нашым расказе гаворка не ішла пра эксперыментальны тэатр, пра новыя выданні, перасоўныя выстаўкі, пра паркі гумару з помнікамі Чарлі Чапліну і Хітраму Пітэру, пра дзіцячыя святы, не трэба думаць, што ўсё гэта менш цікава. Нацыянальны інстытут распаўсюджання гумару народаў — альбо як мы яго любоўна называем Домам гумару і сатыры —увесь час прапануе новыя цікавыя пачынанні.

Венета КОЗАРАВА-ГЕОРГІЕВА.

ВЫСТАЎКІ

З творамі Уладзіміра Мудрогіна мінчане і госці беларускай сталіцы маглі пазнаёміцца і ў час ранейшых выставак, але цяперашняя, што працуе ў Палацы мастацтваў, найбольш прадстаўнічая і прысвечана 60-годдзю мастака. У. Мудрогін нарадзіўся ў Ленінградзе, у семнаццацігадовым узросце стаў радыстам-разведчыкам Ленінградскага фронту. Некаторы час працаваў у Брэсцкім абласным тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі, аформіў больш за трыццаць спектакляў.

Пазней пачаў спрабаваць свае сілы ў жывапісе. Пейзажы, партрэты, нацюрморты У. Мудрогіна, якія прадстаўлены на выстаўцы, па-свойму адметныя. Асабліва ўражваюць шматлікія пейзажы. «Восень у Валоўшчыне», «Жоўтыя бярозы», «На беразе возера», «Узгорак», «Змрок», «Асенні дзень», «Пачатак восені» — гэтыя і іншыя работы пазначаны назіральнасцю аўтара, уменнем перадаць найбольш значнае і характэрнае, стварыць своеасаблівы лірычны настрой.

У экспазіцыі змешчаны творы, якія знаёмяць са старымі куткамі Мінска, а таксама краявідамі Прыбалтыкі і Абхазіі, дзе давялося пабываць аўтару.

Г. ЛОСЕЎ.

●

Выстаўка, прысвечаная памяці мастака Мікалая Гурло, адкрыта ў Палацы мастацтваў. Гэта спроба сабраць разам найбольш значныя работы аўтара. М. Гурло, як вядома, прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху, супрацоўнічаў у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну». Менавіта ў гэты час і пачаўся яго шлях графіка-сатырыка.

Малюнкі тых незабыўных гадоў адлюстроўваюць розныя эпізоды барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, выкрываюць звярынае нутро ворагаў. Гэтым творам сугучны работы, якія былі выкананы параўнальна нядаўна: на іх пазнаеш тых, хто марыць пра «крыжовыя паходы» супраць краін сацыялізму.

М. Гурло працаваў таксама і ў галіне кніжнай графікі. Ён, у прыватнасці, зрабіў ілюстрацыі да кніг «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі, «Мушка-Зелянушка» М. Багдановіча, «Мыйдадзір» К. Чукоўскага, «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна» А. Талстога. Гэтыя работы таксама ёсць у экспазіцыі.

Плённым было супрацоўніцтва М. Гурло з «Агітплакатам». Не адзін дзесятак твораў, прадстаўленых на выстаўцы, пераконваюць, што мастак заўсёды знаходзіўся на пярэднім краі барацьбы за сцвярджэнне сацыялістычных ідэалаў, выкрываў мовай сатыры п'янства, хуліганства, пустазвонства.

В. ЦЯРЭШКА.

●

«Заслаўю — тысяча гадоў» — пад такой назвай адкрыта выстаўка ў Заслаўскай пасялковай бібліятэцы. Усе тры яе раздзелы расказваюць аб мінулым, сённяшнім і заўтрашнім дні пасёлка, які ў жніўні адзначыць свой знамянальны юбілей.

У экспазіцыі звяртае ўвагу багата ілюстраваная брашура «Заслаўе». У ёй — малавядомыя звесткі аб гісторыі заснавання старажытнага паселішча, шматлікія здымкі, расказы аб цікавых экспанатах, што сабраны і цяпер захоўваюцца ў музеі рамёстваў і народных промыслаў.

На выстаўцы прадстаўлена папка з успамінамі тутэйшых жыхароў, шматлікімі газетнымі і часопіснымі публікацыямі.

Асобнае месца адведзена расказу аб подзвігу заслаўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, у прыватнасці, Героя Савецкага Саюза М. Пуцейкі. Праслаўленаму генералу, камандзіру 936-га стралковага палка 254-й дывізіі Паўночна-Заходняга фронту прысвечана дакументальная і мастацкая літаратура.

М. ШМАРЛОЎСКІ.

КАБ НЕ БЫЛО ПОЗНА...

Разгортваючы чарговы нумар «ЛіМа», часта знаходжу артыкул або невялікую інфармацыю на тэму, якая мяне цікавіць, — раённыя краязнаўчыя музеі...

Магчыма, у хуткім часе адкрыецца краязнаўчы музей і ў нашым раённым цэнтры Сянно. У райкоме партыі і райвыканкоме ўжо неаднойчы абмяркоўвалася гэта пытанне, прынята адпаведная пастанова. Вырашана і адно з важнейшых пытанняў: аб выдзяленні для гэтай мэты адпаведнага будынка. Цяпер галоўная задача — збор экспанатаў. Вырашана спачатку стварыць музей у сярэдняй школе № 1, а потым на яго базе адкрыць раённы краязнаўчы музей.

Але тут хочацца згадаць аб тым, што музей у Сянно ўжо быў. Гадоў з дваццаць назад у першай школе горада быў створаны выдатны музей. Ініцыятарам яго быў былы дырэктар школы, гісторык Мікіта Аляксандравіч Падалінскі. Праз нейкі час ён пайшоў на пенсію. А ў хуткім часе школа перасялілася ў новы чатырохпавярховы будынак, у якім, як ні дзіўна, не знайшлося месца музею. Частка экспанатаў была перавезена і складзена абы-як у невялікім пакойчыку, а частка іх знікла. Бясследна згублены і чатыры рукапісныя тамы па гісторыі Сенненскага раёна, аб чым вельмі шкадуе іх аўтар М. Падалінскі.

І вось цяпер настаўнікам і вучням — чырвоным следапытам — даводзіцца зноў шукаць экспанаты для музея...

Гэту сумную гісторыю з музеем я расказваю зусім не для таго, каб праз гады адшукаць і пакараць віноўных. Такое магло здарыцца і дзе-небудзь яшчэ. Галоўнае, на маю думку, у тым, што трэба карэнным чынам змяніць адносіны да раённых музеяў. Трэба падвесці пад іх больш трывалы прававы падмурак.

Зараз такія музеі ствараюцца на грамадскіх пачатках і трымаюцца часцей за ўсё на энтузіязме людзей, якія цікавяцца гісторыяй роднага краю. Але энтузіязму людзей патрэбна сур'ёзная падтрымка. Іншая справа, калі музей ствараецца як дзяржаўная ўстанова культуры. Але, паводле існуючага заканадаўства, для гэтага трэба, каб у музеі было сабрана не менш чым 1500 экспанатаў асноўнага фонду, каб было памяшканне для экспазіцыі агульнай плошчай не менш як 300 квадратных метраў і пакоі рознага службовага прызначэння.

У кожным райцэнтры абавязкова ёсць Дом культуры, бібліятэка, кінатэатр і іншыя ўстановы культуры, а краязнаўчага музея ў многіх раёнах рэспублікі няма. Атрымліваецца, што ён неабавязковы.

Вярнуся да размовы пра сваё Сянно. Хіба мала мы можам захаваць для сваіх нашчадкаў? На зямлі цяперашняга Сенненскага раёна нарадзілася нямала слаўных сыноў беларускага народа, у ліку іх выдатны партыйны дзеяч, Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы П. М. Машэраў. Тут нарадзіўся і вырас Герой Савецкага Саюза А. К. Гаравец, адзіны лётчык у свеце, які ў адным баі збіў дзевяць варожых самалётаў. Помняць сенненцы і подзвігі легендарнага партызанскага камбрыга К. С. Заслонава, які загінуў на гэтай зямлі, помняць іншых герояў. На Сенненшчыне пачыналі свой жыццёвы шлях вядомыя дзеячы беларускай культуры і навукі, сярод якіх славуты мастак Заір Азгур, паэт Анатоль Вялюгін, вучоны-матэматык У. Платонаў. Пералік сваіх слаўных землякоў можна было б працягваць. Матэрыялы аб іх павінны заняць дастойнае месца ў мясцовым музеі.

Трэба актывізаваць пошук, прыцягнуць да гэтай справы школьнікаў, пенсіянераў, зацікавіць людзей хоць бы тым, што здадзеная ў музей рэч будзе мець подпіс з указаннем часу і месца знаходкі і прозвішча таго, хто здаў гэты экспанат.

П. ЕРМАШКЕВІЧ,
супрацоўнік сенненскай раённай газеты «Ленінская іскра».

Краязнаўчыя музеі... У іх увасоблена наша памяць аб мінулым роднай зямлі, удзячнасць продкам за здзейсненае імі. Экспанаты, сціслыя радкі дакументаў — за кожным з іх гісторыя дзяржавы, лёс лепшых яе сыноў і дачок.

Краязнаўчым музеям належыць важнае месца ў духоўным жыцці грамадства ўвогуле і канкрэтнага чалавека ў прыватнасці. Пра гэта сведчыць і вядомая пастанова ЦК КПСС «Аб павышэнні ідэйна-выхаваўчай работы музеяў», якая нацэльвае на неабходнасць удасканалвання форм і метадаў музейнай работы.

Сёння мы змяшчаем ліст у рэдакцыю нашага чытача, супрацоўніка сенненскай раённай газеты «Ленінская іскра» П. ЕРМАШКЕВІЧА, які ўзнімае шэраг пытанняў, звязаных з работай раённых і школьных краязнаўчых музеяў, а таксама музеяў, што існуюць на грамадскіх пачатках. Пракаменціраваць гэты ліст мы папрасілі вядомага краязнаўцу Г. КАХАНОЎСКАГА, дырэктара Дзяржаўнага музея БССР І. ЗАГРЫШАВА, начальніка Упраўлення музеяў і аховы помнікаў Міністэрства культуры БССР А. КАНАВАЛЕНКУ.

НАШ КЛОПАТ АГУЛЬНЫ

НАШЫ ГАЗЕТЫ і часопісы зрэдзь часу змяшчаюць публікацыі на вельмі хвалюючую тэму — музеязнаўства, праўда, часцей інфармацыйнага характару. Некага хваляць, радзей ганяць, але задушэўная гаворка не заўсёды атрымліваецца. Вось толькі дыскусія ў «ЛіМе» вакол калекцый і калекцыянераў атрымалася.

Пад уплывам той дыскусіі я паспрабаваў даказаць карыснасць калекцыянераў. Прапанаваў маладзечанскаму заядламу збіральніку музейных рэдкасцей запашпартызаваць свае каштоўнасці, каб яны былі на ўліку ў нашым музеі. Даў карткі... І мой герой знік са сваімі калекцыямі, перабраўся ў другую рэспубліку. Паехалі маладзечанскія знаходкі. Яшчэ адзін «развод» з музеем калекцыянера, які кляўся ў вечнай і непарушнай любві... А між іншым у той дыскусіі яго збіральніцкая дзейнасць ухвалялася, бо яго калекцыі складалі асобныя выстаўкі на вечарах.

І вось новы ліст у рэдакцыю з Сянно ад П. Ермашкевіча. Зноў факты неашчаднага абыходжання з музейнымі прадметамі, якія збіраў для школьнага музея настаўнік М. А. Падалінскі. Сумна, вельмі сумна. На ўсіх жа музейна-метадычных нарадах гучыць заклік весці ўлік усіх экспанатаў, перадаваць іх ад аднаго да другога адказнага чалавека пад распіску. Вядома, у дзяржаўных музеях наладжаны строгі ўлік, таму мае рацыю П. Ермашкевіч, што надзейней, каб гэтыя рэліквіі захоўваліся ў раённым краязнаўчым музеі, якога ў Сянно яшчэ няма.

Клопат гэты пра раённыя краязнаўчыя музеі, пра іх экспанаты не толькі ў П. Ермашкевіча. Нядаўна прыслаў мне ліст малады будаўнік з Оршы Аляксандр Міхайлавіч Сяржкін. У дадатак — малюнак шклянога сасуда XVII ст., які я перадаў вядомаму спецыялісту М. Яніцкай. Рабочы заклапочаны тым, чаму ў старажытнай Оршы дагэтуль няма краязнаўчага музея. Ён паведамляе, што пры будаўнічых работах выявіўся скарб сярэдневяковых манет, але ў музей не мог трапіць, абышоў Оршу і паехаў... у Кіеў. Сяржкіна балюча кранае, што месца славутай Куцеінскай друкарні ў поўным запусценні. Муры помніка беларускага барока засталіся без страхі. «А што значыць дом без страхі? — піша рабочы. — Гэта значыць, ён асуджаны на павольную смерць, дажджы і снягі зробяць сваё». Малады энтузіяст мае некалькі спецыяльнасцей будаўніка і гатовы ўвесь свой вольны час прысвяціць аднаўленню, рэстаўрацыі аршанскага помніка, каб ён мог служыць людзям. Няўжо адзін? Хто ж падтрымае 27-гадовага рабочага ў яго энтузіязме? Ведаю, што ў Оршы гэтым клопатам жыве настаўнік і паэт Васіль Гусціновіч і іншыя. Але ці здолеюць яны ўласнымі сіламі адрадзіць помнік?

П. Ермашкевіч піша, што аднаго энтузіязму для стварэння музея мала. Яму патрэбна дапамога. Так, трэба. І істотная, не на словах. Памятаю, як у свой час даволі доўга абмяркоўвалася пытанне аб тым, каб арганізаваць музей-запаведнік у Нясвіжы. Выступалі нават саюзныя часопісы і газеты. Але на месцы не знайшлося ні падтрымкі, ні энтузіястаў.

Яшчэ Ф. Энгельс перасцерагаў: «Павага да старажытнасці ёсць прыкмета сапраўднай адукаванасці». Менавіта адукаванасць і трэба паказаць. Ці не па гэтай прычыне ў нас прыходзяць у заняпад помнікі архітэктуры, літаральна на вачах магутныя трактары знішчаюць археалагічныя аб'екты, аб чым ужо не раз гаварылася і пісалася?

Праблем у музеяў шмат. І адна з галоўных — кадры. Я прыхільнік таго, каб у музей прыходзілі толькі энтузіясты. Музейная работа кіпіць толькі ў руках тых, хто па-сапраўднаму любіць свой край, справу захавання нашай спадчыны.

Так, у раённых цэнтрах павінны быць краязнаўчыя музеі. Але ім трэба дапамога. На месцах належыць прыкмеціць і энтузіязм краязнаўцаў, і адданасць музейнай справе, каб будучы музей стаў цэнтрам духоўнага жыцця краю. Музейная справа — самая святая з усіх святых.

Генадзь КАХАНОЎСКІ,
навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

Аўтар ліста ў «ЛіМ» П. Ермашкевіч, адштурхнуўшыся ад прыватнага, але даволі распаўсюджанага факта «знікнення» школьнага музея, ставіць шырокую праблему стварэння ў кожным раёне дзяржаўных краязнаўчых музеяў. Правільна заўважае П. Ермашкевіч, што музеі патрабуюць больш сур'ёзнай увагі, што менавіта яны з'яўляюцца памяццю народа, што сёння трэба сабраць і захаваць усё тое, што дорага нам і нашым нашчадкам. Трэба шчыра сказаць, што ўзровень увагі да музеяў (арганізацыйнай, матэрыяльнай) сёння далёка адстае ад сацыяльнай патрэбнасці.

Падзяляючы трывогу П. Ермашкевіча — «каб не было позна», не з усімі яго довадамі, аднак, можна пагадзіцца.

Грамадскі музей (школьны, заводскі, калгасны) — гэта грамадскі музей. Ён суіснуе самастойна побач з дзяржаўным музеем і выконвае сваю, прыдатную яму навукова-асветніцкую і выхаваўчую функцыю.

Сёння ў рэспубліцы іх больш за тысячу. Гэта краязнаўчыя, мемарыяльныя музеі, баявой і працоўнай славы, музеі Леніна і іншыя. Яны вядуць значную пошукавую работу. Як правіла, гэтыя музеі сапраўды часта трымаюцца на плячах энтузіястаў. Але каб такому музею было забяспечана пастаяннае жыццё, неабходна зацікаўленасць кіраўніцтва і грамадскасці тых арганізацый, пры якіх яны ствараюцца. Неабходна стварыць калегіяльны арганізацыйны савет музея, прызначыць адказнага за работу музея і асабліва за захаванне музейнага фонду.

Прававая аснова дзейнасці грамадскага музея існуе. Гэта «Тыпавое палажэнне аб музеі, які працуе на грамадскіх пачатках», а таксама інструкцыя Міністэрства культуры СССР «Аб парадку афармлення дакументацыі пры пастаноўцы на дзяржаўны ўлік помнікаў гісторыі і культуры, аб'ектаў прыроды, якія захоўваюцца ў грамадскіх музеях, у тым ліку і школьных».

У Сенненскай жа школе, відаць, да існавання і работы музея ставіліся фармальна, не бачылі ў ім сур'ёзнай дапамогі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, што і прывяло да яго знікнення. Выпадак не адзінкавы і часта віной гэтаму— ведамасная абмежаванасць кіраўнікоў арганізацый, пры якіх створаны музей. У адпаведнасці з палажэннем матэрыялы асноўнага фонду грамадскіх музеяў павінны быць пастаўлены на ўлік у дзяржаўных музеях. Але з якой жа ўпартасцю кіраўнікі школ і іншых арганізацый супраціўляюцца гэтаму! Баяцца згубіць «права» на экспанаты — у выніку потым губляюць самі экспанаты.

Каб стварыць грамадскі музей, патрэбна многае: экспанаты, памяшканне і шырокі актыў энтузіястаў, якія б мелі пэўныя схільнасці да навукова-пошукавай справы. Але калі гэта работа трапляе ў рукі людзей некампетэнтных, якія не маюць ахвоты спасцігнуць хоць бы асновы музейнай навукі,— лічыце важную справу загубленай.

Возьмем, напрыклад, такія асноўныя пытанні: як весці збор матэрыялаў, арганізаваць іх улік і захоўванне, навукова апрацоўваць і фарміраваць даведачны апарат, як з соцень экспанатаў зрабіць адбор найбольш значных і сфарміраваць экспазіцыю? Гэтыя і іншыя пытанні ўзнікаюць перад актывам грамадскага музея. Дзяржаўны музей БССР па шмат якіх з гэтых праблем выпускае метадычныя рэкамендацыі, абагульняе вопыт лепшых грамадскіх музеяў. Але гэтага, аказваецца, недастаткова. Кіраўнікам і актывістам грамадскіх музеяў патрэбна не проста дапамога ад выпадку да выпадку, а пастаянная сістэматычная форма вучобы. Вось чаму пры Дзяржаўным музеі БССР мы адкрылі універсітэт тэорыі і практыкі музейнай работы з двухгадовым тэрмінам навучання.

У вучэбны план уключаны актуальныя пытанні навукова-фондавай, экспазіцыйнай, навукова-асветніцкай дзейнасці музеяў. Гэта форма навучання станоўча зарэкамендавала сябе на працягу пяці год і зараз стаіць задача распаўсюдзіць яе ва ўсіх абласцях рэспублікі.

Многія грамадскія музеі, у якіх сур'ёзна пастаўлена справа, наладжана сістэма ўліку фондаў, атрымалі шырокі грамадскі рэзананс, набылі званне народных, а паасобныя перараслі затым у дзяржаўныя музеі. І зусім правільна паступаюць партыйныя і савецкія органы г.п. Сянно, калі вызначылі шлях стварэння раённага краязнаўчага музея цераз грамадскі музей.

Стварэнне дзяржаўнага музея — сур'ёзная справа. Музеі ствараюцца гадамі і нават дзесяцігоддзямі. Асветніцкія па формах работы, яны па сваёй сутнасці з'яўляюцца навуковымі ўстановамі. Асновай іх з'яўляюцца навуковыя фондавыя калекцыі. І нельга атаясамліваць экспазіцыю з паняццем «музей». Экспазіцыя — гэта навуковая калектыўная публікацыя. У сусветнай практыцы ёсць музеі, якія не маюць стацыянарнай экспазіцыі, тым не менш значэнне іх ад гэтага не змяншаецца.

У 60-я гады ў краіне намеціўся своеасаблівы музейны «бум». Музеі хацелі мець усе, музей стаў модай. І як усялякая мода, іх рост і арганізацыя работы не абышліся без хібаў. У тым ліку і ў нас у рэспубліцы з'явіўся шэраг бязлікіх музеяў без навуковай і матэрыяльнай базы, прымітыўнай па сваім метадычным і мастацка-архітэктурным узроўні экспазіцыяй.

На змену «музейнаму выбуху» прыйшла больш цвярозая стрыманасць. Для прыняцця рашэння аб стварэнні дзяржаўнага музея патрабуюцца пэўныя ўмовы, аб якіх нагадвае аўтар: састаў фондаў, матэрыяльная база. Гэта цалкам правільна. Калі нам даводзіцца прымаць удзел у вырашэнні праблемы аб стварэнні таго ці іншага музея, мы, спецыялісты, стаім перад двума пытаннямі: «ці магчыма?» і «ці трэба?».

Калі на першае пытанне знайсці адказ няцяжка, то на другое — больш складана і часта яно наогул не прымаецца пад увагу. А дарэмна! Ці трэба менавіта тут ствараць музей пэўнага навуковага профілю, што новага ўнясе ён у сістэму музеяў, на якую дэмаграфічную сітуацыю можа музей разлічваць у сваёй рабоце — гэта не выпадковыя пытанні. Ці трэба адкрываць музеі, якія падобны адзін на аднаго як блізняты: некалькі чучал дзікіх жывёл і птушак, бязлікіх фотаздымкаў, агульнавядомых дакументаў — і музей гатовы. Альбо адкрываецца музей у населеным пункце з кантынгентам жыхароў 800-900 чалавек, які не мае турысцкіх маршрутаў і прытоку наведвальнікаў.

МУЗЕЙ У СЯННО БУДЗЕ

Ва Упраўленні музеяў і аховы помнікаў мы ўважліва пазнаёміліся з пытаннямі, закранутымі ў лісце супрацоўніка газеты «Ленінская іскра» П. Ермашкевіча.

Раённыя краязнаўчыя музеі займаюць важнае месца ў сістэме культурна-асветных устаноў рэспублікі; Міністэрствам культуры БССР і яго органамі на месцах надаецца значная ўвага ўдасканаленню іх работы. Толькі за апошнія гады створаны музеі ў Чэрыкаве, Быхаве, Мастах, Шуміліне, Лоеве, Смаргоні, Ветцы, Уздзе, Салігорску. Новыя памяшканні выдзелены для музеяў ва Ушачах, Лепелі, Бягомлі, Полацку. Вядуцца работы па будаўніцтве і рэканструкцыі музейных будынкаў у Мазыры, Крычаве, Віцебску, Ветцы, Талачыне. Планам развіцця прадугледжваецца адкрыццё ў бліжэйшыя пятнаццаць гадоў 20—22 новых музеяў, абсалютная большасць якіх будуць раённымі музеямі.

Для вырашэння пытання аб адкрыцці музея неабходныя пэўныя ўмовы: будынак, наяўнасць экспанатаў. Акрамя таго, улічваецца забяспечанасць дадзенай вобласці аналагічнымі ўстановамі, магчымасць уключэння музея ў экскурсійны маршрут. У адпаведнасці з прапановамі абласнога ўпраўлення культуры адкрыццё раённага музея ў г. п. Сянно прадугледжваецца ў XII пяцігодцы.

У многіх выпадках дзяржаўныя музеі ствараюцца на базе лепшых грамадскіх музеяў (іх у рэспубліцы каля 800). Міністэрствам культуры надаецца пастаянная ўвага ўдасканаленню работы грамадскіх музеяў. Значнае месца займаюць пытанні захаванасці сапраўдных музейных экспанатаў, няўхільнага выканання зацверджанага парадку стварэння і ліквідацыі грамадскіх музеяў з тым, каб прадухіліць выпадкі страты каштоўных рэліквій.

А. КАНАВАЛЕНКА,
начальнік Упраўлення музеяў і аховы помнікаў.

Як правіла, мясцовыя кіраўнікі выступаюць за краязнаўчы музей. А для такога музея арыгінальных аўтэнтычных матэрыялаў няма і іх немагчыма знайсці, што выключае магчымасць стварэння паўнапрофільнай навуковай экспазіцыі. Адсюль і музеі-блізняты.

Мы забываем, што ёсць іншыя сферы чалавечай дзейнасці, прадукт якой можа саставіць навуковую калекцыю і экспазіцыю музея. У нас у рэспубліцы мала музеяў этнаграфічных, рамяства, народнага альбо дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У Івянцы, напрыклад, просіцца музей керамікі, у Лідзе — музей шкла, у Оршы — музей лёну, у Полацку — музей кнігі.

У гэтым мне бачыцца стратэгічная лінія развіцця існуючай музейнай сеткі. Так што спасылацца на тое, што ў кожным раёне існуе бібліятэка і Дом культуры, павінен быць і музей, нельга. Бібліятэку і Дом культуры стварыць не складана (былі б сродкі). Музей жа—установа спецыфічная. Ён мае справу з аўтэнтычнымі помнікамі, якія на базе не закажаш і ў магазіне не набудзеш, і якіх наогул можа не быць. А без гэтага музея няма.

Таму актыўная работа грамадскіх музеяў у раёне, пошукі матэрыялаў і рэліквій трэба разглядаць як фундамент для фарміравання фонду раённага музея.

І. ЗАГРЫШАЎ,
дырэктар Дзяржаўнага музея БССР.

ПАЛІТЫКА ІДЭАЛОГІЯ

У ШОРАХ СТЭРЭАТЫПАЎ

Жнівеньскім надвячоркам на яшчэ гарачым асфальце Манхэтэна перабіраў тоненькімі ножкамі пудзялёк. Ён прыкмеціў закаванае ў бетон чэзлае дрэўца і цягнуў да яго сваю гаспадыню — прысадзістую, з невыразнай таліяй жанчыну ў хатніх тапках басанож, якая зусім не адпавядала хадзячаму стэрэатыпу так званай заходняй дамы. І я падумаў, як часта стэрэатыпы, што ствараюцца дзесяцігоддзямі, на самай справе не адпавядаюць рэчаіснасці.

Пра жыццё за мяжой наогул расказваць вельмі няпроста. І тады, калі паездзіў па той ці іншай краіне на працягу некалькіх тыдняў, і калі пражыў там некалькі год. У першым выпадку таму, што мала бачыў, у другім — таму, што бачыў шмат і страціў свежасць успрымання. Але, да таго ж, дастаткова толькі распачаць свой расказ, як праз хвілину-другую субяседнік, а часцей субяседніца, ужо самі расказваюць, што гаварыла ім пра гэту краіну суседка, пляменніца якой сябруе з адной жанчынай, што была там цэлыя два тыдні. І гэтая суседка на свае ўласныя вочы бачыла чаравікі, якія яна адтуль прывезла, і што гэтыя чаравікі каштуюць там нібыта капейкі. Магчыма, я перабольшваю. І субяседніца можа аказацца сапраўды дасведчанай дзякуючы не толькі айчынным сродкам масавай інфармацыі. Яна чытае замежныя раманы, надрукаваныя ў «Иностранной литературе», апранаецца пераважна ў «імпарт» (не ў «фірму» — фі! — пошлае слоўца) і добра ведае, што Аўстрыя — гэта жаночыя боты, Францыя — парфума і бялізна, ну, а ЗША — гэта, вядома, джынсы. І яе ўяўленне аб «заходняй» жанчыне — таксама канкрэтнае. Па-першае: жыве ў асабняку на два паверхі з газонам перад ганкам. Не працуе. Выхоўвае дзяцей з дапамогай боны (калі меркаваць па амерыканскіх фільмах трыццатых-саракавых гадоў — негрыцянкі). Ах, гэтыя «трафейныя» фільмы! Цяпер добра вядома, наколькі саладжава-ненатуральнымі яны былі, але прынцып «чыстай дошкі» часам аказваецца непераможны. Далей. «Заходняя» жанчына цэлы дзень ходзіць у пеньюары, а вечарам апранаецца ў шыкоўныя ўборы, адпраўляючыся на кактэйль ці іншы свецкі раут. Уся ў дыяментах, бо муж з любой нагоды дорыць прыгожанькія скрыначкі з каштоўнымі каменнямі. Праўда, часам здараюцца і непрыемнасці, якія, згодна з правіламі прыгожай меладрамы, заканчваюцца пацалункам на ўвесь экран.

Вядома, далёка не ўсе падыходзяць да жыцця за мяжой з пазіцыі Элачкі Людаедкі, але, калі вяртаешся з-за мяжы, адно з першых пытанняў: «Што там зараз модна?» І тады ліхаманкава пачынаеш успамінаць уборы манекенаў у вітрынах дарагіх універмагаў, бо на вулічны натоўп арыентавацца не прыходзіцца: людзі на вуліцах апрануты хто ў што можа. І прычын таму шмат. Па-першае, іншая сістэма каштоўнасцей. Галоўны паказчык — рахунак у банку. Адзенне амаль на апошнім месцы. Яно мае значэнне толькі для чыста прадстаўнічых, афіцыйных мэт. Гонар фірмы патрабуе, каб нават у спёку мужчыны-служачыя былі пры гальштуках, а жанчыны — у панчохах. Але культу адзення там не існуе. Амерыканцы лічаць, што плаціць за джынсы месячную зарплату, як гэта робім мы, — недаравальная распуста: «Мы кожны лішні долар нясём у банк. Не вядома, што можа здарыцца заўтра. Як жа не клапаціцца пра чорны дзень? Мы не можам сабе гэтага дазволіць». (Дарэчы, мы ў нашай краіне можам сабе гэта дазволіць, і гэта — адна з галоўных пераваг сацыялізму). Па-другое, хоць магазіны ў заходніх краінах і завалены таварамі, гэта не значыць, што ўсе жанчыны могуць апранацца ў Дыёра. Элегантны касцюм тыпу «шанэль», што ў нас адносіцца да якаснага разраду «імпарт», каштуе больш за тысячу долараў, а рэчы, што каштуюць танна, гэтак жа і выглядаюць. Зрэшты, вонкавае, спажывецкае ўяўленне аб краіне — не самае аб'ектыўнае. Таму давайце звернемся да фактаў і лічбаў — больш аб'ектыўных індыкатараў рэчаіснасці.

У кастрычніку мінулага года ў Вене адбыўся семінар аб эканамічнай ролі жанчын, які быў арганізаваны ў сувязі з завяршэннем сёлета Дзесяцігоддзя жанчыны, аб'яўленага ААН. Натуральна, што прадстаўнікі сацыялістычных краін прыехалі ў сталіцу Аўстрыі з цвёрдым намерам абмеркаваць праблемы, звязаныя з трыма мэтамі Дзесяцігоддзя: роўнасць, развіццё, мір. Прадстаўнікі заходніх краін, у тым ліку ЗША і Канады (а гэтыя краіны таксама члены Еўрапейскай эканамічнай камісіі), імкнуліся звесці дыскусіі да чыста эканамічных праблем. Так, заходнія краіны выказвалі на семінары сур'ёзную заклапочанасць, у прыватнасці, праблемай беспрацоўя. Ілюстрацыяй даволі змрочнай карціны з'яўляюцца дакументы, падрыхтаваныя спецыяльна для семінара. Узяць хоць бы даклад «Занятасць і беспрацоўе сярод жанчын у рэгіёне Еўрапейскай эканамічнай камісіі», падрыхтаваны сакратарыятам гэтай камісіі. У ім адзначаецца, што беспрацоўе ў капіталістычных краінах Еўропы ўзрасце да 1985 года больш чым на 11 працэнтаў. Большасць беспрацоўных — жанчыны. У некаторых краінах узровень беспрацоўя сярод жанчын вышэйшы, чым сярод мужчын у два разы. Напрыклад, у Бельгіі адпаведна 6,6 і 14,6 працэнтаў, у Ірландыі і Францыі — 5 і 11 працэнтаў, Партугаліі — 4 і 13,6 працэнтаў. Да таго ж у многіх краінах ад 44 да 54 працэнтаў жанчын занята няпоўны рабочы дзень. Наймальнікам больш выгадна прымаць жанчын на няпоўны рабочы дзень, бо тады яны не могуць адмовіцца працаваць у выхадныя дні, на святы, вечарам, наогул у любы час. Ёсць шмат іншых адмоўных бакоў такой работы. Магчымасці набыць адукацыю — вельмі абмежаваныя, гарантыі працы яшчэ меншыя, і, што самае галоўнае, часткова занятыя работніцы не маюць права на такія льготы, як пенсія і дапамога ў выпадку беспрацоўя. Другая праблема, што здаецца невырашальнай на Захадзе, — гэта розніца ў аплаце за аднолькавую працу жанчын і мужчын. Скажам, у Аўстрыі заробак жанчын складае ў сярэднім 78 працэнтаў ад заробку мужчын, у Вялікабрытаніі — 66 працэнтаў, у ЗША — 59 працэнтаў. Як правіла, усе праблемы тлумачыліся агульным пагаршэннем эканамічнага становішча ў капіталістычным свеце. Але, зразумела, ёсць іншыя, карэнныя праблемы.

З 1923 года вядзецца барацьба за ўключэнне ў канстытуцыю ЗША наступнай папраўкі: «нельга пазбаўляць роўных правоў перад законам ці ўразаць гэтыя правы па прынцыпе полу». Спатрэбілася амаль паўстагоддзя, каб нарэшце ў 1972 годзе кангрэс прыняў яе. Але... каб стаць часткай канстытуцыі, яе павінны былі ўхваліць у 38 штатах. І вось пачалася барацьба, у час якой па адзін бок барыкад загадзя рыхтавалі банкеты, каб урачыста адзначыць правал папраўкі, а па другі — праводзіліся шматлікія дэманстрацыі ў яе падтрымку. У горадзе Спрынгфілд восем жанчын аб'явілі галадоўку. Яна працягвалася 37 дзён. Банкет адбыўся, а жанчын ледзь выратавалі ад смерці. Зрэшты, не варта здзіўляцца, што папраўка не была прынята. Жанчыны складаюць 51,4 працэнта насельніцтва краіны, але з іх толькі лічаныя адзінкі з'яўляюцца членамі заканадаўчых асамблей штатаў. Сярод амерыканскіх сенатараў толькі дзве жанчыны. Калі Раксана Конлі прапанавала сваю кандыдатуру на пост губернатара штата Айова, адзін з дзеячаў мясцовага аддзялення дэмакратычнай партыі заявіў: «Мужчыны не дзеля таго так доўга прыводзілі ўсё да парадку, каб вы ўсё сапсавалі».

Другой перашкодай на шляху да прыняцця папраўкі быў вялікі бізнес. Для яго прыняцце папраўкі прынесла б немалыя страты. Згодна з афіцыйнай інфармацыяй, прадстаўленай урадам ЗША на семінары, жанчыны атрымліваюць 61 працэнт ад заробку мужчын, 39 працэнтаў застаецца ў кішэні наймальнікаў. Каля 53 працэнтаў жанчын ва ўзросце ад 16-ці і болей працуюць (не ўсе амерыканкі бавяць час у пеньюарах). Хацела б знайсці працу значна большая колькасць жанчын, але ў пошуках работы яны натыкаюцца на непераадольныя праблемы. У ЗША, як у іншых заходніх краінах, большая частка жанчын працуе сакратарамі, канцылярскімі служачымі, медсёстрамі і санітаркамі, хатнімі эканомкамі, настаўніцамі пачатковых школ. Дадайце сюды сферу паслуг, вось, бадай, і ўсе прафесіі, на якія могуць разлічваць жанчыны. І калі ў нашай краіне жанчыны ўсё часцей выбіраюць працу, якая не вымагае перанапружання фізічных сіл, то на Захадзе назіраецца адваротны працэс. Што вымагае жанчын брацца за такую цяжкую працу, як работа ў шахце (тут ніякая забарона не прадугледжана) ці вываз смецця? «Грошы, — адказала карэспандэнту газеты «Крысчан сайенс монітар» адна з прадстаўніц жаночага руху, — усё проста. Жанчына можа зарабіць у два ці тры разы больш, чым працуючы афіцыянткай у рэстаране, швачкай на фабрыцы». У дадатак да ўсяго жанчыны вымушаны цярпець кпіны ад сваіх калег — мужчын, якія лічаць сябе абражанымі замахам прадстаўніц слабога полу на іх прафесійны гонар ды і на працоўнае месца. Наогул, праблема праследавання жанчын у ЗША набывае ўсё большыя памеры. «Я сказала: не! Я проста не збіралася сустракацца з ім пасля работы, я не збіралася заводзіць з ім раман, таму што лічыла сябе дастаткова кваліфікаванай, каб быць незалежнай. Мяне звольнілі з работы ў пятніцу, папярэдзіўшы аб гэтым за 25 мінут». Гэта вытрымка з паказання была надрукавана ў «Крысчан сайенс монітар». Газета паведаміла, што ў 1980 годзе было зарэгістравана 4.195 аналагічных заяў, і дадала, што толькі два ці тры працэнты ахвяр такіх праследаванняў падалі ў суд, астатнія ж палічылі безнадзейнай справай шукаць дапамогі ва ўлад. Вось чаму барацьба за папраўку пад нумарам 27 аб роўнасці мужчын і жанчын была такой жорсткай.

Зразумела, акрамя палітычных, жанчыны на Захадзе сустракаюцца з шэрагам чыста сацыяльных праблем. Калі нашы жанчыны скардзяцца на недахоп месц у дашкольных установах, то што гаварыць жанчынам Англіі, дзе ўсяго адзін працэнт маці, якія працуюць, маюць магчымасць уладкаваць дзіця ў дзіцячы сад. У Аўстрыі толькі два працэнты дзяцей ва ўзросце 2—3 гадоў атрымліваюць месца ў яслях. У ЗША практычна адсутнічаюць дзіцячыя сады (у нашым разуменні), і таму значная частка жанчын ва ўзросце ад 20 да 30 год не мае магчымасці працаваць.

Спадзяюся, што прыведзеныя факты і лічбы ў нейкай меры парушаць традыцыйны стэрэатып «заходняй» жанчыны, і яе воблік будзе вызначацца яе сапраўднымі ролямі: працаўніцы, маці, актыўнага барацьбіта за мір у нялёгкіх умовах. Трэба ўнесці некаторую яснасць адносна вобраза нашых жанчын таму, што на Захадзе створаны вельмі неаб'ектыўны стэрэатып савецкай жанчыны.

Пятнаццаць год назад я чытаў у адным з амерыканскіх часопісаў, што ў СССР старшыням калгасаў, напрыклад, прадастаўлена права першай шлюбнай ночы з падначаленымі яму сялянкамі (згодна з норавамі часоў прыгону). Зараз, калі ўсё больш амерыканцаў наведваюць нашу краіну, такую лухту больш не пішуць, але, тым не менш, імкнуцца стварыць воблік савецкай жанчыны ў выглядзе нейкай бясполай істоты ў ватоўцы і з кіркай у руках. Затое нават П'ер Кардэн вымушаны быў прызнаць, што ў будны дзень у Маскве жанчыны апрануты больш шыкоўна, чым у Парыжы. І ўсё ж, калі якая-небудзь наша спраўная кабета ў час гаворкі з амерыканцам скажа, што яна з Савецкага Саюза, як правіла, адбываецца нямая сцэна, пасля якой задаюцца два традыцыйныя пытанні: «Вы балерына?» і «Вы, канечне, не вернецеся ў Савецкі Саюз?» Калі адмоўны адказ на першае пытанне выклікае некаторую расчараванасць, то на другое, як правіла, павагу.

...Пудзель, што так мэтанакіравана нёсся наперад, убачыўшы нас, раптам спыніўся і завіляў хвастом. «Вы спадабаліся Чарлі!» — радасна ўсклікнула жанчына. Мы, зразумела, выказалі шчырую ўдзячнасць за такую ласку. Пачуўшы замежны акцэнт, гаспадыня Чарлі пацікавілася, адкуль мы. «З Савецкага Саюза». «Вось як», — пасля некаторай паўзы прамовіла жанчына і пацягнула за сабой Чарлі. Так, яна ўжо бачыла нас праз шоры стэрэатыпу. Але ўсё ж цікаўнасць перамагла: спыталася ў маёй жонкі: «Вы, відаць, балерына?» «Не, — адказала тая. — І мы хутка вяртаемся на Радзіму». Наша субяседніца засмяялася. Адразу было відаць, што мы апярэдзілі яе другое пытанне. Чарлі, які ўжо да гэтага дазволіў сябе палашчыць, палез на рукі. «Ну, тады перадайце вашаму прэзідэнту, што мы не хочам вайны». «І мы і наш прэзідэнт таксама не хочам», — адказалі мы. «Вось як», — задуменна прамовіла жанчына. Шкло стэрэатыпу крыху пасвятлела. Яна, відаць, яшчэ нешта хацела спытаць, але сабака раптам успомніў пра аблюбаванае ім дрэва і паімчаў да яго, ледзь не вырваўшы павадок з рук гаспадыні. Тая паспешліва развіталася і пабегла ўслед. Мы пакрочылі сваёй дарогай, употай спадзеючыся, што стэрэатып, які на нашых вачах пахіснуўся, калі-небудзь разваліцца ўшчэнт.

У. СОЛЬСКІ,
міжнародны аглядальнік «ЛіМа».

ФОТАВЕРНІСАЖ «ЛІМа»

ЗДЫМАЕ ВАЛЕРЫЙ ЛАБКО...

...У «АБ'ЕКТЫЎНАСЦЬ» аб'ектыва ён не верыць. Але і «суб'ектыўнай» яго камеру таксама не назавеш.

Чым жа вабяць работы Валерыя Лабко, удзельніка народнага фотаклуба «Мінск» і супрацоўніка Інстытута мовазнаўства АН БССР, калі не дакладнай фіксацыяй натуры і не вытанчанымі ракурсамі?

Пытанне складанае — пра стыль, пра творчы почырк, адметнасць якіх сумненняў не выклікае...

«Шчоўкнуць» затворам «Змены» ці «Зеніта» — усё роўна, што зрыфмаваць «любоў-кроў». Добрых здымкаў, як і добрых вершаў, — мала. І гэта, у прынцыпе, нармальна.

Застаецца толькі вызначыць, што такое «добры здымак». Зроблены па законах кампазіцыі? Але ж ёсць безліч выдатных твораў, дзе адкрыта парушаны класічныя каноны. Дакладны адбітак рэчаіснасці? А як быць з фотаграфікай, мантажом?.. Прафесійна выкананы? Крытык Л. Аннінскі адзначае, што паняцце «фотамастацтва» пачало мацнець з размываннем «фотапрафесійнасці».

«Добры здымак» — фантом, няўлоўнасць.

Просіцца слова «душа» і іншыя, ад яго ўтвораныя.

Сярод тых, хто сцвярджае мастацкую вартасць і грамадскую значнасць здымка «ад душы» і «для душы», — народны фотаклуб «Мінск». Сёлета клубу спаўняецца 25 гадоў. Наш «Фотавернісаж» яшчэ пазнаёміць чытачоў «ЛіМа» з творчасцю яго ўдзельнікаў, а ў верасні адбудзецца юбілейная выстаўка...

Сёння — сустрэча з Валерыем Лабко...

Давялося пераглядзець дзесяткі фотакарцін Валерыя, разнастайных па жанрах і тэхніцы выканання, у розны час зробленых. Натуральна, што не ўсё сярод гэтай колькасці роўнае. Бывае, найперш кідаецца ў вочы «прыём», альбо парушае цэласнасць успрымання якая-небудзь дэталь, аўтару вельмі дарагая, гледачу не зусім зразумелая... Ды вось трапляецца работа, якая не толькі «рэабілітуе» за адносную няўдачу, але і абараняе права на памылку ў працэсе творчага пошуку.

«Балерына Таццяна ШАМЕТАВЕЦ»

І такіх работ у актыве В. Лабко нямала. Яны пазначаны ўдумлівасцю і разважлівасцю майстра, які з дапамогай фотакамеры вывучае, асэнсоўвае навакольны свет і самае цікавае ў ім — чалавека.

Апошнім часам у сваёй творчасці Валерый звярнуўся да партрэтнай фатаграфіі. Аўтарская схільнасць да глыбокага аналізу (пры досыць высокім тэхнічным узроўні) прымушае пільна ўглядацца ў гэтыя карціны, што заўсёды адкрываюць нешта новае ў добра знаёмых абліччах.

Здымае Лабко людзей тэатра — акцёраў, рэжысёраў, драматургаў. Пакуль што рана гаварыць пра вынікі гэтай вялікай працы — серыі і цыклы фотаработ, але абяцае атрымацца цікавая галерэя партрэтаў.

Аўтар ступіў на плённы шлях: у тварах без грыму ён шукае духоўны зарад.

І, здаецца, разумееш, як нараджаюцца псіхалагічныя партрэты В. Лабко. У садружнасці з чалавекам, якога ён фатаграфуе.

Яму не натура патрэбна, не проста аб'ект — сааўтар. Каб, не залежна ад таго, «ловіць» майстар імгненне ці рэжысіруе кадр, супалі імпульсы, што ідуць насустрач.

Тады Валерый Лабко націскае затвор сваёй камеры...

Г. АНДРЭЙЧЫК.

«Айтапартрэт з дачкой»

«Драматург Аляксей ДУДАРАЎ»

НА ЭКРАНЕ БЛАКІТНЫМ

з 5 па 11 жніўня

5 жніўня, 20.25
«І ЗАГУЧАЦЬ ГАЛАСЫ ЦУДОЎНЫЯ...»
Гледачы сустрэнуцца з інструментальнымі самадзейнымі і прафесійнымі ансамблямі рэспублікі: фальклорна-інструментальным ансамблем вёскі Груздава Пастаўскага раёна, сямейным ансамблем Малышаў з Гомельскай вобласці, фальклорна-інструментальным ансамблем ДК г. Дзяржынска.

6 жніўня, 20.15
ВЕЧАРЫ КАМЕРНАЙ МУЗЫКІ.
Іграе цымбалістка Т. Чанцова.

7 жніўня, 20.30
«ВІНШУЕМ ЮБІЛЯРА!»
Да 75-годдзя народнага артыста СССР Г. І. Цітовіча.

9 жніўня, 19.45
«БУГ».
ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС.
Прагучаць урыўкі з паэмы М. Трафімчука «Застава» ў выкананні аўтара, затым адбудзецца знаёмства з выстаўкай твораў мастакоў Брэстчыны і ў заключэнне некалькі песень выканае дуэт Г. Серады і Л. Назарэц з Пінска.

10 жніўня, 10.25
«МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ».
Перадача пазнаёміць з новымі экспанатамі музея ў в. Строчыцы, з тым, што зроблена ў апошні час па стварэнні зон «Цэнтральная Беларусь» і «Паазер'е».

10 жніўня, 12.15
«СЛОВА — ПАЭЗІІ».
Прагучаць новыя вершы К. Цвіркі.

10 жніўня, 14.15
«РОЗДУМ».
Размова пойдзе пра графічную серыю заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Г. Паплаўскага «Памяць».

10 жніўня, 15.25
«НАШЫ ГОСЦІ».
Сустрэча з народным артыстам РСФСР А. Рамашыным.

10 жніўня, 17.50
«У СВЯТЛЕ РАМПЫ».
Аб сённяшнім дні, новых работах і планах калектыву Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра расскажуць рэжысёры І. Пятроўскі і М. Абрамаў, загадчык літаратурнай часткі Д. Кальчанка. Будуць паказаны сцэны са спектакляў.

10 жніўня, 23.25
«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».
Музычная праграма з удзелам польскай спявачкі М. Радовіч.

11 жніўня, 13.05.
У. МАЯКОЎСКІ. «КЛОП».
Спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра сатыры.

11 жніўня, 15.10
ІГРАЕ С. ВАРАЎКА.
Прагучаць фартэпіянныя творы Ф. Ліста, Ф. Шапэна, А. Скрабіна.

11 жніўня, 16.45
«ШЛЯХАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ».
Падарожжа на радзіму К. Чорнага.

11 жніўня, 20.15
«ПА ВАШЫХ ПРОСЬБАХ».
У канцэрце па заяўках будаўнікоў рэспублікі прымаюць удзел аркестр народнай музыкі «Флуераш», В. Вуячыч, Н. Багуслаўская, Я. Еўдакімаў, М. Тададзе, ансамбль «Песняры».

Рэдакцыйная калегія і калектыў рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» выказваюць глыбокае спачуванне члену рэдкалегіі, загадчыку аддзела мастацтваў газеты Бур'яну Барысу Іванавічу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці ЖОНКІ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Барысу Бур'яну з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці ЖОНКІ.

Калектыў супрацоўнікаў штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» выказвае глыбокае спачуванне малодшаму карэктару Бур'ян Ірыне Барысаўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю Кажадубу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне паэтэсе Канстанцыі Буйло з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора—смерці МУЖА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04320 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, рэтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.